КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №16 (192)
◂ 30 КРАСАВІКА ◂ 2010 г.

# Новы Час




**ПАМІЖ ГІМНАМ І РЭКВІЕМАМ**

Стар. 4

**ШУРПАТАСЦІ І НЯЗРУЧНАСЦІ МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАЎ**

Мясцовыя выбары многія эксперты называлі рэпетыцыяй прэзідэнцкіх, якія могуць адбыцца ўжо напрыканцы гэтага года.

Стар. 5

**БАКІЕЎ У МІНСКУ: ПОГЛЯД З УСХОДУ**

Пра асаблівасці ўспрымання феномену Беларусі ў сярэднеазіяцкім рэгіёне журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з Андрэем Грышыным, супрацоўнікам сярэднеазіяцкага Бюро па правах чалавека

Стар. 21

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–16

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ. ТАК? НЕ?**

Развагі эксперта і праваабаронцы Валерыя Філіпава

**МЕРКАВАННЕ**



# У БЕЛАЙ ТОЗЕ І З КАМЕНЕМ ЗА ПАЗУХАЙ

Вольга ХВОІН

**Палітыка высакароднасці афіцыйнага Мінска хутка трансфармавалася ў сістэму ўмоў-патрабаванняў.**

Аляксандр Лукашэнка тэму прытулку выгнанага і цяпер ужо былога прэзідэнта Кыргызстана Курманбека Бакіева пачынаў артыкуляваць праз эмацыйныя вобразы «звычайнага дырэктара савецкага завода, нармальнага, разумнага і прыстойнага чалавека», ад якога ўсе адвярнуліся, і толькі Беларусь узяла на сябе смеласць не крыкнуць «ату!». Аднак рыторыка беларускага лідэра хутка змянілася, адлюстраваўшы пасыл не столькі гуманнасці, колькі палітычных намераў прадэманстраваць (у чарговы раз) амбіцыі самастойнасці і непадпарадкавання.

Пасля штогадовага Паслання Аляксандра Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу было сказана нямала слоў адносна таго, што цяпер у знешняй палітыцы Беларусі пачынаецца новая эра — самастойнасці і незалежнасці ад Расіі. Аднак варта нагадаць, што крытычныя выказванні ў адносінах да «вялікага ўсходняга брата» агучваюцца як мінімум кожныя паўгода і ў выніку застаюцца ўсё тым жа механізмам маніпуляцый і ціску-супрацьвагі. Калі раней інструментам з'яўлялася транзітная інфраструктура Беларусі, то цяпер акцэнт робіцца на ваенным супрацоўніцтве. Мінулым летам падчас «малочных войнаў» Лукашэнка заносіў у «ігнор» удзел у мерапрыемствах АДКБ, а таксама адмовіўся падпісваць дакументы па КСАР (Калектыўныя сілы аператыўнага рэагавання). Тады аргументам быў эканамічны шантаж з боку Расіі.

Цяпер беларускі лідэр паграажае байкотам АДКБ з-за яго неэфектыўнай працы, і ўласна, неўмяшання гэтай структуры ў падзеі палітычнага перавароту ў Кыргызстане. «Што гэта за арганізацыя, якая маўчыць, калі ў адной з нашых краін льецца кроў? — абураўся Лукашэнка. — Калі АДКБ не змагла своечасова адрэагаваць і паўплываць на сітуацыю ў Кіргізіі, значыць, такая гэта арганізацыя. Калі і далей так будзе развівацца, то перспектыў яна не мае». Неактуальнасць удзелу ў працы АДКБ кіраўнік Беларусі прадэманстраваў сваёй заявай, што на нефармальны саміт у Маскву 8 мая ён можа не патрапіць, бо мусіць абавязкова быць на парадзе з нагоды Дня перамогі ў Мінску. «Быць па-за межамі Беларусі ў гэтыя дні для мяне непрымальна. Восьмым мая магу ахвяраваць дзеля АДКБ, але я не магу знаходзіцца ў Маскве больш трох чацвёртых дня і мушу вярнуцца ў Мінск, каб раніцай 9 мая прыняць удзел у парадзе», — расставіў прыярытэты Лукашэнка. Аналітык Раман Якаўлеўскі лічыць, што такія паводзіны — больш бравада, чым рэальнае адлюстраванне сілаў у АДКБ. «Я не думаю, што Лукашэнку дазволяць дыктаваць умовы па нарадзе дня, а з яго боку гэта прагучала менавіта як дыктат», — гаворыць Якаўлеўскі.



Увогуле, на пасяджэнні АДКБ можа адбыцца цікавая сітуацыя, калі за адным сталом збяруцца і лідэр Беларусі, які прыняў зрынутага кіраўніка Кыргызстана, і прадстаўнікі цяперашняга часовага ўрада гэтай краіны. Але, магчыма, некарэктная сустрэча і будзе адцягнутая ў часе. «Як будзе пачувацца Аляксандр Рыгоравіч у такой сітуацыі — яго асабістая справа. Пакуль не вядома, ці прыме ўдзел у саміце АДКБ дэлегацыя Кыргызстана. Дзмітрый Мядзведзеў раней заяўляў, што супрацоўніцтва і падтрымку Кыргызстан атрымае, калі будзе сфарміравана паўнавартасная ўлада, таму не выключаю, што бліжэйшыя сустрэчы пройдуць без кіргізскай дэлегацыі, — зазначае Раман Якаўлеўскі. — Што тычыцца закідаў Лукашэнкі аб недзеяздольнасці структуры АДКБ, то яны сур'ёзна не ўспрымаюцца яе сябрамі. Калектыўныя сілы аператыўнага рэагавання могуць умешвацца ў падзеі, калі мае месца знешняя пагроза. У Кыргызстане пераварот не быў вынікам умяшання знешніх сілаў, што і канстатавалі сябры АДКБ». Эксперт гаворыць, што агрэсіўная пазіцыя Лукашэнкі можа быць прадыктаваная ў тым ліку і дзеяннямі Масквы ў згаданым канфлікце: «Лукашэнку вельмі напалохалі паводзіны Масквы, якая хутка, незвычайна хутка, пайшла на кантакт і фактычна прызнала новую ўладу, а таксама экстрадзіравала былога міністра ўнутраных спраў Кыргызстана Кангантыева.

Вядома, што на Курманбека Бакіева, які, паводле апошняй інфармацыі, усё яшчэ знаходзіцца ў Мінску «па асабістым запрашэнні» Лукашэнкі, заведзена крымінальная справа па двух артыкулах крымінальнага кодэкса — яго абвінавачваюць у арганізацыі забойстваў і злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі. Фармальна існуюць падставы для яго экстрадыцыі, але юрыст Сяргей Леўшуноў падкрэслівае, што гэта — «выключна палітычная воля кіраўніцтва Беларусі»: «Так, наша краіна мае пэўныя міжнародныя абавязальніцтвы, і калі Бакіеў будзе аб'яўлены ў міжнародны вышук, то, паводле логікі, мы будзем абавязаныя яго выдаць праваахоўным органам. Але Беларусь — незалежная дзяржава, і рашэнне аб экстрадыцыі будзе палітычным, а не юрыдычным». Таксама Беларусь можа не выдаваць Бакіева, калі дасць яму палітычны прытулак. Раней прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства Беларусі Андрэй Савіных заяўляў, што працэдура экстрадыцыі — вельмі доўгая. «Думаю, калі яна і будзе распачатая, то ў выніку зацягнецца на пэўны час. І ўсё гэта, натуральна, не будзе спрыяць ні двухбаковым адносінам Беларусі і Расіі, ні сяброўству краіны ў АДКБ», — рэзюмуе Раман Якаўлеўскі.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### АШМЯНЫ. ПЛЕНЭР МАСТАКОЎ

З нагоды 140-годдзя мастака Фердынанда Рушчыца ў Ашмянскім раёне пройдзе рэгіянальны пленэр мастакоў, прысвечаны яго памяці. Ініцыятарам і арганізатарам пленэру стала мясцовая дзіцячая школа мастацтваў. Пленэр павінен паспрыяць праяве талентаў і творчых здольнасцяў дзяцей і моладзі Ашмянскага, Смаргонскага і Астравецкага раёнаў.

### ПАСТАВЫ. ПАМЯЦІ ПАЭТА

23 красавіка ў чытальнай зале раённай бібліятэкі адбылася вечарына памяці вядомага мясцовага пісьменніка і журналіста Алеся Касцяня, якому споўнілася б 55 гадоў. Сустрэча была падрыхтавана сябрамі таварыства беларускай мовы і літаратурнага аб'яднання «Світанак» пры рэдакцыі газеты «Пастаўскі край» — тых арганізацый, у жыцці якіх Алесь актыўна ўдзельнічаў.

Алесь Касцянь — адметная асоба для Пастаўшчыны. Ён вядомы як таленавіты журналіст, глыбокі і тонкі паэт, майстар займальнай прозы, а таксама як кіраўнік літаратурнага аб'яднання і арганізатар выдання калектыўных зборнікаў мясцовых аўтараў «Рунь». Аўтар зборнікаў паэзіі «Зруб» (1983), «Правінцыялы» (1992), «Лязо душы» (2005), кніг прозы «Золата дзядулі» (1992) і «Вясковыя і местачковыя гісторыі» (2001), «Каменьчыкі ў кірзавым боце»(2009).

На вечарыне з успамінамі выступілі сябры і калегі пісьменніка. Да дня нараджэння паэта яго сябры выдалі невялікі паэтычны зборнік А. Касцяня «Трынаццаць чарачак і гляк».

### ГЕРМАНОВІЧЫ. СУСТРЭЧА З МЯСЦОВЫМ БАРДАМ

У літаратурнай гасцёўні культурна-асветніцкага цэнтра імя Язэпа Драздовіча (Германовічы) адбылася сустрэча з таленавітым паэтам і бардам Георгіем Станкевічам, які жыве ў Бешанковічах і працуе настаўнікам нямецкай мовы. Ён ужо бываў у Германовічах. У першы прыезд прэзэнтаваў свой зборнік вершаў «Званы». На гэты раз прывёз зборнік «Мая зорка». Многа вершаў Георгій прысвячае выбітным сынам Беларусі: Максіму Багдановічу, Янку Купалу, Якубу Коласу, Васілю Быкаву, Уладзіміру Караткевічу.

### НАВАПОЛАЦК. КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

27 красавіка на Полаччыну па запрашэнні суполкі «Рубон» гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны завіталі вядомыя маладыя журналісты газеты «Звязда»: паэт і літаратар Глеб Лабадзенка ды лідэр гурта «HandmadE» Яўген Валошын. На працягу дня вядомыя творцы гасцілі ў гімназіі №2 Полацка і гімназіі №2 Наваполацка, а ў 17.00 творчая сустрэча з маладымі журналістамі адбылася ў бібліятэцы імя Я.Коласа ў Наваполацку. У праграме — вершы, спевы, цікавыя і смешныя аповеды з жыцця журналістаў, прэзентацыя дыска «Галасы Уладзіміра Караткевіча, Ларысы Геніюш, Рыгора Барадуліна. 1968 год», факсімільнага выданнння да 75-годдзя Рыгора Барадуліна яго першага зборніка «Маладзік над стэпам». Сустрэчы адбылася ў межах кампаніі «Будзьма беларусамі».

### ВАЛОЖЫН. ПТУШКІ НАЛІБОКСКАЙ ПУШЧЫ

Выстава з такой назвай будзе праходзіць у раённым музеі ў рамках праекта «Ахова птушак Бацькаўшчыны» на працягу месяца. Праект «Ахова птушак Бацькаўшчыны» накіраваны на стварэнне сеткі тэрыторый важных птушак (ТВП) у Беларусі, распрацаваны пры падтрымцы партнёраў са Швецыі і Літвы. Гэта унікальны, першы ў гісторыі праект, калі да актыўнага ўдзелу ў захаванні каштоўных прыродных тэрыторый і біяразнастайнасці далучыліся аматары прыроды і жыхары звычайных вёсак, важных для птушак. Адной з такіх тэрыторый стала Налібоцкая пушча. Захаванне гэтага дзівоснага куточка немагчыма без удзелу неабыякавых людзей. На адкрыццё выставы былі запрошаны: Вольга Лукшыц, супрацоўнік АПБ па стварэнню сеткі захавальнікаў ТВП. Алесь Белы, уладальнік аграсядзібы «Марцінова Гусь», захавальнік ТВП «Налібоцкая пушча»; Васіль Шакун, вядучы інжынер па паляўнічай гаспадарцы ПРУП «Белдзяржпаляванне». На выставе прадстаўлены каляровыя фотаздымкі птушак Налібоцкага краю, плакаты, буклеты па дадзенай тэме. Змешчана шмат цікавых матэрыялаў пра «Птушку года» — сокала-пустальгу.

### ГРОДНА. ХАВАЙСЯ Ў БУЛЬБУ

Міжнародны рок-байк-фэст «Хавайся ў бульбу» з 30 красавіка па 2 мая праходзіць у двух кіламетрах ад горада на беразе Нёмана побач з аднайменнай базай адпачынку. На фестываль прыехала болей за 1000 байкераў з Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы, Украіны, Казахстана, нават Канады. У праграме — разнастайныя конкурсы, атракцыёны, пейнтбол, файершоу, маладзёвыя акцыі, канцэрты рок-выканаўцаў. Па словах арганізатараў, у гэтым годзе акцэнт быў зроблены выключна на ўдзел беларускіх рок-каманд. Запланаваны праезд калоны байкераў у суправаджэнні ДАІ па вуліцах абласнога цэнтра. Арганізатарамі мерапрыемства ўжо шосты год запар выступаюць мясцовыя матаклубы «Насарогі», «Грызлі» і Rolling Anarchy пры падтрымцы Асацыяцыі матаклубаў Беларусі.

---

ЗАБАРОНА

## ДЭМАНСТРАЦЫІ НЕ БУДЗЕ

**Брэсцкі гарвыканкам не задаволіў заяўку гарадскіх арганізацый Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) і Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» на правядзенне 1 мая дэманстрацыі.**

«Прычыны адмовы традыцыйныя, — паведаміла старшыня гарадской структуры сацыял-дэмакратаў Ганна Канюс. — Папершае, як заяўляюць улады, маршрут дэманстрацыі праходзіць бліжэй чым за 50 метраў ад шэрагу адміністрацыйных будынкаў, што забаронена ў адпаведнасці з артыкулам 9 закона «Аб масавых мерапрыемствах». Па-другое, рух да 150 дэманстрантаў па тратуарах і пешаходных пераходах можа прывесці да парушэння руху транспарту. Акрамя таго, у сёлетняй адмове дададзена яшчэ адна матывіроўка — рамонтна-будаўнічыя работы на адной з вуліц маршруту дэманстрацыі».

У адказе гарвыканкама адзначаецца, што заяўнікі «могуць узяць удзел у культурна-масавых мерапрыемствах, якія праводзяцца гарвыканкамам у парку імя 1 Мая, нароўні з іншымі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь».

«Канешне, мы, як і планавалі, возьмем удзел у гэтых мерапрыемствах, але не толькі як грамадзяне нашай краіны, але і як партыйцы, — заявіла Канюс. — Мы накіруемся ў парк калонай, няхай і не з такой колькасцю людзей, як намячалі, і не па тых вуліцах. Прычым зробім гэта пад сваімі партыйнымі сцягамі».

**Паводле БелаПАН**

---

З НАГОДЫ

## НЯМЕЦКАЯ ДАНІНА ПАМЯЦІ

**Генадзь КЕСНЕР**

**«Гэта ніколі не павінна паўтарыцца…» Такія словы, звяртаючыся да ветэранаў Вялікай айчыннай вайны, да былых вязняў нацысцкіх канцлагераў, да выгнаных падчас вайны ў Германію прымусовых працаўнікоў — «остарбайтэраў», прамовіў 26 красавіка прэм'ер-міністр федэральнай зямлі Брандэнбург (ФРГ) Маціяс Плацэк. Ён разам з міністрамі свайго ўраду, палітыкамі і буйнымі прадпрымальнікамі прыбыў у Мінск з трохдзённым візітам.**



Маціяс Плацэк

Свой візіт у Беларусь спадар Плацэк пачаў з наведвання мемарыяльнага комплексу «Яма», размешчанага на тэрыторыі былога Мінскага гета, дзе ўсклаў вянок да ўзножжа помніка забітым нацыстамі яўрэям. Там жа, на «Яме», прэм'ер-міністра Брандэнбургу ўжо чакалі некалькі дзесяткаў сведак падзеяў мінулае вайны, тых, хто перажыў жахі фашысцкай акупацыі.

З «Ямы» нямецкая дэлегацыя пешшу (ветэраны паехалі на спецыяльных аўтобусах) накіравалася да былых яўрэйскіх могілак на вуліцы Сухой, дзе зараз знаходзяцца мемарыяльныя камяні, што нагадваюць пра расстраляных у Мінску яўрэяў, прывезеных сюды ў Заходняй Еўропы, у тым ліку з многіх германскіх гарадоў — Кёльна і Бона, Гамбурга і Брэмена.

Маціяс Плацэк звярнуўся да прысутных ветэранаў і былых вязняў са словамі пакаяння ад імя нямецкага народа: «Вялікі дзякуй, што вы пагадзіліся прысутнічаць на нашай сумеснай акцыі памяці. Хаця я магу сабе ўявіць, што пры такіх мерапрыемствах да вас зноў вяртаюцца тыя жахлівыя ўспаміны, і колькі сіл вам гэта каштуе, калі вы зноў перажываеце тыя падзеі. Я вам асабліва ўдзячны як немец, які разумее, што таксама нясе адказнасць за тое, што адбылося ў тыя часы. Некалькі дзён таму ў мяне на радзіме ў зямлі Брандэнбург адбылося вельмі важнае і хвалюючае мерапрыемства да 65-х угодкаў вызвалення канцэнтрацыйных лагераў Равенсбрук і Заксэнхаўзен. Там прысутнічалі нямногія сведкі тых падзеяў, якія знайшлі ў сабе сілы і якім яшчэ дазволіла здароўе скіравацца ў такую далёкую вандроўку. Мы ім паабяцалі, што памяць пра тыя злачынствы і ўрокі, што мы адтуль узялі, захаваем і пасля іх зямнога існавання. Мы будзем вымушаны шукаць новыя формы нагадваць пра тыя жахлівыя падзеі, таму што дагэтуль менавіта сведкі адбытага неслі велізарны цяжар захавання гэтай памяці. Але ўжо сёння, знаходзячыся на гэтым памятным месцы, я абяцаю вам, што мы захаваем гэтую памяць. Мы зробім усё, каб адны людзі ніколі больш не чынялі нешта падобнае іншым людзям. З вашых аповедаў я зразумеў, што тут не толькі знішчаліся жыцці людзей, але іх годнасць. Гэтага мы ніколі больш не павінны дапусціць. Гэта я вам абяцаю сёння тут, у Мінску».

Старшыня Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын вядомы скульптар Леанід Левін распавёў нямецкім гасцям пра гісторыю Мінскага гета, пра падзеі, звязаныя з лёсам яўрэйскага народу падчас другой сусветнай вайны.

---

СПРАВА

## ДАМАГЛІСЯ

**Пасля пратэсту жыхароў вёскі Уборак Лоеўскага раёна адменена рашэнне аб далучэнні мясцовага сельгаспрадпрыемства да гаспадаркі суседняга раёна.**

Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Лоеўскага райвыканкама Яўген Ражон.

170 вяскоўцаў падпісаліся пад зваротам да памочніка прэзідэнта па Гомельскай вобласці Ігара Пракапенкі і старшыні Гомельскага аблвыканкама Аляксандра Якабсона з просьбай не дапусціць далучэння КСУП «Ураджайны» да суседняй гаспадаркі — КСУП «Малінаўка-Агра». Гэты зварот 22 красавіка быў накіраваны ў адпаведныя інстанцыі. У лісце служачыя і спецыялісты КСУП «Ураджайны», пенсіянеры і жыхары вёскі прасілі не дапусціць «крушэння і развалу гаспадаркі і вёскі».

У звароце тлумачылася, што «КСУП «Ураджайны» быў і застаецца перадавым у раёне: вясновыя палявыя работы тут завершаны ў тэрмін, прадпрыемства забяспечана палівам, зарплата выплачваецца ўласнымі сродкамі рэгулярна без крэдытаў».

Вяскоўцы патрабавалі растлумачыць, чаму кіраўніцтва Лоеўскага райвыканкама прыняло рашэнне далучыць КСУП «Ураджайны» да значна горшага па эканамічных паказчыках прадпрыемства — КСУП «Малінаўка-Агра», у якім «не выплачана зарплата, не завершаны вясновыя палявыя работы, гаспадарка адчувае недахоп паліва».

Жыхары былі занепакоены тым, што з далучэннем да іншай гаспадаркі адбудзецца скарачэнне рабочых месцаў, застанецца шмат пустых будынкаў, людзі паедуць на пошукі працы, а вёска памрэ.

**Паводле БелаПАН**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НІ ГРАМА НА УСХОД!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Падобна на тое, што ў Беларусі з Расіяй намячаецца чарговая «гандлёвая вайна». І гэтым разам яна справакавана не расійскім бокам, не дзеяннямі галоўнага санітарнага ўрача Расіі спадара Анішчанкі, а менавіта прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам.**




Увесь прыбытак ад перапрацоўкі 80 тысяч тон венесуэльскай нафты на Мазырскім НПЗ павінен застацца ў Беларусі, нягледзячы на тое, што 42,5% акцый завода належаць расійскім акцыянерам, заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас паездкі па Петрыкаўскім раёне Гомельскай вобласці.

Звяртаючыся да генеральнага дырэктара МНПЗ Анатоля Купрыянава, Лукашэнка сказаў: «Дык вось запомні: калі хоць адна капейка пойдзе на той бок, наракай на сябе. Усе да кроплі грошы і прыбытак павінны быць у Беларусі. Ім не трэба было перапрацоўваць нафту, і прыбытку няма. Запомні: калі хтосьці будзе перашкаджаць, кажы адразу».

Што б гэта значыла? Напэўна, гэта выразны пасыл Маскве, што яна можа згубіць свайго стратэгічнага саюзніка на заходнім накірунку. Гэта ўжо не першы закід на бок расійскіх кіраўнікоў у адказ на чуткі пра тое, што Масква падтрымае не свайго даўняга кліента Аляксандра Лукашэнку, а іншага кандыдата ў прэзідэнты на будучых прэзідэнцкіх выбарах. Гэта адказ і на рыторыку кіраўніка Расіі Дзмітрыя Мядзведзева.

21 красавіка прэзідэнты Расіі і Украіны дамовіліся наконт працягу тэрміну знаходжання Чарнаморскага флоту Расіі ў Севастопалі з 2017 года яшчэ на 25 гадоў і магчымасці далейшага працягу яшчэ на пяць гадоў. Пры гэтым была дасягнута дамоўленасць, што Украіна атрымае скідку на газ, які пастаўляецца Расіяй, у 100 долараў пры цане 330 долараў за тысячу кубаметраў і 30 працэнтаў — пры іншай цане.

На наступнай прэс-канферэнцыі Мядзведзеў адказаў на пытанне, ці можа разлічваць Беларусь на аналагічную ўкраінскай скідку на газ. Ён заявіў, што Расія гатова даваць прэферэнцыі рэальным партнёрам, а не тым, хто гэта толькі дэкларуе. «Адна справа — рэальнае партнёрства, а іншая справа — дэклараванне намераў. Адна справа — дамаўляцца аб тым, каб па-сур'ёзнаму працаваць, ісці насустрач адзін аднаму, дапамагаць адзін аднаму, а іншая справа — прымаць рашэнні аб прыёме на пастаяннае месца жыхарства людзей, якія страцілі працу. Гэта розныя рэчы. Рабіце высновы самі», — сказаў Мядзведзеў.

У адказ, пасля галасавання на мясцовых выбарах, Аляксандр Лукашэнка нагадаў расійскаму калегу пра тое, што ў Беларусі знаходзяцца дзве расійскія ваенныя базы, за якія РФ нічога не плаціць. «Калі прэзідэнт Расіі на гэта забыўся, то час успомніць», — сказаў Лукашэнка.

Відавочна тое, што Лукашэнка на прэзідэнцкіх выбарах ужо не разлічвае на падтрымку Расіі. Не спадзяецца на танную нафту і газ. А калі так, — можна развязваць чарговую гандлёвую вайну. Але пры гэтым ён выдатна ўсведамляе, што за наступствы яго чакаюць.

Наступная прэзідэнцкая кампанія будзе вельмі цяжкай, сказаў Аляксандр Лукашэнка 27 красавіка ў ходзе паездкі па Петрыкаўскім раёне Гомельскай вобласці.

«Расслабляцца нам ні ў якім выпадку нельга, — падкрэсліў беларускі кіраўнік. — Выбары ў саветы ў нашай краіне — гэта вельмі важная кампанія, але не асноўная. Наперадзе ў нас асноўная кампанія. Вельмі цяжкая будзе кампанія, вельмі цяжкая. І калі ў гэтай кампаніі прыйдзецца ўдзельнічаць дзейнаму прэзідэнту, то яна яшчэ цяжэйшай будзе, таму што вы бачыце, каму тут дзейны прэзідэнт не падабаецца, каму гэта не ў лад і на Захадзе, і на Усходзе. І, натуральна, рукі чухаюцца, хочацца неяк сюды ўлезці».

«Я ўжо, шчыра кажучы, напрацаваўся, — адзначыў ён. — Калі вы знойдзеце іншага прэзідэнта, страху не будзе. Усе роўна рана ці позна яго трэба будзе знайсці. Таму, калі знойдзеце, ну, што ж, добра».

Цікава, ці дачакаемся мы сакраментальнай фразы: «Я стаміўся, я сыходжу?» Тым болей, што ён сам, па ягоным прызнанні, ужо розум страчвае іншым часам. «Летась у гэты час, прабачце мяне, я розум губляў, мучыўшы і міністра сельскай гаспадаркі, і іншых: залежы на складах прадуктаў харчавання, непрададзеныя сыры, малочную прадукцыю не бяруць, ды яшчэ расіяне падкінулі, ведаеце, нам праблему, калі закрылі мяжу», — заявіў Лукашэнка.

Між іншым, жыццё ў Беларусі ідзе сваім ходам. Створана грамадскае аб'яднанне «Саюз «Гільдыя піваравар». Пра гэта паведамію на прэс-канферэнцыі 27 красавіка ў Мінску старшыня савета гільдыі, генеральны дырэктар ААТ «Крыніца» Рыгор Пяткевіч.

У саюз увайшлі ААТ «Крыніца», ААТ «Піўзавод «Аліварыя», ААТ «Лідскае піва», кампанія «Heineken у Беларусі» (ЗЗАТ «Піваварная кампанія «Сябар», СААТ «Рэчыцапіва»), ААТ «Брэсцкае піва».

«Мы аб'ядналіся не супраць кагосьці, мы — за піва», — падкрэсліў выканаўчы дырэктар гільдыі Саўлюс Галадаўскас. Сябры гільдыі падпісалі Кодэкс гонару піваварў, і нават плануюць стварыць Акадэмію піва. Як падкрэсліў выканаўчы дырэктар гільдыі Саўлюс Галадаўскас, галоўная каштоўнасць для кожнага піўвара — гэта высокая якасць прадукту, сыравіны і працэсаў піваварства.

Што ж, чакаем, калі песня «Піце піва, мужыкі!» стане афіцыйным гімнам Беларусі.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### РЫГОР БАРАДУЛІН

Статус маральнага лідэрства замацаваўся за Рыгорам Барадуліным даўно. І паэт перыядычна яго пацвярджае — сваімі ўчынкамі, творчасцю. У Мінску адбылася прэзентацыя новай кнігі вершаў Рыгора Барадуліна «Халодная памяць вады». Пад вокладкай ілюстраванага літаратурна-мастацкага выдання аб'ёмам амаль у паўтысячы старонак сабраныя вершы Рыгора Іванавіча, напісаныя на пачатку XXI стагоддзя. Зборнік быў надрукаваны напярэдадні 75-годдзя аўтара, якое адзначалася 24 лютага.

На прэзентацыі зборніка паэт Генадзь Бураўкін зазначыў, што ўсе кнігі Барадуліна сталі з'явай у беларускай літаратуры, а таксама ў душы і лёсах многіх людзей. Паводле яго слоў, з кожнай кнігай Барадулін мяняўся і ўзвышаўся. «І калі першыя яго зборнікі перапоўнены зямнымі рэаліямі і пачуццямі, дык з цягам часу паэт становіцца духоўна багатым, духоўна строгім і духоўна адданым. Я хачу пакланіцца Богу за тое, што ён падарыў нам геній Барадуліна. Я хачу пакланіцца Барадуліну за тое, што ён свой Божы дар аддаў роднай Беларусі», — цытуе словы Бураўкіна БелаПАН.

### ІГАР МАКАРАЎ



Чэмпіён Алімпійскіх гульняў–2004 беларускі барацьбіт Ігар Макараў заваяваў золата ў катэгорыі звыш 100 кілаграмаў на чэмпіянаце Еўропы па дзюдо, які праходзіць у сталіцы Аўстрыі Вене. На шляху да золата Ігар Макараў адолеў балгарына Івана Іліева, украінца Станіслава Бандарэнку, паляка Януша Вайнаровіча і венгра Барну Бора. Гэта другі медаль беларускіх дзюдаістаў на першынстве кантынента. Раней срэбным прызёрам стаў Аляксандр Сцяшэнка.

У камандным заліку асабістых спаборніцтваў беларуская зборная заняла 6-е месца сярод 44 краін-удзельніц. Наперадзе — Венгрыя, Расія, Румынія, Галандыя і Славенія. У заліку мужчынскіх каманд Беларусь на другой пазіцыі ўслед за Расіяй. У жаночым заліку беларуская дружына падзяліла апошні 21-ы радок з яшчэ 14 камандамі.

Ігар Макараў пачаў займацца дзюдо з прыкладу свайго старэйшага брата і доўгі час ставіўся да спорту як да хобі, хаця першы поспех прыйшоў да яго яшчэ ў падлеткавым узросце з перамогаю на юнацкім першынстве Беларусі. Пасля школы Ігар паступіў у політэхнічны інстытут на факультэт машынабудавання, атрымаў дыплом інжынера-гідраўліка і нават папрацаваў на заводзе. У прафесійны спорт дзюдаіст прыйшоў у 1998 годзе: у зборную Беларусі Ігара запрасілі пасля таго, як ён заваяваў срэбра на моладзевым першынстве Еўропы.

### ЛІДЗІЯ ЯРМОШЫНА



У сувязі з завяршэннем кампаніі па выбарах у мясцовыя саветы немагчыма не згадаць персону вернай кіраўніцы Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай. Спадарыня Ярмошына мае добрае вобразнае мышленне і ўмее парадаваць выбарцаў і журналістаў трапным выразам. Напрыклад, у 2001 годзе яна абяцала, што ЦВК будзе працаваць прынцыпова, у адпаведнасці з законам, але «праяўляючы максімальную ашчаднасць у адносінах да прэтэндэнтаў». Пазней, стаўшы персонай non-grata ў Еўрасаюзе, дзялілася сваімі марамі пра weekend у Парыжы з томікам твораў Хемінгуэя.

Але ж нашы людзі не абораю хлеб кроіць, і ў ЕС могуць толькі шкадаваць пра наяўнасць візавых бар'еаў ды спісаў неўязных. На прэс-канферэнцыі, калі падводзіліся вынікі выбараў у мясцовыя саветы, Лідзія Ярмошына выказала меркаванне, што беларусы — блізкія да ідэалу выбарцы. «Еўрапейскаму электарату яшчэ расці і расці да ўзроўню нашага», — зазначыла кіраўніца Цэнтрвыбаркама,каментуючы вялікі, у параўнанні з большасцю еўрапейскіх краін, працэнт яўкі выбаршчыкаў на непапулярных у Беларусі мясцовых выбарах.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ПАМІЖ ГІМНАМ І РЭКВІЕМАМ

Сяргей НІКАЛЮК

**Мадэрнізацыя — гэта рух з архаікі ў сучаснасць, і яна не можа быць паспяховай толькі за кошт эканамічнай лібералізацыі.**



Прыемна, калі цябе цытуюць. Удвая больш прыемна, калі цябе цытуюць з самай высокай трыбуны краіны. У папярэдніх «Азбуках паліталогіі» я неадназова адзначаў, што на рынку канкуруюць паміж сабой не толькі эканомікі, але дзяржавы, народы і нацыянальныя праекты. Мая пісаніна не была дарэмнай. Цытую па афіцыйным тэксце «Паслання–2010»: «Целью наших усилий должно быть формирование по-современному конкурентоспособных как экономики, так и государства в целом. И, более того, конкурентоспособной белорусской нации!»

Што ж неабходна для дасягнення канкурэнтаздольнасці пералічанай вышэй трыяды? Па меркаванні аўтара паслання — мадэрнізацыя. Гэта першая выснова, якую я зрабіў, праседзеўшы 20 красавіка амаль чатыры гадзіны перад тэлевізарам. А вось другая выснова ў мяне не такая аптымістычная. Аўтар паслання, які ставіў задачу па дасягненні канкурэнтаздольнасці ў трох галінах, збіраецца яе вырашаць выключна за кошт мадэрнізацыі эканомікі.

## Пра грыбы і грыбнікоў

Ці ёсць у гісторыі прыклады паспяховай мадэрнізацыі? Не так шмат, як хацелася б, але такія прыклады адшукаць пры жаданні можна. Напэўна, самы цікавы — Паўднёвая Карэя. Пасля падзелу краіны ў 1945 годзе 80 працэнтаў прамысловых прадпрыемстваў апынуліся ў паўночнай частцы, але гэта не перашкодзіла Паўднёвай Карэі за некалькі дзесяцігоддзяў зрабіць рывок з трэцяга свету ў першы.

Але вось іншы прыклад. Мадэрнізацыя ў Расіі пачалася яшчэ пры Барысе Гадунове. Яна працягваецца ўжо пятае стагоддзе. І які вынік? Спашлюся на апошні даклад Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці. У 2009 годзе ў Расіі было пададзена 569 патэнтавых заявак (0,4 працэнта заявак на новыя патэнты, якія будуць прызнаныя на міжнародным узроўні), а ў Паўднёвай Карэі — каля 8 тысяч. Што называецца, адчуйце розніцу. На першым жа месцы з вялікім адрывам ЗША — 45,8 тысячы заявак.

Але чаму настолькі ашаламляльныя адрозненні ў выніках? Што дапамагло карэйцам выйсці ў сусветныя лідэры, і што не дазволіла рускім, якія знаходзяцца ў рэжыме даганяльнай мадэрнізацыі ўжо больш за чатыры стагоддзі, да гэтых самых лідэраў наблізіцца? Зразумела, да аднай прычыны звесці тлумачэнне нельга. Тым не менш ёсць галоўная, якая перакрывае ўсе астатнія. Гэта якасць дзяржавы.

На працягу стагоддзяў расійская дзяржава імкнулася быць моцнай, і гэта ў яе рэгулярна атрымлівалася. Вось толькі сваю моц яна накіроўвала пераважна на прыгнечванне ініцыятывы сваіх грамадзян. Пры першым цары-рэфарматары Барысе Гадунове канчаткова сфарміравалася прыгоннае права. Рэфарматары-бальшавікі ўсіх загналі ў цэнтралізаваную планавую эканоміку, пазбавіўшы тым самым кожнага магчымасці будаваць уласныя планы. Пры Пуціне грамадства падмяла пад сябе карумпаваная бюракратыя і сілавікі.

Варта толькі якому-небудзь расійскаму бізнесмену зрабіць сваё прадпрыемства прыбытковым, як прадстаўнік усюдыіснай дзяржавы (падатковы інспектар, міліцыянер, пажарнік) ужо настойліва стукае ў дзверы яго кабінета. Тут галоўнае — паспець першым. У Расіі бізнесмены «ўспрымаюцца ўладай накшталт такіх грыбоў у лесе. І ў той момант, калі грыбнік гэты грыб знаходзіць, у грыбніка ўзнікае права ўласнасці на грыб» (Юлія Латыніна). Імёны самых удачлівых «грыбнікоў» даведацца нескладана, для гэтага дастаткова паглядзець, хто сёння кантралюе актывы кампаніі «ЮКАС».




## Амаль па Дантэ

Але паспяшаемся вярнуцца ў залу пасяджэнняў беларускага парламента, дзе кіраўнік дзяржавы абвяшчае 2010 год ключавым «в определении дальнейшей стратегии развития Беларуси». Падстаў для гэтага тры. Па-першае, завяршаецца пяцігодка, а ўлада, нягледзячы на аб'ектыўныя цяжкасці, «не отказывается от обязательств, взятых на себя пять лет назад». Па-другое, у бягучым годзе мы мусім «полностью преодолеть последствия мирового кризиса». Па-трэцяе, і гэта самае галоўнае, «необходимо заложить основы для динамичного прорыва в развитии нашей страны — нового этапа в построении сильного и процветающего государства».

Звярніце ўвагу, дынамічнае развіццё краіны — гэта ўсяго толькі этап у пабудове моцнай дзяржавы. Мяркуецца, што ў такой дзяржаве будзе забяспечана новая (еўрапейская) якасць жыцця. Тут узнікаюць натуральныя пытанні: а для каго, і які пералік параметраў такога жыцця? Вось, да прыкладу, судовая сістэма. Без яе эфектыўнай працы пра еўрапейскую якасць казаць не даводзіцца.

Возьмем афіцыйны тэкст паслання, размешчаны на сайце «Советской Белоруссии», і пры дапамозе пошукавай сістэмы палічым колькасць слоў з коранем «суд». Такіх знайшлося 29 штук, але ўсе яны былі толькі часткай слова «государство». Такім чынам, «Пасланне–2010» — гэта своеасаблівы гімн дзяржаве: «государственная политика», «государственная деятельность», «государственные программы» і інш. Месца ж для абмеркавання судовай сістэмы, што была б здольнай абараняць усіх нас, у тым ліку і ад самаўпраўнасці «сильного государства», у пасланні не знайшлося.

А як наконт свабоднага доступу да незалежных крыніц інфармацыі? У новым якасным жыцці, якое чакае беларусаў «в самой ближайшей перспективе», «Белпошта» і «Саюздрук» будуць распаўсюджваць недзяржаўныя грамадска-палітычныя газеты, або ўсё застанецца па-ранейшаму? Адказу на гэтае пытанне я ў пасланні не знайшоў. Затое любы жадаючы можа з ім азнаёміцца, прачытаўшы ў інтэрнэце чарговыя адкрыцці кіраўніка Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Аляксандра Зімоўскага. Цытую: «Я не знаю, чего хочет народ. Если говорить банальными наборами благ, то работа, жильё, мир на улицах, возможность жить и учиться — наверно, всё это есть. Надо отдавать себе должное — мы небогатая страна, страна ниже среднего достатка».

Што тут прычына, а што следства? Мы небагатая краіна — таму не можам дазволіць сабе падпісацца і прадаваць «Новы час» праз дзяржаўную сістэму распаўсюду, або мы не распаўсюджваем «Новы час» — і таму небагатыя?

Але акрамя скупога пераліку выгод, якія спадар Зімоўскі даваляе ўсім нам жадаць, у новае жыццё з жыцця старога будзе дазволена перанесці «надзеі на выхад з крызісу канкрэтна з Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам». Спадзявацца на кагосьці іншага, у тым ліку і на самога сябе, бессэнсоўна, па словах Зімоўскага: «таму што такая магутная машына інфармавання, якую я кантралюю, адразу ж растлумачыць нашым грамадзянам, што гэта змаганне вядзецца супраць таго, каб прэзідэнт палепшыў жыццё людзей».

Да прачытання такога выдатнага тэксту я лічыў, што дзеліцца на «канструктыўную» і «так званую» ў Беларусі толькі апазіцыя. Аднак высветлілася, што гэты прынцып распаўсюджваецца і на надзеі. З гэтага часу «всяк сюда входящему» давядзецца пакідаць сваю надзею і атрымліваць наўзамен надзеі на моцную дзяржаву і яе нязменнага кіраўніка, інакш, пераблытаўшы вароты, можна будзе патрапіць замест раю ў пекла.

## Бервяно на дарозе

Беларуская аўтарытарная дзяржава ўсвядоміла неабходнасць мадэрнізацыі, хай і ва ўсечаным выглядзе. Запішам ёй гэта ў актыў. Але хто будзе суб'ектам мадэрнізацыі? Звернемся да тэорыі «Азбукі паліталогіі». Лідэры аўтарытарных рэжымаў могуць абапірацца на адзін з трох інстытутаў: бюракратыю, «сілавікоў» або дамінуючую партыю (магчыма і іх камбінацыя). Гэта адрозненне адпавядае тром асноўным тыпам аўтарытарных рэжымаў: бюракратычнаму, ваеннаму і аднапартыйнаму.

Зразумела, што ў нашым выпадку мы маем справу з бюракратычным рэжымам. На жаль, «Пасланне–2010» — гэта не толькі гімн моцнай дзяржаве, але адначасова і рэквіем па здольнасцях бюракратаў яе мадэрнізаваць. Адпаведныя прыклады рассыпаныя па ўсім тэксце паслання. Лукашэнка літаральна спатыкаецца аб іх. Прывяду адзін з найбольш яркіх: «Два с половиной года не мог начать реализацию проекта по строительству транспортно-логистического центра в районе Национального аэропорта «Минск» бельгийский инвестор. Два с половиной года! Человек постучался в дверь, показал деньги (известная фирма, с именем мировым!), и около двух лет ушло у него только на согласование проекта инвестиционного договора. И вы думаете, он, проект, за два года изменился в чем-то? Вот он пришел с ним — через два года тот же проект был утвержден».

Калі мне памяць не здраджвае, за апошнія гады былі прынятыя тры дырэктывы: «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны» (№1), «Аб мерах па наступнай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарата» (№2) і «Эканомія і ашчаднасць — галоўныя фактары эканамічнай бяспекі дзяржавы» (№3). Прыкметнага прагрэсу па ўсіх трох накірунках дасягнуць не атрымалася. І гэта не маё дылетанцкае меркаванне. Чытайце пасланне.

Сёння ў якасці галоўнага фактару ўзмацнення дзяржавы абвешчана мадэрнізацыя. У студзені чыноўнікі Мінэканомікі паабяцалі нам чарговы план па лібералізацыі эканомікі. На двары канец красавіка, але плана мы так і не дачакаліся. Аднак не варта адчайвацца — «назрела необходимость принятия Директивы № 4 о дальнейшей либерализации экономики, направленной на раскрепощение предпринимательской инициативы». Разнявольваць ініцыятыву, зразумелая справа, будуць бюракраты, з чым я і віншую прадпрымальнікаў.

Але не варта забываць, што прадпрымальнікі (бізнесмены) адыгрываюць у беларускай эканоміцы далёка не галоўную ролю. Саліруюць у нас дырэктары дзяржаўных прадпрыемстваў і «вертыкальшчыкі», але яны не прадпрымальнікі, а гаспадарнікі. Іх «безынициативность и неэффективность» мяжуе з «имитацией работы». І з гэтым варта пагадзіцца. Крызіс, з якім сёння сутыкнулася Беларусь, спароджаны імітацыйным спосабам нацыянальнага жыцця, і генеруецца ён не знізу, а зверху. Лепшая ілюстрацыя гэтаму — выбары, якія завяршыліся ў мінулую нядзелю.

Як нельга быць крыху цяжарнай, так немагчыма ўтрымаць імітацыю выключна ў рамках выбарчых кампаній. Імітацыя — частка савецкай спадчыны. Згадайце знакамітае: ЯНЫ робяць выгляд, што плацяць, МЫ робім выгляд, што працуем. Гэты прынцып пры камуністах ляжаў у аснове «сацыяльнага кантракту». Вынік вядомы.

Пазбавіцца ад усеагульнай імітацыі беларусам перашкаджае «моцная дзяржава», яна састарэла ўжо ў момант свайго нараджэння. Таму галоўным накірункам мадэрнізацыі павінна стаць мадэрнізацыя дзяржавы, што ляжыць бервяном на дарозе, якая вядзе да «новай якасці жыцця».

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

# ШУРПАТАСЦІ І НЯЗРУЧНАСЦІ МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАЎ

Вольга ХВОІН

**Выбары ў мясцовыя саветы дэпутатаў 26-га склікання адбыліся. Па афіцыйных звестках, яўка выбарцаў склала амаль 80 працэнтаў. Толькі на 15 працэнтах участкаў выбіраць было з каго, на астатніх электаральны працэс прайшоў без альтэрнатывы.**



Ад апазіцыі ў мясцовыя саветы здолелі патрапіць толькі восем чалавек. Дэпутатамі сталі тры прадстаўнікі аргкамітэта партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» і пяць — левай партыі «Справядлівы свет». З партыі БНФ і руху «За свабоду» ніхто ў мясцовыя саветы не патрапіў. Пры тым, што ад палітычных апазіцыйных структур балатаваліся больш за 400 чалавек.

Прадстаўнікі апазіцыі не лічаць выбарчую кампанію абсалютна марнай. Так, лідэр руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч пазітыўным вынікам удзелу ў выбарах назваў «пэўнае павелічэнне пратэстных настрояў у грамадстве і дэманстрацыю альтэрнатывы». «Цяпер галоўнае, каб цывілізаваны свет усвядоміў, што гэтыя выбары сфальшаваныя, іх нельга прызнаваць. Выбарчая кампанія ў мясцовыя саветы, якая фактычна з'яўляецца рэпетыцыяй прэзідэнцкай кампаніі, сведчыць, што на прэзідэнцкіх выбарах будзе адбывацца закручванне гаек», — гаворыць палітык.

У Цэнтрвыбаркаме лічаць, што сур'ёзных парушэнняў гэтая кампанія не мела, і насамрэч абгрунтаваных скаргаў у ЦВК было пададзена няшмат. «Многія палітыкі робяць гэта (пішуць скаргі ў ЦВК) зусім не таму, што хочуць абгрунтаваць свой пройгрыш. Гэта жаданне ў чарговы раз нагадзіць роднай дзяржаве, каб яшчэ раз пакрычалі і сказалі, што дэмакратычныя перетварэнні ў Беларусі носяць дэкаратыўны характар», — заявіла на выніковай прэс-канферэнцыі Лідзія Ярмошына.

Таксама кіраўніца ЦВК паведаміла, што шэраг кандыдатаў праігнаравалі прадстаўленыя магчымасці для правядзення перадвыбарнай агітацыі, толькі 23 працэнты кандыдатаў выкарысталі грошы, вылучаныя з дзяржбюджэту на выданне ўлётак.

Ці не ёсць гэта самы чаканы для ўладаў вынік? Плён работы адладжанай імітацыйнай выбарчай сістэмы, пры якой немагчымы кантроль за падлікам галасоў. На гэты конт цікавы эксперымент паставіла партыя «Справядлівы свет». На адным участку іх кандыдат праводзіў самую актыўную працу, дайшоў ці не да кожнага выбаршчыка, на другім — абмежаваўся адной улёткай за казённы кошт, на трэцім — нават улётку не друкаваў. На выхадзе кожны з іх атрымаў каля 10 працэнтаў.

Лідзія Ярмошына мяркуе, што «ўсе камісіі спрацавалі добра», а, напрыклад, факты неўключэння ў спісы выбарцаў, — гэта «шурпатасці і нязручнасці, звычайныя для любых выбараў», і ставіцца да іх трэба з разуменнем.

Назіральнікі ў супрацьвагу старшыні ЦВК прыводзяць безліч прыкладаў, якія сведчаць пра праблемы ў арганізацыі выбарчага працэсу. Як зазначыў кіраўнік праваабарончага цэнтру «Вясна» Алесь Бяляцкі, прэтэнзіі пачаліся яшчэ на стадыі фармавання камісій. Паводле зменаў у выбарчым заканадаўстве, камісіі мусяць не менш як на траціну складацца з прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Патрабаванне было выкананае, але прадстаўніцтва апазіцыі ў выбаркамах было зведзена да мінімуму.

Назіральнікі маюць найбольш прэтэнзій да актыўнай кампаніі па арганізацыі датэрміновага галасавання і працэсу падліку галасоў. 75,5 працэнта назіральнікаў з кампаніі «Праваабаронцы за справядлівыя выбары» заявілі, што не мелі магчымасці назіраць за падлікам галасоў. Апроч таго, прыкладна на палове ўчасткаў, дзе знаходзіліся назіральнікі, не было раздзельнага падліку галасоў выбарцаў з датэрміновага галасавання і асноўнага дня. І гэтая розніца на ўчастках з моцнымі апазіцыйнымі кандыдатамі была істотнай.

Напрыклад, у Барысаве кандыдат ад руху «За Свабоду» Дзмітрый Бабіцкі ў асноўны дзень галасавання перамог свайго галоўнага канкурэнта — дырэктара палітэхнікума Шмакава, але саступіў па выніках выбараў з датэрміновым галасаваннем. Слонімскі кандыдат у дэпутаты Іван Шэга — вядомы ў рэгіёне доктар — упэўнена перамагаў у дзень выбараў і ў галасаванні на даму, але канчатковы вынік выбараў у акрузе вырашылі бюлетэні са скрыні датэрміновага галасавання.

Праваабаронцы называюць папярэдняе галасаванне «чорнай дзіркай» выбарчага заканадаўства, што дае магчымасці для маніпуляцый. З пачатку года абавязковы парог яўкі ў 50 працэнтаў быў скасаваны. Тым не менш, па звестках ЦВК, амаль траціна выбарцаў прагаласавалі датэрмінова на выбарах у мясцовыя саветы. Па сведчанні назіральнікаў ад дэмакратычных сілаў, рэальная яўка на выбары ў Мінску была не болей за 25–30 працэнтаў. Па рэгіёнах — не болей за 40–45.

Мясцовыя выбары многія эксперты называлі рэпетыцыяй прэзідэнцкіх, якія могуць адбыцца ўжо напрыканцы гэтага года. Кіраўнік праваабарончага цэнтру «Вясна» Алесь Бяляцкі лічыць, што дзеючае заканадаўства пакідае магчымасці для маніпуляцый. «Асноўныя праблемы, якія былі і на папярэдніх выбарах, засталіся. Гэта суб'ектыўнасць фармавання ўчастковых камісій, абмежаванне агітацыйнай кампаніі, папярэдняе галасаванне. Таму мы настойліва раім дэпутатам Палаты прадстаўнікоў задумацца і ўсё ж унесці ў выбарчае заканадаўства змены, якія сур'ёзна наблізілі б яго да міжнародных стандартаў. Мясцовыя выбары паказалі, што застаюцца прагалы, магчымасці для маніпуляцый, якія могуць стаць прычынай для крытыкі выбарчага працэсу», — падкрэслівае праваабаронца.

САМАКІРАВАННЕ

# БРАТАННЕ СТАРАСВЕТЧЫНЫ І ІНДУСТРЫЯЛУ

Марыя КРУК

**Што аб'ядноўвае старажытны Полацак і горад з футурыстычнай назвай Электрасталь, Венесуэлу і райцэнтр Беларусі? Народная дыпламатыя. Адна з нямногіх сфер, куды рука сталічнай вертыкалі калі і сягае, то не так далёка, як у справах вызначэння агульнай канцэпцыі развіцця горада. Гарады-пабрацімы — прыгожы антураж для вядзення бізнесу і культурнага абмену.**

Сяброўства народаў — дзейсная мантра на прасторах былога СССР. Вышэйшае кіраўніцтва прагаворвае яе, падпісваючы пагадненні наконт паставак танных энергарэсурсаў і культурнага абмену, адміністрацыя гарадоў з гонарам дэманструе спісы з назвамі экзатычных і не вельмі населеных пунктаў свету, якія з'яўляюцца пабрацімамі ці партнёрамі. Дыпламатычныя сувязі зверху перыядычна пашыраюцца на лакальны ўзровень. Напрыклад, Баранавічы — у чаканні падпісання адпаведнага пагаднення з адным з гарадоў Венесуэлы. Дамоўленасць была дасягнутая з сакавіку гэтага года падчас працоўнай паездкі ў райцэнтр Брэсцкай вобласці першага сакратара пасольства Баліварскай Рэспублікі Херарда Эстрада Марцінеса.

Найбольшымі сувязямі з гарадамі замежных краін могуць пахваліцца сталіца Беларусі, а таксама Магілёў ды Гродна. Такое братанне дае магчымасць не толькі ладзіць культурніцкія абмены, але і прыцягваць працоўную сілу. Паводле афіцыйнай інфармацыі, в'етнамскія рабочыя працавалі на будоўлі цэнтра «Мінск — Арэна» ў межах партнёрства з горадам Хашымін. Партнёрскія сувязі Мінск мае і з в'етнамскім Ханоем. Да слова, у першынстве кірункаў двухбаковых кантактаў і адукацыйныя праграмы. Ці насамрэч прычына хаваецца ў сяброўстве гарадоў, але студэнтаў з Азіі, відавочна, на вуліцах беларускай сталіцы пабольшала цягам апошніх пяці год.

У абласнога цэнтра Гомель сумесныя праекты з французскім Клермон-Феранам скіраваныя крыху ў іншы бок — адукацыя, культура, спорт, спаборніцтвы. Пры падтрымцы французскага боку ў Гомелі быў створаны і дзейнічае Франка-беларускі інстытут, які нядаўна пасол Францыі ў Беларусі Мішэль Рэнеры абяцаў раіць як кузню добрых кадраў інвестарам, калі тыя пачакаюць асвойваць эканамічныя прасторы сінявокай.

Народная дыпламатыя часам сапраўды садзейнічае пабытаваму ўзаемапаразуменню лепш за палітычныя рашэнні




зверху. Кіраўніцтва Магілёва можа прадэманстраваць мноства прыкладаў на гэту тэму. Абласны адміністрацыйны цэнтр мае 12 гарадоў-пабрацімаў, з 8-ю гарадамі падпісаныя дамовы аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве, з 7-ю гарадамі рэалізуюцца сумесныя мерапрыемствы ў рамках падпісаных пратаколаў аб намерах. Супрацоўніцтва Магілёва з Управай Сакалiная гара Усходняй адміністрацыйнай акругі Масквы ўключае шэраг праектаў у гандлёва-эканамічнай, культурнай, спартовай, гуманітарнай сферах: і Міжнародны фэст «Магутны Божа», і кантактна-кааперацыйныя біржы — адным мірам братання мазаныя. Да слова, у 2006 годзе ў Маскве быў добраўпарадкаваны адзін з дворыкаў жылога мікрараёна з выкарыстаннем этнаграфічных матываў Беларусі. Масква адказала такім жа праектам у Магілёве.

Гісторыя з гарадамі-пабрацімамі часам падкідае дзіўныя сюрпрызы. Напрыклад, старажытны Полацк у пабрацімах мае расійскі горад Электрасталь і Вялікі Ноўгарад. Калі ў першым ланцужку сувязяў дысананс выклікае супрацьпастаўленне індустрыялу і старасветчыны, то ў другім — супольная гісторыя, поўная міжусобных войнаў і змаганняў за першынство на геапалітычнай прасторы.

У часы цяперашнія і мірныя (калі не лічыць энергетычных войнаў) наяўнасць падпісаных пагадненняў, натуральна, пашырае мажлівасці супрацоўніцтва паміж гарадамі. Іншая справа, у Беларусі аб тым, з кім сябруе горад, ведаюць далёка не ўсе яго жыхары, а яшчэ менш — аб сумесных праграмах, якія рэалізуюцца ў межах гэтага сяброўства.

«Фішка» з гарадамі-пабрацімамі дакументальна была зацверджана не так даўно: першае пагадненне аб сяброўстве і супрацоўніцтве паміж гарадамі краін-саюзніц па Антыгітлераўскай кааліцыі было падпісана ў 1942 годзе паміж Сталінградам і англійскім Ковентры — абодва амаль цалкам былі разбураны вайной, іх жыхары на знак маральнай падтрымкі пісалі адзін аднаму пасланні, а пасля яшчэ і абмяняліся абрусам і мячом.

Натуральна, партнёрства гарадоў мае значна больш доўгую гісторыю, але хто першы аформіў патэнт — таму і слава. Цяпер нават дзейнічае Сусветная федэрацыя пароднёных гарадоў, яе мэта — умацаванне сувязяў паміж гарадамі розных дзяржаў. Федэрацыя аб'ядноўвае звыш 3 500 гарадоў свету, месціцца ў Парыжы і нават заснавала Сусветны дзень гарадоў-пабрацімаў. І калі жыхару Урупінска надта да спадобы Ніца, то можна напісаць у Федэрацыю, магчыма, яе кіраўніцтва і паспрыяе здзяйсненню мары аб цесным сяброўстве, але дакладна не аб эміграцыі.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# РЫЗЫКІ АЛЬТЭРНАТЫЎНАЙ ЭНЕРГЕТЫКІ

Вольга ХВОІН

**Краіны, якія хочуць развіваць атамную энергетыку, мусяць рэальна ацэньваць рызыкі зменлівасці і нестабільнасці геапалітыкі. Таму найперш варта думаць пра тое, як здабываць энергію, не разбураючы навакольнае асяроддзе. Такое меркаванне выказаў прэм'ер-міністр федэральнай зямлі Брандэнбург (ФРГ) Маціяс Плацэк падчас свайго візіту ў Мінск.**



Палітык меў шэраг сустрэч з кіраўніцтвам Беларусі, падчас якіх абмяркоўваліся варыянты супрацоўніцтва ў галіне лагістыкі, энергетыкі, выкарыстання альтэрнатыўных крыніц энергіі. У прыватнасці, як перадае Інтэрфакс, Германія зацікаўленая ў развіцці супрацоўніцтва з Беларуссю ў лагістычнай сферы і не выключае магчымасці інвестыцый у будаўніцтва лагістычных цэнтраў. «У Беларусі ёсць дзяржаўная праграма па развіцці лагістычных паслуг, і мы хацелі б, каб была магчымасць выкарыстаць наш досвед. Цалкам верагодна, што мы прыйдзем і да інвестыцый будаўніцтва лагістычных цэнтраў», — расказаў прэм'ер-міністр зямлі Брандэнбург журналістам. Немцы зацікаўленыя ў развіцці транспартнага калідору «Парыж — Берлін — Варшава — Мінск — Масква».

Варыянты супрацоўніцтва ў энергетычнай сферы абмяркоўваліся падчас «Майстэрні будучыні» — сумеснага праекта Беларусі, Германіі і ЕС, які прадугледжвае ў 2011 годзе старт будоўлі ў Мінску энергапасіўнага будынку. Паводле задумы аўтараў, праект будзе наглядна дэманстраваць магчымасці прымянення энергазберагальных тэхналогій, узнаўляльных крыніц энергіі ў будаўніцтве. Спадар Плацэк лічыць, што Беларусі можа быць карысны досвед Германіі ў галіне развіцця сучасных энергатэхналогій.

Маціяс Плацэк з'яўляецца адным з заснавальнікаў «Зялёнай лігі» у ФРГ, мае дыплом у галіне біямедыцынскай кібернетыкі. У 1990–1998 гадах займаў пасаду міністра навакольнага асяроддзя зямлі Брандэнбург.

Разам з тым, Маціяс Плацэк зазначае, што цяпер і да альтэрнатыўнай энергетыкі падыход мусіць быць узважаны. «Раней мы думалі, што выкарыстанне ўзнаўляльных крыніц энергіі не нясе праблем. Але цяпер рызыкі, звязаныя з гэтай канцэпцыяй, нельга недаацэньваць. Напрыклад, важна не спыніць плынь турыстаў, актыўна засвойваючы альтэрнатыўную энергетыку. Выкарыстанне біямасы мае этычны складнік: ці не станецца так, што фермерам больш выгодна будзе вырошчваць не зерне для хлеба, а аддаваць палі пад біямасу? Спажыванне энергіі сонца — пад сонечныя батарэі адводзяцца вялікія тэрыторыі ў 150 футбольных палёў. А захаванне жывёльнага і расліннага свету?» — пералічвае магчымыя пагрозы прэм'ер-міністр.

І ўсё ж Маціяс Плацэк прыходзіць да высновы, што альтэрнатыўная энергетыка цяпер — неабходны складнік развіцця краіны. Для Беларусі ён бачыць перспектывы ў выкарыстанні энергіі сонца, біямасы, ветру, хаця наша краіна і не мае вялікіх перападаў рэльефу. Але найперш рэзервы трэба шукаць у эканоміі, у тым ліку і побытавай. «Я бачу тут магчымасці скараціць энергаспажыванне на 20–30 працэнтаў. У нас многае ў энергазберажэнні было зроблена менавіта за кошт цеплаізаляцыі панэльных дамоў — гэта нескладанае тэхнічнае мерапрыемства», — зазначае палітык.

Узнаўляльныя крыніцы энергіі, выкарыстанне мясцовых відаў паліва і энергазберажэнне — адны з асноў энергетычнай бяспекі Беларусі, што адлюстравана ў дзяржаўных праграмах. Сёлета, напрыклад, запланавана знізіць энергаёмістасць ВУП на 10 працэнтаў. Паводле інфармацыі Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарту, штогод назіраецца скарачэнне энергаёмістасці прадукцыі. Найлепшыя вынікі ў гэтым кірунку былі дасягнуты ў 2008 годзе, калі паніжэнне энергаёмістасці ВУП у рэспубліцы склала 8,4 працэнты. У пачатку 1990-х гадоў Беларусь была самай энергаёмістай сярод краін СНД — выдаткі энергарэсурсаў на 1 тысячу долараў ВУП складалі 780 кілаграмаў нафтавага эквіваленту. У 2009 годзе Беларусь дасягнула паказчыка ў 340 кілаграмаў нафтавага эквіваленту на 1 тысячу долараў ВУП. Аднак гэта невысокі вынік, калі параўноўваць з Германіяй ці Японіяй, дзе выдатак энергарэсурсаў складае 140 кілаграмаў на 1 тысячу долараў ВУП.

Ацэньваючы атамныя амбіцыі Беларусі, Маціяс Плацэк падкрэсліў, што кожная дзяржава сама мусіць вырашаць, якімі метадамі забяспечваць насельніцтва таннай энергіяй, але найперш трэба задумацца пра рызыкі, магчымыя наступствы.

«Кожнаму, хто пачынае такі шлях, я б рэкамендаваў вывучыць тэндэнцыі развіцця энергетыкі ў Еўропе, — зазначыў прэм'ер-міністр федэральнай зямлі Брандэнбург. — Пра будаўніцтва АЭС многа гавораць, але што адбываецца насамрэч? Фінскія калегі тры-чатыры гады таму гаварылі мне, што ўжо будуюць станцыю, але фіналу будаўніцтва не відаць, таму што фінансаванне прыпынілася. У Балгарыі тры-чатыры гады таму гаварылі, што пачынаюць будоўлю станцыі, але нядаўна я пачуў, што яны спыняюць узвядзенне атамнай электрастанцыі, бо не хапіла грошай. Для фінансавання такога маштабнага праекту цяпер няпроста знайсці адпаведныя рэсурсы. Я не зычу вам ці сабе гэтага, але калі раптам нешта здарыцца, нейкая аварыя на АЭС, то грамадская дыскусія разгорнецца цалкам у іншым ракурсе. Пасля аварыі на ЧАЭС ніхто не адважваўся будаваць атамную станцыю».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПІВАВАРЫ АБ'ЯДНАЛІСЯ ЗА ПІВА

Марыя КРУК

**Беларускія півавары аб'ядналіся ў прафесійную гільдыю. «Мы аб'ядналіся не супраць кагосьці, мы — за піва», — сказаў журналістам выканаўчы дырэктар гільдыі Саўлюс Галадаўскас.**

У грамадскае аб'яднанне «Саюз «Гільдыя піваравараў», каб сумесна адстойваць інтарэсы айчынных вытворцаў піва, увайшлі ААТ «Крыніца», ААТ «Піўзавод «Аліварыя», ААТ «Лідскае піва», кампанія «Heineken» у Беларусі (СЗАТ «Піваварная кампанія «Сябар», СААТ «Рэчыцапіва»), ААТ «Брэсцкае піва». Старшыня саюза літовец Саўлюс Галадаўскас мяркуе, што півавары Беларусі цяпер перажываюць не лепшыя часы, таму мусяць аб'ядноўваць свае сілы, каб змагацца з неспрыяльнымі фактарамі. Такімі, як забарона на рэалізацыю піва праз шапікі, агульнае пагаршэнне іміджу піваварнай галіны і распаўсюджванне ідэі «піўнога алкагалізму», рашэнне ўладаў Беларусі падвысіць стаўкі акцызаў на піва ў пачатку бягучага года на 54 працэнта, экспансія імпартнага піва на ўнутраны рынак, высокі кошт соладу і абмежаванні ў рэкламе прадукцыі.

Да слова, генеральны менеджэр «Heineken» у Беларусі Аляксей Чарняеў раней адзначаў, што высокая доля імпартнага піва на беларускім рынку (каля 30 працэнтаў) з'яўляецца кепскім фактарам для развіцця піваварных прадпрыемстваў.

«Гільдыя піваравараў» плануе даказаць, што беларускае піва вартае стаць «нацыянальным гонарам». «Місія гільдыі — захоўваць найлепшыя беларускія традыцыі піваварства, прывесці іх у адпаведнасць з вышэйшымі міжнароднымі стандартамі і перадаць наступным пакаленням», — сказаў Галадаўскас.

Заснавальнікі «Гільдыя піваравараў» не разумеюць палітыкі, накіраванай на стварэнне кепскага іміджу піву. Маўляў, шкода ад спажывання пладова-ягадных відаў і гарэлкі значна большая, чым ад соладавага напою. Паводле дадзеных канцэрна «Белдзяржхарчпрам», спажыванне піва ў 2009 годзе ў абсалютным алкаголі склала 2,3 літра на душу насельніцтва, віна вінаграднага — 0,4 літра, віны пладовага — 3,4 літра, моцных спіртных напояў — 5,4 літра. Заснавальнікі гільдыі абураюцца, што дзяржава ігнаруе ўнёсак піўной галіны ў эканоміку краіны і значныя падатковыя паступленні ў рэспубліканскі бюджэт — больш за 180 мільярдаў рублёў у гэтым годзе, падтрымку сельскай гаспадаркі праз закупы ячменю, стварэнне працоўных месцаў.

Летась назіраўся спад рэалізацыя піва на ўнутраным рынку. Тэндэнцыя захоўваецца і цяпер. За першы квартал бягучага года на ўнутраным рынку беларускія піваварныя кампаніі рэалізавалі на 5,1 працэнта піва менш, чым за аналагічны перыяд 2009 года. З усіх вытворцаў піва ў Беларусі рост аб'ёмаў вытворчасці па выніках першых трох месяцаў гэтага года прадэманстравала толькі кампанія «Сябар». Дырэктар «Брэсцкага піва» Алег Кісель канстатуе, што за апошнія гады ў краіне спынілі працу дзесяць піўзаводаў. Галіна выжывае ў многім за кошт буйных міжнародных інвестараў — кампаній «Heineken», «Carlsberg», «Olvi». Магчыма, хутка замежны інвестар прыйдзе і на Брэсцкі піўзавод — там пачалася кантрактная вытворчасць піва ўкраінскага брэнда «Дэсант» ЗАТ «Абалонь».

«Ідэя стварэння гільдыі наспявала даўно, але яна была сфарміраваная, калі вызначыліся асноўныя гульцы рынку, — зазначыў генеральны дырэктар ААТ «Крыніца» і выканаўчы дырэктар гільдыі Рыгор Пяткевіч. — У Беларусі культура спажывання алкаголю вельмі нездаровая ў параўнанні з суседнімі краінамі і краінамі Еўропы. Пераважае спажыванне гарэлкі і мацаваных вінаў. Калі нічога не рабіць, то можа адбыцца далейшае пагаршэнне ўмоў працы піваравараў: павелічэнне акцызаў, абмежаванні на рэкламу, імпарт будзе выцясняць айчыннае піва, спажыўцы — аддаваць перавагу пладова-ягаднаму больш, чым піву». Саюз піваравараў возьме на сябе не толькі эканамічную, але і асветную місію. Плануецца стварыць «піўную акадэмію».

Сябрам «Гільдыі піваравараў» можа стаць любое беларускае прадпрыемства, якое варыць піва, у тым ліку міні-бровары і рэстараны-бровары. Галоўная ўмова — вытворцы піва мусяць трымацца стандарту высокай якасці піва, сыравіны і працэсаў піваварства.

**Даведка:**

Саўлюс Галадаўскас, выканаўчы дырэктар «Гільдыі піваравараў» Беларусі. Па паходжанні літовец. Працаваў у структуры карпарацыі «Coca-Cola», займаў пасаду віцэ-прэзідэнта па карпаратыўных пытаннях канцэрна BBH Baltic, уваходзіў у кіраванне кампаній «Aldaris» (Латвія), «Saku» (Эстонія), «Svyturys Utenos alus» (Літва). З 2007 года ўзначальвае «Гільдыю піваравараў Літвы».

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ TV

## 3 МАЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00** 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05** Nota Bene.
**09.35** «Зорныя танцы». Мужчынскі сезон.
**10.50** «OFF STAGE LIFE».
**11.05** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Ваенная драма «У бок ад вайны» (Расія).
**13.45** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Зброя Перамогі. Магілёўшчына».
**15.55** Здароўе.
**16.20** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.30** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна».
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.55** Відэафільм АТН цыклу «Усё гэта было». Фільм 1-ы.
**22.10** Вострасюжэтная ваенная драма «Застава Жыліна» (Расія).
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** Фільм «Шырлі-Мырлі».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Фільм «Шырлі-Мырлі». Працяг.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** VII Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь-2010». Фінал.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** VII Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь-2010». Фінал Працяг.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. IV-ы сезон. 12-я серыя.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Злачынствы стагоддзя».
**23.55** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.40** Нашы навіны.
**00.55** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** «Вялікі горад».
**15.40** «Гарачы лёд».
**16.05** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Дабро пажаліцца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Палюбоўнік». Расія, 2002 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Забіць Біла 2». ЗША, 2004 г.

**ЛАД**

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Дакументальны фільм «Крышталь душы» («Белвідэацэнтр»).
**11.10** «Пра мастацтва».
**11.40** Школа рамонту.
**12.35** Вострасюжэтная меладрама «Тэрарыстка Іванова» (Расія).
**14.15** Пазакласная гадзіна.
**14.35** Бухта капітанаў.
**15.15** Тэлебарометр.
**15.30** Прыгодніцкі серыял «Чалавек вайны» (Расія).
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Маналогі аб вайне.
**21.20** Калыханка.
**21.40** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**23.10** Хакей. Формула гульні.
**23.40** Пляжны футбол. Зборная Беларусі-Зборная ветэранаў футболу.

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** Фільм «Жанаты халасцяк».
**08.25** Фільм «Вовачка».
**10.05** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.55** «Ранішняя пошта».
**11.30** Фільм «Карусель».
**12.45** Фільм «Ціхі Дон».
**13.50** Навіны-Беларусь.
**14.00** Фільм «Ціхі Дон». Працяг.
**16.50** Навіны-Беларусь.
**17.00** Фільм «Ціхі Дон». Заканчэнне.
**18.50** Навіны-Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Вясновы канцэрт.
**22.55** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.10** Навіны-Беларусь.
**23.20** Фільм «Дзевяць прыкмет здрады». Расія, 2008 г.

**НТВ**

**06.30** Камедыя «Фартуна».
**08.00** Сёння.
**08.15** «Праграма Максімум».
**09.10** Серыял «Тамбоўская ваўчыца».
**10.00** Сёння.
**10.20** Серыял «Тамбоўская ваўчыца».
**13.00** Сёння.
**13.25** Серыял «Тамбоўская ваўчыца».
**16.00** Сёння.
**16.20** Серыял «Тамбоўская ваўчыца».
**17.15** Вострасюжэтны дэтэктыў «Шпількі».
**19.00** Сёння.
**19.30** Вострасюжэтны дэтэктыў «Шпількі-2».
**21.20** Прэм'ера. Вострасюжэтны дэтэктыў «Шпількі-3».
**23.15** Вострасюжэтны серыял «Ментоўскія войны».
**00.55** «Першая кроў».

**EUROSPORT**

**09.30** Мотаспартыўны часопіс.
**09.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Маракеш (Марока). Гонка 2.
**10.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**12.15** Спартовая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.Бірмінгем (Вялікабрытанія). Фінал.
**13.30** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Фінал.
**14.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**16.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**20.45** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**21.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Паўднёвая Карэя, краіны Азіі, ЗША. Часопіс.
**21.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**22.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**01.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**02.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**02.20** Мотаспартыўны часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.30** Госць «Белсату».
**17.45** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.40** «Такіх песень сабе шукаю», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.30** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.05** ПраСвет.
**20.20** Блізкая гісторыя: іншы погляд: «Парanены», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**22.05** Фільматэка майстроў: «Нявеста пірата», драма, 1969 г., Францыя.
**23.35** Аб'ектыў.

## 4 МАЯ, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.05** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**10.00** Серыял « Агульная тэрапія « (Расія).
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН цыклу «Усё гэта было». Фільм 1-ы.
**12.10** Ваенная драма «Жывыя і мёртвыя» (СССР). 1-я серыя.
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Зброя Перамогі. Віцебшчына».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Міф аб ідэальным мужчыне» (Расія). Заключная серыя.
**16.50** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Відэафільм АТН цыклу «Усё гэта было». Фільм 2-і.
**22.05** Дэтэктыў «Апостал» (Расія). Закл. серыя.
**23.20** Вострасюжэтная ваенная драма «Застава Жыліна» (Расія).
**00.25** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** Прэм'ера. «Апошняя вясна Валянціны Талкуновай».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Шматсер. фільм «Катоўскі». 2010 г.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Зваротны адлік».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Палюбоўнік». Расія, 2002 г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водблiскі». Серыял.
**22.55** «Рэпарцёр СТБ».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Пацалунак». Бельгія, 2004 г.

**ЛАД**

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.30** «Запал па культуры».
**12.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**13.05** Хакей. Формула гульні.
**13.40** Вострасюжэтная меладрама «Тэрарыстка Іванова» (Расія).
**14.35** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Свая кампанія.
**15.30** Прыгодніцкі серыял «Чалавек вайны» (Расія).
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Маналогі аб вайне.
**21.20** Калыханка.
**21.40** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.15** Спорт-кадр.
**22.40** Моладзевая камедыя «Прынадны кавалачак» (Францыя).

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** Прэм'ера. «Вожык супраць свастыкі». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.40** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.35** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**13.50** Навіны-Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Пакой смеху».
**15.15** Тэлесерыял «Калі растаў снег». Расія.
**16.50** Навіны-Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны-Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Калі растаў снег». Расія.
**22.20** Прэм'ера - 2010. Тэлесерыял «Панадворак».
**22.55** Прэм'ера. «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.50** Навіны-Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** «Дзяжурны па краіне».

**НТВ**

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «І зноў добры дзень!».
**09.30** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Іх норавы».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Ваенна-гістарычная драма «Неба ў агні».
**21.40** Серыял «Ментоўскія войны».
**23.25** Сёння.
**23.45** Серыял «Афганская здань».

**EUROSPORT**

**09.35** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**11.00** Спартовая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.Бірмінгем (Вялікабрытанія). Фінал.
**12.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**13.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). Дзень 3.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**21.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA. ЗША.
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**00.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**00.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Спа-Франкашам (Бельгія). Агляд.
**01.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**02.15** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** МакраФон: «Рок-карона–2009», выбранае: ч. 2.
**18.15** Басанож па свеце (спазнаваўся праграма): 9 серыя, «Саванна».
**18.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.30** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.10** Акно ў Еўропу.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Асабісты капітал.
**21.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.50** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**22.35** Форум (ток-шоу): «Маці-адзіночкі».
**23.15** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 5 МАЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**10.00** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН цыклу «Усё гэта было». Фільм 2-і.
**12.10** Ваенная драма «Жывыя і мёртвыя» (СССР). 2-я серыя.
**14.05** Уласнай персонай.
**14.30** Хранікальна-дакументальны фільм «Кузьма Клімаў» цыклу «Вялікай Перамогі Салдаты» (Беларускае тэлебачанне).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Зброя Перамогі. Гомельшчына».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Развод і дзявоцкае прозвішча» (Расія). 1-я серыя.
**16.50** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлата 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** «Зямельнае пытанне».
**20.00** Прэм'ера. Дэтэктыў «Замах» (Беларусь - Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Відэафільм АТН цыклу «Усё гэта было». Фільм 3-і.
**22.05** Дэтэктыў «Замах» (Беларусь - Расія). 2-я серыя.
**23.10** Вострасюжэтная ваенная драма «Застава Жыліна» (Расія). Заключная серыя.
**00.20** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер.фільм.
**10.00** «Катоўскі». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Шматсер. фільм «Катоўскі». Расія, 2010 г.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Мінск і мінчане».
**23.25** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.50** Фільм «Даспехі бога». 1986 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.10** Спорт-кадр.
**12.45** Кінааповесць «Экіпаж машыны баявой» (СССР).
**13.55** Вострасюжэтная меладрама «Тэрарыстка Іванова» (Расія). 10-я, закл., серыя.
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Медычныя таямніцы.
**15.30** Серыял «Чалавек вайны» (Расія).
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Маналогі аб вайне.
**21.20** Калыханка.
**21.40** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.15** Гістарычная драма «Дабранач і поспехаў» (ЗША- Вялікабрытанія-Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Жаночы твар вайны. «Кацюша». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.20** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны-Беларусь.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Калі растаў снег». Расія.
**16.50** Навіны-Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны-Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Калі растаў снег». Расія.
**22.20** Тэлесерыял «Панадворак».
**22.55** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны-Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Вызваліцелі». «Марская пяхота». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Следства вялі…».
**09.20** «Іх норавы».
**10.20** «Іх норавы».
**10.55** «Кватэрнае пытанне».
**11.55** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.05** «Галоўная дарога».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Ваенна-гістарычная драма «Неба ў агні».
**21.35** Серыял «Ментоўскія войны».
**23.25** Сёння.
**23.45** Вострасюжэтны серыял «Афганская здань».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**09.55** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Паўднёвая Карэя, краіны Азіі, ЗША. Часопіс.
**10.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**12.00** Веласпорт. Велагонка Мілан - Сан-Рэма. Італія.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). Дзень 3.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). 1/8 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**20.40** Абранае па серадах.
**20.50** Конны спорт. Шматбор'е (ЗША).
**21.50** Навіны коннага спорту.
**21.55** Абранае па серадах. Госць тыдня.
**22.05** Гольф. Тур PGA. Турнір Quail Hollow Championship. Шарлот (ЗША).
**23.05** Гольф. Еўратур. Адкрыты чэмпіянат Іспаніі. Жырона (Іспанія).
**23.35** Гольф. Еўратур. Жанчыны. Еўракубак. Алікантэ (Іспанія).
**23.40** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.50** Ветразевы спорт. Рэгата Rolex China.
**00.20** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.25** Абранае па серадах.
**00.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.30** Аблічча таталітарызму: «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., Германія: 3 серыя, «Венгрыя. Вартаўнік жалезнай заслоны».
**19.25** Мультсерыял.
**19.40** На колах.
**20.10** «Фокусная адлегласць», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**20.35** Хто ёсць кім?: Уладзімір Някляеў. «Крэўнасць».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Еўразвяз і правы дзяцей».
**21.40** Рэпартэр.
**22.10** «Цік-так», маст. фільм, 2000 г., ЗША.
**23.40** Аб'ектыў.

## 6 МАЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.35, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.40** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Дэтэктыў «Апостал» (Расія). Заключная серыя.
**10.00** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН цыклу «Усё гэта было». Фільм 3-і.
**12.10** Прэм'ера. Ваенная драма «Лейтэнант Сувораў» (Расія).
**13.45** Дак. цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**14.30** Хранікальна-дакументальны фільм «Зінаіда Зайцава» цыклу «Вялікай Перамогі Салдаты» (Беларускае тэлебачанне).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Зброя Перамогі. Брэстчына».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Развод і дзявоцкае прозвішча» (Расія). 2-я серыя.
**16.50** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 01.30** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыў «Замах» (Беларусь - Расія). 3-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Відэафільм АТН цыклу «Усё гэта было». Фільм 4-ы.
**22.05** Дэтэктыў «Замах» (Беларусь - Расія). 4-я серыя.
**23.10** Гераічная ваенная драма «Дняпроўская мяжа» («Беларусьфільм»).
**01.35** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Катоўскі». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Прэм'ера. Шматсерыйны фільм «Катоўскі». Расія, 2010 год.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.35** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Асабісты інтэрас».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Даспехі бога 2: Аперацыя Кондар». Ганконг, 1991 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.35** Экспедыцыя.
**12.05** Бітва экстрасэнсаў.
**13.10** Кінааповесць «Пайсці і не вярнуцца».
**14.35** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Жывы гук.
**15.30** Прыгодніцкі серыял «Чалавек вайны» (Расія).
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Маналогі аб вайне.
**21.20** Калыханка.
**21.40** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.15** Час футболу.
**22.45** Культасвет.
**23.10** Гістарычная драма «Спадар Макс» (Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Дзеці вайны. Апошнія сведкі». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.20** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны-Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**15.15** Тэлесерыял «Калі растаў снег». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны-Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны-Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Калі растаў снег». Расія, 2009 г.
**22.20** Прэм'ера - 2010. Тэлесерыял «Панадворак».
**22.55** Прэм'ера. «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.50** Навіны-Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Вызваліцелі». «»Флот». Дакументальны фільм.
**01.10** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** Праект «У пошуках Францыі».
**09.15** «Жаночы погляд».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Іх норавы».
**10.55** «Дачны адказ».
**11.55** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Ваенна-гістарычная драма «Неба ў агні».
**21.35** Вострасюжэтны серыял «Ментоўскія войны».
**23.25** Сёння.
**23.45** Вострасюжэтны серыял «Афганская здань».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Спа-Франкашам (Бельгія). Агляд.
**10.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**10.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**12.00** Веласпорт. Тур Фландрыі. Бельгія.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). 1/8 фіналу.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). 1/4 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**20.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Прэзентацыя каманд.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Часопіс.
**00.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**00.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.30** Боўлінг. PBA. ЗША. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** «Рай Олі Гопнудла», маст. фільм, 1989 г., ЗША.
**19.05** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**19.25** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** МакраФон: «Рок-карона–2009», выбранае: ч. 2.
**20.40** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Форум (ток-шоў): «Беларускія альфонсы: адкуль яны?»
**22.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял.
**22.50** Рэпартэр.
**23.20** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №4 (42)
(красавік)
www.litbel.org www.novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

**Анонс**

«ФОРУМ»: жыццяроздумы Уладзіміра МАРОЗА аб беларускім правінцыялізме ... 2
«ЭСЭ»: сонечна-матыльковыя развагі Валерыі КУСТАВАЙ пра Уладзіміра ЖЫЛКУ ... 3
«ПАЭЗІЯ»: «Марскі вузел» Зміцера ВІШНЁВА ... 4
«ПРОЗА»: «інаўгурацыйнае» апавяданне Міхася АНДРАСЮКА ... 5
«ПЕРАКЛАД»: мініяцюра Збігнева-Влодзімежа ФРОНЧАКА «Як Бусел вучыў Зайца лётаць» ... 6
«КАЛЕЙДАСКОП»: рэцэнзія Асі ПАПЛАЎСКАЙ і «Код праўды» Алега АБЛАЖЭЯ ... 7
«ГУТАРКА»: Уладзімір СОДАЛЬ — пра Францішка БАГУШЭВІЧА ... 8

ЮБІЛЕЙ

## ВЯРТАННЕ ДАДОМУ, АДКУЛЬ НІКОЛІ І НЕ СЫХОДЗІЎ

**Валеры РАМАНКЕВІЧ**

Дзесьці там на ўскрайку неба, над чорным шчарбатым лесам вісела ўсім знаёмая, але ад гэтага не менш таямнічая поўня. Спрадвечнае жыццё кацілася пад гэтым лупаватым нябесным вокам як тое кола «Сансары». Дробненькія зорачкі, як мізэрныя дзіркі ў чорным радне, слязліва імглелі, і не было ім ніякага клопату аб тым, што робіцца ўнізе, як і чым жывуць там людзі. Магчыма, неба, якое паэты называюць “тварам бога”, нават і не ведае пра людзей, яно нас не заўважае, як і мы не заўважаем мураўёў ці якіх-небудзь яшчэ больш дробных істот. Неба з тварам далёкага і жорсткага Бога жыве сваім жыццём, а насельніцтва Зямлі, якое і засяліла гэтае самае неба Багамі, «Касіяпеямі», «Скарпіёнамі» і ўсялякімі «Мядзведзіцамі» жыве па-свойму, як умее. Сярод людскога разнамоўя, якраз пасяродку Еўропы, жыў і жыве мой народ. Пералескі, рачулкі, азёркі, вёскі ды невялічкія мястэчкі, можа, якая жменя больш-менш вялікіх гарадоў, спаскуджаныя меліярацыяй балаты — вось і ўся нашая зямля, старажытная і сівая, якая ўсё аніяк не прыладкавалася жыць сваім розумам. Зірнеш у родную гісторыю як у студню — і нічога, толькі рэха, ды плёскаецца ў цёмнай вадзіцы нейкі сучасны адбітак. Дык хто ж мы і адкуль? Колькі разоў гучала гэтае пытанне ў навоколлі і колькі разоў адзін той жа народ адказваў на яго па-рознаму. Кім мы толькі не былі, пакуль не зрабіліся беларусамі: і крывічамі, і радзімічамі, і сарматамі, і рускімі, і ліцвінамі, і палякамі, і паспалітамі, і ўніятамі, і жыхарамі Заходняга краю, і часткай савецкага народу, і бульбашамі, і нават тутэйшымі. Вось так, і няма ў гэтым ніякага гістарычнага сораму, бо ўсе сучасныя народы сталі самі сабой толькі ў васемнаццатым-дзевятнаццатым стагоддзях. Нікому ж сёння не прыйдзе ў галаву італьянцаў называць рымлянамі, ці расіян — маскавітамі, ці ўкраінцаў — русінамі, але калісьці жыхароў тых мясцін так і звалі; прыкладна так і мы — беларусы — выйшлі з прадвечнай цемры ў сучасны свет. Так, мы былі ўсім тым, аб чым гаварылася вышэй, былі, бо такі наш гістарычны шлях. І хвала Магутнаму Богу, што сталася як сталася і ў нас ёсць сёння незалежная дзяржава, ёсць родная мова, свая будучыня і свае геніюшы.



Анатоль Змітравіч Крывенка. «Васіль Быкаў і Барыс Кіт у Франкфурце». 2004

Нялёгкі наш лёс, але ж ён наш і іншага ўжо не будзе. Як не будзе другога Барыса Кіта, да стагоддзя якога мы з вамі падышлі. На жаль, людзі жывуць нядоўгай памяццю. Каго мы памятаем? Ну бацькоў, так сяк бабулю з дзядулем, і ўсё — далей цемра і загубленыя дзесьці могілкі продкаў, парослыя быллём нашай абыякавасці. Што зробіш, але такой жа памяццю жыве і дзяржава, і выцягваючы з глыбіняў гісторыі вядро мінулага, яна бачыць у вадзе толькі сваё аблічча. Але мне здаецца, што пройдзе і гэта, і надыдзе той час, калі імёны вялікіх сыноў нашай краіны будуць вядомыя і ўшанаваныя на Радзіме.

Барыс Уладзіміравіч Кіт, выдатны навуковец, адзін з тых, хто вынайшаў паліва, на якім чалавецтва ўпершыню даляцела да свайго бліжэйшага суседа — Месяца. Той самай поўні, якая так прыгожа красуецца на ўскрайку роднага спазору. Але ж я скажу некалькі слоў не пра навукоўца і спадара прафесара, можа, праз тое, што ні халеры не разумею ў касмічнай навуцы, а пра паліва ведаю толькі адно: што яно выпадкова заканчваецца ў маім самаходзе і становіцца год ад года ўсё даражэй. Я распавяду аб сталым, прыгожым чалавеку, з якім сустрэўся ў Франкфурце гадоў з сем таму. Барыс Кіт увайшоў у мой лёс праз Васіля Быкава. У кожнага чалавека ёсць у жыцці свае павадыры, якія нябачна накіроўваюць цябе ці ў той, ці ў іншы бок. Адным з такіх павадыроў у мяне быў і застаецца дзядзька Васіль — бясконцы космас якога ўвабраў у сябе і боль, і сорам, і сумленне нашай сучаснасці ды і ўсяго дваццатага стагоддзя. Я збіраўся ў Нямеччыну на кніжную выставу, і Ірына Міхайлаўна Быкава (жонка Васіля Уладзіміравіча) параіла спаткацца там са спадаром Барысам. «Ой, яму будзе вельмі прыемна! — матнула рукамі на маё «а ці зручна… у такім узросце…», — Вы нават не ведаеце, як ён там чакае ўсялякай весткі адсюль, чакае беларушчыны…»

Вось так у маё жыццё і ўвайшоў Барыс Уладзіміравіч, рухавы, зіхоткі чалавек — гонар і боль свайго часу. Мы хадзілі з ім па брукаваных, вузенькіх вулічках старажытнага места, заходзілі ў храмы, кавярні, пілі самае смачнае ў свеце піва. Ён паціху смактаў чорны як аксаміт «Гінас», я сапраўдны «Паўлайнер», і размаўлялі. Не, я больш слухаў, а ён казаў. Цудоўная, нібы крышталёвая і глыбокая беларуская мова, крыху прыглушаная доўгімі гадамі выгнання, прыгожа гучала пад склепавымі столямі. Чаму я ўсё гэта тады не пісаў на дыктафон, не ведаю. Ён памятаў усё: імёны і прозвішчы першых настаўнікаў, сяброў, польскіх, савецкіх і германскіх следчых; час, калі штосьці адбылося ці здарылася. Калі ён пра нешта распавядаў, здавалася, што я не толькі гэтае бачу, але і адчуваю пах палыну, скрып пяску на зубах, чую нейкія гукі. Тое самае адбывалася са мной толькі аднойчы, калі Леў Мікалаевіч Гумілёў расказваў аб тым, як Пейсах Вялікі захапіў і выразаў увесь Кіеў. Калі піва станавілася занадта, у нашую гутарку вельмі павольна і стройна ўплываў голас спадарыні Тамары, і тады я бачыў, што такое прыгажосць, якую не здолее зруйнаваць ні сталы век, ні цяжкі лёс выгнанца. Яны сціпла развіталіся і ехалі да хаты, нават не… Яна праводзіла свайго каханага да ягонага жытла і рушыла да сваёй кватэры. Бо двум каханням вельмі цесна ў адным пакоі. Пакуль яны ішлі да дзвярэй, турыстычны грай паціху змаўкаў, усе позіркі як прыліплі да гэтай пары: яму тады было амаль дзевяноста пяць, ёй — шэсцьдзесят чатыры, а сустрэліся яны і ідуць разам па жыцці ўжо амаль трыццаць пяць гадоў. Вось так.

Пра стары Франкфурт Кіт распавядаў вельмі цікава, абавязкова падкрэсліваючы нейкія выпадкі і справы, якія тут калісьці адбыліся ці мелі нейкую сувязь і датычыліся беларусаў. Так умелі распавядаць пра Парыж старыя расейскія эмігранты. Мяне цікавілі мясціны, у якіх быў Васіль Быкаў. Ужо потым у Маскве я чытаў цудоўную кнігу Васіля Уладзіміравіча пра жыццё і сустрэчы з Кітом. Ім вельмі пашанцавала, што яны сустрэліся на гэтай зямлі, абодва на чужбіне і абодва геніі. Тыдзень, цэлы тыдзень адвёў лёс на нашую сустрэчу. З'ехаўшы на два дні ў Мюнхен, я ўжо сумаваў і дакараў сябе, і цягнуўся назад да гэтага чалавека. Шмат Барыс Уладзіміравіч распавядаў пра свайго сына, які, як і бацька, стаў знакамітым навукоўцам, і яго імя гучала ў навуковых колах. Лепшымі помнікамі нашых зямных спраў з'яўляюцца нашыя дзеці, гэта нейкі крок у несмяротнасць, нават калі дзеці паміраюць раней бацькоў…

Дзякуй Богу, што тое нашае спатканне працягваецца і дагэтуль. Я атрымліваю лісты і тэлефаную вечнаму беларусу.

Навуковая спадчына Барыса Кіта і ягонага сына Уладзіміра вядомая ў свеце, але Барыс Уладзіміравіч пакінуў свой след не толькі ў небе і на Месяцы, ёсць і яшчэ адзін зорны шлях гэтага вялікага чалавека, шлях зямны, шлях беларускі. І пачынаецца ён з настаўніцтва і настаўніцкіх школ, ім заснаваных, з усё той жа беларускай справы. З гэтага, прынамсі, пачыналі амаль усе нашыя нацыянальныя геніюшы, да якой бы галіны-дзейнасці яны не належылі. І самым вялікім ушанаваннем нашаму славутаму земляку сёння будзе не толькі музей у ягоным родным Навагрудку, не толькі ўшанавальныя дошкі, самаробныя помнікі і дзяржаўныя ўзнагароды — галоўным будзе беларуская мова, якую ён нёс людзям і пры пальшчызне, і пры савеччыне, і пры фашыстах, — мова, за выкладанне якой яго кідалі ў турмы, судзілі на смерць, чаплялі шыльду здрадніка і гналі з Радзімы.

Мова, якой ён, у адрозненне ад многіх з нас, размаўляе і цяпер, бо толькі на гэтай мове мы будзем размаўляць з Госпадам, калі прыйдзе наш час.

Я рады, што спадар Кіт вяртаецца дадому.

ШЛЯХІ


Фота У. Клімовіча.

# ПРАВІНЦЫЯЛІЗМ

Уладзімір МАРОЗ

**Жыццё не стаіць на месцы. Час асэнсоўваць ужо не «незалежнасць — гэта…», а, да прыкладу, «правінцыялізм — гэта…». Хоць, на жаль, і першае не згубіла сваёй надзённасці дасёння. Аднак углыб і шырэй. Спазнаючы шматгранна сябе, урэшце лепш зразумееш і Беларусь.**

Правінцыялізм — гэта адсутнасць прагі пазнання новых краёў. Як нішто, падарожжы дапамагаюць убачыць свет і сябе ў ім, прыўзняцца над зямлёю. Гавораць: пашукай спачатку ў сябе, у другіх заўсёды знойдзеш. Вось і тут будзе справядлівым пачаць з сябе. Мне якраз здаецца, што комплексам правінцыялізму я не пакутую. Іншыя ёсць, як творчаму чалавеку без комплексаў? Але гэтага, быццам, няма. І думаеш, разважаеш, як сталася так, як змог пазбыцца. Ці гэта атрымалася арганічна, без псіхалагічнай напругі? Ці цябе такім комплексам увогуле Бог мілаваў? А калі не мілаваў, то выбіваўся ён перагрукам колаў цягнікоў, што праляталі літаральна за сто метраў ад школы, у будынку якой мы жылі ў Даманаве. Сапраўды — школа, вуліца і рампа. А там ужо сталёвыя каляіны, стыкі рэек, якія пры сутыкненні з коламі і даюць адмысловы грук. Вярэдзіў ён дзіцячую, хлапечую, падлеткавую душу, пяяў аб далёкіх нязнаных мясцінах. Ляцелі цягнікі. З захаду на ўсход, з усходу на захад…

Адна паездка ў Брэст запомнілася асабліва. Трапіў на фільм «Мужчына і жанчына». Як ён хараша зніташаўся з падлеткавымі летуценнямі аб каханні! У сваёй вёсцы карціну аніяк не змог бы убачыць. Цікавы выпадак быў на вакзале, калі вярталіся дадому. Наш малады настаўнік хіміі заўважыў: вось дзяўчынкі стаяць, гандлююць. Сапраўды, некалькі дзяўчат стаялі быццам у чаканні. Толькі не цягніка. Але ж ніякага тавару ў іх не было. «Чым яны гандлююць?» — хацеў усё ж я зразумець. Пытанне выклікала агульны рогат. Так адбылося маё візуальнае знаёмства са з'явай, якой пры саветах афіцыйна не было. Анягож, Брэст — горад пагранічны.

Шырыўся свет у інстытуцкія гады. І сёння ў студэнтаў ёсць магчымасць вандроваць, але дзе грошы? Тады аб гэтым клапацілася дзяржава. Вільня (як замежжа і зусім без беларускага для мяне кантэксту), Піцер, Талінн (яшчэ большае замежжа) — усе практыкі за дзяржаўны кошт. Будатрад у Казахстане і вялікая праектная практыка ў Маскве. Па выхадных (а іх было як для студэнтаў-практыкантаў ажно тры на тыдзень), аб'ездзілі амаль усё Залатое Кола. Адна царкаўка Пакрова на Нэрлі, што незямной свечачкай гарэла на мурожным беразе ракі, чаго вартая!

Жылі з намі і шэдэўры сусветнай архітэктуры, якіх і дасёння не ўдалося згледзець на свае вочы. Ле Карбюзье, Міс Ван дэр Роэ, Фрэнк Ллойд Райт, Алвар Аалта — імёны грандаў сусветнай архітэктуры дваццатага стагоддзя жылі неад'емна ад іх выбітных твораў. Дамок над вадаспадам, капэла ў Раншане, праекты футурыстаў… Няхай з падручнікаў, часопісаў ды альбомаў, але яны існавалі для нас як рэальнасць.

На праектнай рабоце пасля інстытута з вандроўкамі было аніяк. Але і тут жыццё дало выйсце: ужо праз два гады пасля вучобы я паступіў завочна ў Літаратурны інстытут. Шэсць гадоў двухразовых паездак на сесіі ў вялікую сталіцу, Масква стала практычна роднай. У Літінстытуце мы не былі адзіным савецкім народам, кожны быў сам сабою: беларус, украінец, рускі, латышка, армянка, азербайджанец, казах, якут, кабардзінец…

Новая адукацыя непазбежна несла перамены ў жыцці. З «Мінскпраекта» мяне звольнілі па «скарачэнні штатаў». Лёс выкіраваў на вуліцу кіно, ды адразу ў міністэрства, якое тады называлася Дзяржкіно БССР. Пачалося грунтоўнае «асвойтанне» Беларусі. У службовых паездках помнікі, якія былі вядомыя па курсе гісторыі беларускага дойлідства, станавіліся яваю, назаўсёды ўваходзілі ў свядомасць і душу. Полацк, Мсціслаў, Дзятлава, Гродна, Тураў, Давыд-Гарадок, Пінск… Прабіўся і заходні накірунак — трапіў на кінафестываль «Экафільм» у Чэхаславаччыну, пасля ў кінематаграфічна-турыстычную вандроўку ў ФРГ.

А колькі аб'ездзана, калі перайшоў на кінастудыю, на студыю дакументальнага кіно «Летапіс»! Веліч гісторыі і культуры Беларусі паўстала наяве. І няхай за сведчаннямі гэтай велічы трэ' было ехаць яшчэ і ў Вільню, Кракаў, Варшаву, Прагу, Санкт-Пецярбург, але гэта станавілася ўжо неад'емна тваім. Стала роднаю Вільня. Абхадзілі, абздымалі мы яе з усіх бакоў, як толькі маглі. Я трымаў у руках самую старадаўнюю беларускую кнігу — Тураўскае Евангелле. Не перадаць уражанне, якое пакінула сховішча ў Літоўскім гістарычным архіве, дзе захоўваецца Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Сотні пісаных рукою тамоў на паліцах. Пісаных нашаю моваю, пісаных аб нашай гісторыі! Адно што чытаем мы гэтую гісторыю вельмі марудна…

Не хачу сказаць, што вандроўкі ёсць надзейнай гарантыяй ад правінцыялізму: тут ужо як каму. Галоўнае, якія высновы ты робіш з усяго гэтага, як глядзіш на свет. Для мяне пашырэнне абсягу было і прафесійным ростам, і шляхам беларускага самапазнання, і спасціжэннем еднасці і адметнасці людской кулі. Нідзе няма свята жыцця, хіба што для турыстаў. Так што не варта захапляцца, кленчыць: вось у іх там! У кожнага свае праблемы, незалежна ад матэрыяльнага ўзроўню быцця. І не трэба вырашаць глабальныя праблемы, як убілася ў нас яшчэ за савецкім часам (кшталту: Гандурас турбуе, Куба — любоў мая, янкі — з Іраку і да таго падобнае). Варта ўяўляць сусветную хаду гісторыі, культуры (сапраўды, не на выспе жывём), але найперш вырашаць праблемы свае: гартаваць дух, працаваць на карысць Бацькаўшчыны, мацаваць сваю дзяржаву. Ніхто за нас саміх гэта не зробіць. Свая ніва не ўзараная, не дагледжаная як мае быць.

З папярэдняга вынікае і наступная тэза: правінцыялізм — гэта антысемізм, русафобія ды іншыя ксенафобіі. Як ні парадаксальна, падагрэваюць фобіі якраз свае. Заўважце, хто піша аб тым жа жыдамасонстве? І толькі невялікая частка з гэтай сябрыны сапраўдных славянафілаў, якія ўцягваюцца і жывуць у барацьбе. На што траціцца іх энергія? Замест таго, каб рабіць сваё. Хораша сказаў Чэрчыль: англічане не антысеміты, бо не лічаць сябе дурнейшымі за яўрэяў. Шукаць ворагаў — яскравая праява правінцыялізму. Знайсці іх прасцей за ўсё: яўрэі, расійцы, палякі, летувісы, асобы каўказскай нацыянальнасці, арабы, амерыканцы, увогуле сусветны імперыялізм — хто яшчэ падкопвае і квапіцца на нашую Беларусь? Зразумела, вонкавыя абставіны ўплываюць, дарэшты іх адкідваць нельга, але найперш, здаецца, справа ў нас саміх: калі мы напоўніцу пачуемся народам і будзем жыць вольна і годна ў сваёй краіне. Як не падабаецца нашым «добразычліўцам», калі мы жывём сваімі клопатамі, дбаем аб мове, дзяржаве. «Нацыяналізм!» — крычаць яны. Няхай крычаць, мы ж ведаем, што гэта проста любоў да Айчыны і жаданне ёй шчасця. Каго-каго, а беларусаў няпроста вінаваціць у агрэсіўнасці, уся гісторыя наша — таму сведчанне. Але і талерантнасць беларуская таксама не падабаецца: ціха, ціха, але ж робяць сваё. І будзем рабіць.

Правінцыялізм — гэта месіянскія пазывы. Мне не трэба міфічнай славянскай еднасці, няма настальгіі па былой савецкай імперыі, пабудаванай на хлусні і непавазе да чалавека. Мне дастатковa сваёй Беларусі, дзе я хачу жыць годна, вольна і заможна. Жыць з павагаю да суседзяў — і славянаў, і неславянаў. Адпаведна, гэтага ж чакаю і ад іх. Дарэчы, калі гавораць аб славянскім адзінстве, мяне заўсёды здзіўляе, а дзе ж, да прыкладу, палякі, чэхі? Няўжо ёсць славяне іншага гатунку? Я не магу лічыць адных сваімі, а другіх — не. Не хачу быць правінцыялам. Не хачу жыць у вечным змаганні. А хачу жыць у любові. Бо такі запавет даў нам Гасподзь, і вышэй за гэта нічога ў свеце няма. Вораг жа найперш — у самім чалавеку. Грашыць так проста, а вось пакаяцца — для гэтага трэба моца духу.

Тэма ворага цягнецца ў наступную тэзу: правінцыялізм — гэта раз'яднанасць. Тут вядзецца ўжо аб нашых унутраных справах, дзіўным беларускім жыцці. Ніяк не магу даўмецца, чаму нам увесь час карціць падзяліцца на сваіх і не сваіх? Быццам невялікую ўтульную Беларусь можна разарваць на кавалкі — гэта маё, а гэта тваё? Што тут дзяліць? Кожнаму ёсць свая дзялянка, каб працаваць на росквіт Бацькаўшчыны. Хіба бывае любоў да Айчыны правільная ці няправільная?

Зайдрасць як адно з самых непрыгожых праяў правінцыялізму — перадумова той жа раз'яднанасці. Гэта як з хатай у суседа. Ды не сядзі ты і не зводзь сябе, а пабудуй лепшую! Але комплекс трымае. Напісаў пісьменнік добры твор — не радуемся, зайздросцім. Маўчаннем абыходзім, заміж таго, каб сказаць шчырае слова. Тое ж самае і з кнігамі — а як яму ўдалося? Парупся — і табе ўдасца, калі ёсць што выдаваць, калі ёсць што сказаць людзям пра дабро і зло. Гасподзь дасць, калі грукацца. А калі няма чаго выдаваць, то вінаваты ў гэтым найперш ты сам, а не твой калега. Часопіс выдаюць хлопцы. Зноў жа свярбіць: манаполію парушаць. А таго ж не зразумець, што для нармальнага літаратурнага працэсу ў Мінску трэба дзесяць часопісаў, а не чатыры-пяць. Ды яшчэ хоць бы адзін у абласных гарадах. Вось куды трэба скіроўваць сваю энергію, а не на разбуральную раз'яднанасць і зайдрасць. Сімпатычны табе чалавек ці не вельмі, але калі ён зрабіў свой кавалак беларускай справы — гэта трэба вітаць. І падтрымліваць адзін другога. Структурна — у тым ліку. Слаба чуваць старога Саюза пісьменнікаў, амаль нічога ён для літаратараў ужо не можа зрабіць. Але і ў такім стане хоць нешта льга ўсё-такі. Да прыкладу, чаму адышлі ў нябыт літаратурныя прэміі Саюза? Няхай бы яе грашовы эквівалент складаў усяго адзін даляр, але фактам лаўрэацтва Саюз і сёння мог бы падтрымліваць пісьменнікаў за іх лепшыя творы, кнігі. Ніхто не адбірае магчымасці стварыць іншую літарацкую арганізацыю, тую ж Акадэмію літаратуры ці касу ўзаемадапамогі, сваімі складкамі, унёскамі дапамагаць выдаць кнігу ці заснаваць яшчэ адзін часопіс. Выйсце заўсёды ёсць. Бо сёння спадзявацца на адну дзяржаву — таксама праява правінцыялізму. Усё ў нашых руках і галовах. Хоць, дзеля аб'ектыўнасці, дзяржава ў цяперашній сітуацыі павінна падтрымліваць літаратуру. Што яна, прынамсі, па сваіх магчымасцях і робіць, але выбрана, па сваім правінцыйным разуменні, дзелячы на сваіх і чужых.

Найбольш складаная тэма — правінцыялізм у нашай беларускай літаратуры. Патрабуе яна асобнай вялікай гаворкі, тут прыватныя меркаванні. Правінцыйна мецъ комплекс непаўнавартасці, лічыць сваю літаратуру правінцыйнаю. Наша літаратура не горшая за іншыя, яе лепшымі здабыткамі і ў прозе, і ў паэзіі, і ў эсэістыцы мы можам справядліва ганарыцца. Але акурат лепшымі. Бо ў цэлым усё ж пра налёт правінцыйнасці гаварыць выпадае. І прычыны тут зразумелыя, літаратуру трымалі ў ідэалагічных рамках, ды і цяпер у нас гэта ў нейкай ступені законсервавалася, як і шмат што іншае з былых часоў. Але ж і другая крайнасць таксама патыхае правінцыялізмам. Творца павінен быць вышэй штохвілінных патрэбаў (гэта дзялянка публіцыстыкі), павінен тварыць у згодзе толькі са сваім сумленнем. І тут шлях пазбаўлення правінцыялізму (каму гэта патрэбна) у кожнага свой. Не вельмі прадуктыўнае здаецца захапленне звыш меры замежнымі ўзорамі. Можна скапіяваць форму, можна размыць паэзію псеўдаглыбіннай версіфікацыяй (затое сучасна глядзіцца!), але гэта не той шлях. Ці псеўданавуковы заблытаны стыль, тэксты ў якім іх аўтарам здаюцца вышэйшай філасофскай думкі — паглядзіце, які я разумны, адукаваны, начытаны. Але колькі не пішы слова «дыскурс», за ім той жа правінцыялізм не схаваеш.

Будаваць трэба сваё, адштурхоўвацца ад сваіх традыцый, што скла́ліся гістарычна. Не варта разбураць, адкідаць напрацаванае папярэднікамі. Толькі сваім мы будзем цікавымі свету. Сваім, але не правінцыйным, зробленым на невысокім прафесійным узроўні. Трэба ісці наперад, углыбіню, а не ў шырыню. Патрэбна ўзвышэнне духу, палёт думкі, фантазіі. Усе самыя драматычныя і вечныя сюжэты ёсць і ў нас — і ў гісторыі, і ў сучаснасці. Асэнсаваць іх, напісаць твор высокага літаратурнага і філасофскага гарту — вось звышзадача. І праблема.

▸ **ПОВЯЗЬ**

# VIVERE MEMENTO!
## (ПАМЯТАЙ ПРА ЖЫЦЦЁ!)

**Валерыя КУСТАВА**

**Свету не стае святла. Уладзімір Жылка (1900–1933) менавіта з тых паэтаў, якія святло памнажаюць. Святло і хараство.**

Жылка адзіны, апроч Максіма Багдановіча, беларускі паэт, у якога можна закахацца на адлегласці ў стагоддзе, на адлегласці ў жыццё. Цудоўны, узнёслы, юны, далёкі і адначасна такі трапяткі, такі родны, такі блізкі. У яго паэзіі «узносіць нас туга да хараства».

Паэт на працягу ўсяго свайго паэтычнага шляху, шляху пошукаў непадробнага хараства ў свеце людзей і свеце слоў не перастае паўтараць:

*І вось ужо ў дзеях, і чынах,*
*І справах будзённых, людскіх*
*Я ўзрушаным сэрцам няўпынна*
*Шукаць хараства не прыціх.*

(«Цяжэй ланцугоў».)

Не прыгажосці, не вабнаты шукае Жылка, а менавіта — якое беларускае слова! — хараством ён сніць наяве і трызніць у сне. Яго паэзія далікатная і вытанчаная. Паэзія Жылкі — гэта палітра паўтаноў слоў і пачуццяў, нязмушана і таленавіта карыстацца якой з'яўляецца найвышэйшым мастацкім і паэтычным уменнем. Нават кантрасты ў паэзіі Уладзіміра Жылкі выяўлены нязвыкла, і гучаць яны не як любоў — боль, а як самота — туга, туга — хараство. Іерархія пачуццяў уражвае сваёй тонкай няўлоўнасцю, ад чаго вершы толькі набываюць у сваіх вартасцях, бо здольныя выказаць самыя незаўважныя, але ад таго не менш значныя рухі чалавечай душы.

Лёгкі і празрысты, што матыль, паэт апантана ляціць на святло, на святло жыцця, на святло паэзіі, на святло праўды паэзіі і праўды жыцця, каб згарэць на ім дарэшты. І самі вершы для яго — што тыя матылі, якіх так няпроста злавіць, але якія з даверлівай ахвотай падаюцца на зніч, які мусіць паліць у душы існага паэта, каб радкі-матылі зляталіся на яго ззянне:

*А цяпер, калі шукаю*
*Праўды, шчасця для людцоў,*
*Ці не тое ж дзіцяня я,*
*Што лавіла матылёў?*

(«Матылі».)

Паэт — дзівавокае дзіця, здзіўленае светам, якое «з дзяцінства фіялкавых раніц // з юнацтва лілейнага дзён» бяжыць па лугах, мурагах душы, вышукваючы на яе бязмежных абсягах лятункі-словы — маленькіх матылёў натхнення. І тыя, у якіх атрымліваецца знайсці самых яркіх, самых трапяткіх, і робіцца сапраўднымі паэтамі.

Матылі — той надзвычайны вобраз для беларускай паэзіі, якую ўвасабляў Жылка. Матылі — невымоўна паветраныя стварэнні, якім немінуча наканавана памерці, як толькі яны апынуцца ля мэты. У іх цудоўнасці




**Новая кніга «Матылі» з паэтычнай спадчынай Уладзіміра Жылкі.**

апрыёры закладзеная драма. У іх трагічна з'яднаныя імгненні шчасця і канца. Матылі — адначасна і самі паэты, якія згараюць, апаленыя сваёй паэзіяй, і іх паэзія, што пульсуе святлом. Бо ёсць праўда ў слове, і ёсць у ім сіла, якая не дае апрэчнасць таго, што бываюць «цяжэй ланцугоў летуценні». А для паэтаў і пагатоў.

Ці не ад лятальнага адчування немінучага скону гэткая «матыльковасць» у радках юнага паэта? Як і Багдановіч, Жылка быў хворы на сухоты — хваробу паэтаў і інтэлігентаў:

*У змаганні дзікім змогся ты*
*І выпляваў дарэшты грудзі.*
*Надзей няма ў цябе й не будзе,*
*І ў сэрцы холад пустаты.*

(«Хвораму».)

Ці не ёсць часткова прычынай хваробы паэта яго ўразлівая, ранімая, неабароненая душа, раскрытая, разгорнутая, распоратая ў празе ды чаканні болю і любові да ўсяго свету, да ўсіх людзей.

Жылка, ведаючы, што зямны век яго мусіць быць нядоўгім, паэтызаваў, апяваў смерць, удымаючыся такім чынам над самой смерцю і тым самым змагаючы яе духоўна. Як на апошнім дыханні, ён нагаворваў, выкрыкваў, прамаўляў свае вершы перад тым, як яму зойме мову назаўжды. Смяротна хворы як чалавек, ён быў непераможны і нязломны ў сваёй паэзіі:

*Як тастаменту новага Бог,*
*Сваёй смерцю ён смерць перамог.*
*………………………………*
*Як праб'е немінучага чвэрць,*
*Ах, якая прыгожая смерць.*

(«Як тастаменту новага Бог…».)

У Жылкавай творчасці цудоўным чынам спалучаюцца палярныя пазіцыі, на тэматычна-эстэтычным узроўні гэта жыццё–смерць:

*То боль жыцця,*
*то лёгкасць смерці сніцца…*

(«Каханне».)

На прасторава-ідэнтыфікацыйным узроўні сусвет нацыянальнай паэзіі ў Жылкі судакранаецца з космасам сусветнай літаратуры, а часам і натуральным чынам зліваецца, уваходзіць у яго.

Уладзімір Жылка быў ці не самым еўрапейскім з усіх беларускіх паэтаў пачатку XX стагоддзя. Добра абазнаны ў творчасці замежных аўтараў, ён не толькі засвойваў здабыткі еўрапейскай літаратуры, але й лучыў досвед сваіх замежных калегаў-папярэднікаў з уласна нацыянальнай традыцыяй. Неаднаразова ён звяртаўся да перакладаў знаных іншаземных аўтараў (Г. Ібсена, А. Міцкевіча і інш.), у тым ліку да французскага паэта Шарля Бадлера, які быў блізкі яму ў сваім нязменным звароце да матываў няўмольнага кону ды тугі. Але між тым паэтам валодаў запавет сэрца: «Будзь агністым!», прамоўлены яму ці не самім Сонцам жыцця.

Жылка прыслухоўваецца да прыроды, імкнецца з ёй зліцца, лічыць прыроду, як і чалавечую душу, за «самотны храм Хараства», дзе самота вар'іруе спектры сваёй афарбоўкі ад светлага суму да тугі, ад сусветнай тугі да беларускага светлага суму.

Калі не браць пад увагу «ваяцкую» паэзію Жылкі, пра падставы і наступствы якой цудоўна напісана ў прадмове да «Выбраных твораў» паэта («Беларускі кнігазбор», Мінск, 1998), варта звярнуць увагу перадусім на той факт, што самому Жылку карцела «выдаць кніжку, не больш 30—50 вершаў, выключна з матывамі кахання, смерці, хараства, прыроды [...] без адзінае рыфмы на «бедная старонка» і «гэй, наперад»» (ліст да Антона Луцкевіча). І не дзіўна, што паэт імкнецца «кахаць зямлю з яе жыццём глухім», бо дзе, калі не тут, магчыма адчуць асалоду зямной любові, нязменна ўватканую ў апечаную душу, якая не страціла ўменне кахаць, якая толькі ўмацавалася ў гэтым уменні пасля чарговых апёкаў. Для паэта існуе толькі тое жыццё, дзе хараство пачуцця ўспрымаецца за абсалют:

*Каханню нічога не трэба,*
*Каханне нічога не просе, —*
*Так радуе сіняе неба,*
*Так цешыць валошка ў калоссі…*

(«Каханню нічога не трэба…».)

Жылка цудоўна ведаў, што той, хто здольны кахаць і любіць напоўніцу ў зямным жыцці, прымаючы пачуцці ва ўсёй іх палярнасці, ва ўсім іх гарманічным кантрасце, толькі той па-сапраўднаму несмяротны. А як яшчэ выратавацца смяротна хвораму паэту, як не праз любоў і паэзію? Як яшчэ застацца тут і на вячніны вячнін. Толькі любячы… Радзіму. Толькі кахаючы… дзяўчыну. Толькі жывучы… жыццём. Толькі спраўджваючыся… паэзіяй.

За паэтычнае крэда Жылкі можна ўзяць яго радкі: «Няма збавення апроч пекнаты». Пекната для яго паўстае не толькі ў вобразе адзінай каханай дзяўчыны, але і ў вобразе Радзімы, таксама адзінай, далёкай і ад таго яшчэ больш блізкай. Жылка звяртаецца да яе — каханай, да яе — Радзімы, да іх разам, што надаюць паэту адвагу ў «баі жыццёвым»:

*Пакліч павеўна*
*І радасць разлі,*
*Дазволь мне пэўна*
*Ступаць па зямлі.*

(«Няма збавення…».)

Менавіта каханне і любоў кіруюць паэтам, трымаюць яго на зямлі, даюць сілы змагацца (з хваробай, ворагамі, чужынаю) і не пакідаць. Не пакідаць ні сябе, ні сваіх пераканання, ні сваёй паэзіі…

Вочы Радзімы. І вочы дзяўчыны, у якіх адлюстроўваецца Радзіма, настолькі прыўкрасныя, настолькі родныя — яны не пазіраюць, яны зацвітаюць пасярод мітусні, паўсядзённасці, і расквечваюць свет наўкола, і надаюць жыццю сэнс: «Зацвілі твае вочы між тлуму…»

Гледзячы ў іх, ад замілавання ды мілаты «перарываюцца ніткаю думы».

Менавіта пекната, хараство — тыя вызначальныя паняцці, якіх трымаецца паэт, тая аснова, адкуль жывіцца крыніца Жылкавай паэзіі. Ды хараство ў яго не сэрбразвоннае, не пустое, немінуча-імгненнае, найчасцей яно паўстае не ў светлых фарбах радасці, а споўненае тугі, у яго вершах «трагічнае схавана хараство».

Спакутавана-ўзнёслай душы паэта няма палёгкі бестурботнасці:

*Душа мая тужлівая –*
*Лілея між балот.*
*Яна ўзрасла, маўклівая,*
*Між багны сонных вод.*

(«Душа мая тужлівая…».)

Перадусім у сваёй самоце, сваёй самотаю Жылка і быў беларусам, і быў паэтам. Самота для яго была не духоўным выгнаннем, а той залатою чашаю, з якой штодня сілкаваў паэт сваё натхненне. Самотаю ён пакутаваў і самоту ж аберагаў, асланяў як іскі стан сапраўднага паэта, паэта-беларуса: «Не трывож мае самоты…»

Самота — вопратка душы творцы. Без самоты няма самавыяўлення. Няма роздуму і няма праўды, якія прыходзяць выключна на самоце, праз самоту.

На самоце можна сабе дазволіць быць сабою. Такім, як ёсць. Не іншым. Не двудушнічаць, не падстройвацца пад быццё, не весці палітычныя альбо палітычныя гульні.

Паэт трымае адказ за свае словы выключна перад сабой і Богам, якія самы вялікі паэт хараства, самы вялікі паэт самоты, самы вялікі паэт радасці і жалю.

А калі закрадуцца ў душу сумневы на ўласных думах ды дзеях, то завітае да паэта пазасветавы злодзей, і застрашыць, і запалохае, і будзе выпрабоўваць паэта ў яго перакананнях:

*Прыйшоў ка мне той,*
*раскрыжованы, здань,*
*Што сном несмяротнасці*
*мучыць стагоддзі,*
*Быў твар яго ясны, як летняя рань,*
*І йшоў ён, як дзень светлакосы*
*прыходзіць.*

(«Альбігоец».)

Жылка годна прайшоў свой шлях, шлях да сваёй Самасці, які палягаў праз самакатаванне, праз эміграцыю, праз няволю-расстанне з усім, што ён любіў (Беларуссю, дачкой, сябрамі). І ўрэшце ён прыйшоў да таго, да чаго неадступна прыходзіць кожны чалавек, які хутка ступіць на човен Харона, — да веры. Але верыў ён не ў парожнія, што шклянкі паэтаў, абяздушаныя ідэалы, а ў чалавечую святарнасць і ў чалавечую прыроду Хрыста. Пра гэта сведчаць і дзённікавыя занатоўкі паэта: «Хрыста, светлага Ісуса, я заўсёды любіў. Знаю яго боскасць (хоць Богам ён мог не быць) і знаю яго чалавечнасць… знаю і яго малітву слабасці: «Хай міма пройдзе келіх гэты!»». Паэт спрабаваў зразумець Бога не дзеля таго, каб асудзіць ці адвергнуць, а дзеля таго, каб парадніцца, парукацца з ім душою. Шукаў ён свайго Бога па-рознаму:

*Прайшлі вякі… Яна ж адвечна*
*Ўсё тою ж буднасцю цвіце.*
*І я на думцы недарэчнай*
*Лаўлю сябе, як ты, Хрысце.*

(«Марта».)

Але ўрэшце знайшоў і прамовіў: «Я — грамнічная свечка прад Богам…», а пасля ўверыў сябе ў Божыя рукі, на волю Гасподню за народ свой, за сваю любоў і сваю смерць:

*Ўсемагутны! Вось сэрца паэта —*
*За народ Твой Крывіцкі ахвяра!*
*Дым кадзільны —*
*жар вершаў — прад светам*
*Узнашу да Цябе па-над хмары.*
*……………………………*
*Не адмоў нам паслаці прарока*
*З цвёрдай верай і словам агнёвым!*

Жылка быў перакананы, што над чалавекам вісіць кон, які ёсць пакаранне. Пакаранне ж немінуча спраўдзіцца: ці будзеш ты пакараны сабою самім ці пазасветаваю ўладарнаю сілай. Але будзе ўратавана тое, што застанецца пасля цябе, і нашчадкі з «любасцю прачытаюць тое, што захавалася на палімпсесце».

Паэты ж уладныя прадказваць свой канец. Так і выпала. Пасля смерці Жылку чакала забыццё. І нават на ягонай магіле не паставілі крыжа. Забыліся… Але прыйшоў час, і голас Уладзіміра Жылкі прарваўся праз стагоддзе да нас, яго духоўных нашчадкаў, і загучаў на ўсю моц, на ўсю сваю сілу:

*Змагуся сам —*
*дык сотням перадам!*

(«Меч».)

І мы пачулі яго. Адроджанага і незабыўнага.

*Брацці, зраблю вас багатымі,*
*Зорамі высаджу край.*
*Сонцам заззяе над хатамі*
*Словаў маіх каравай.*
*……………………..*
*Я ж вачэй не ўзніму, багавіца,*
*Толькі ўзрушаны думкі чамусь.*
*О, як соладка сэрцу маліцца:*
*Беларусь, Беларусь, Беларусь!*

ВЕРЛІБРЫУМ

# МАРСКІ ВУЗЕЛ

Зміцер ВІШНЁЎ



***

*вершы не пішуцца па загадзе*
*яны не падпарадкоўваюцца*
*сігнальным ракетам*
*іх вынаходзяць пад барвовым*
*восеньскім лісцем*
*вылоўліваюць з пякучым смакам*
*аксамітнай кавы*
*з грымучым укусам кубінскага рому*
*з ванільным пацалункам каханай дзяўчыны*
*з грукатам колаў вэнджанага цягніка*
*яны перабягаюць ад траншэі да траншэі*
*сярод срэбных пальцаў крыніцы*
*зрэдчас іх атручаныя целы трапляюцца*
*ў майстэрнях здзічэлых барадатых*
*мастакоў*

**25 студзеня 2010**

***

*Здаецца, ужо не баліць —*
*ператварылася ў вавёрку*
*А вясна праглынула самотны ўздых*
*— гэта сямёрка*
*Сямёрка — не туз — маркотны вецер у полі*
*Я стаю на пагорку — чытаю чысты ліст*
*Я стаю на пагорку — ў голаў запаўзае свіст*
*Свіст — не карабельны рып*
*і не спевы троляў*
*Танчыць мой сіні капялюш паныла твіст*
*Я стаю на пагорку —*
*чытаю апошні сяброўскі ліст*
*Слухаю вецер, а можа — свіст-свіст-свіст*

**15 красавіка 2010**

***

*Готланд Готланд*
*гланды нарастаюць на луджаных глотках*
*бот вельмі ладна распластаўся на хвалях*
*поўсць ветрам — на чорных котках*
*рот ловіць паветраны шлях*

**2007**

***

*поле для гульні ў гольф*
*баранчыкі памерам з цацачных эльфаў*
*гатычныя касцёлы —*
*стрэламі ў вышыню*
*ты адкаркоўваеш не віно —*
*Готланда цішыню*
*курчацца людзі ад залатога сонца*
*ты запякаеш паэта даволі злосна*
*бо верагодна садыст і абаронца*
*піраццва, якое не памэр, нават ускосна*
*коскі, кропкі — нібыта савецкія каскі*
*але цела патрабуе пяшчоты і ласкі*

**выспа Готланд, 2007**

## Карцінныя зебры

*табе пасуюць сонца, чырвоныя герберы*
*і калготкі ва ўзорах*
*у люстэрках — смех і слёзы, крык*
*і стогны ў зорках*
*і кожны настрой — гэта кот,*
*якога ты не любіш*
*але які муркоча пад далёкімі вокнамі*

*я зазіраю ў цэнтр сусвету*
*і на мяне падае планета*
*а калі наблізіць да вока павелічальнае*
*шкло, там —вясёлае неба*

*стратастаты апраўленыя*
*ў чорны аксаміт*
*дырыжаблі ўпрыгожвае малахіт*
*халодным і гарачым подыхам*
*навальвaецца*
*і прыціскае тутэйшае паветра*

*ты, напэўна, не дзяўчына — зебра*
*скарб дл барсеткі*
*а магчыма электрычнасць з разеткі?*

*будуюцца думкі нібыта дамкі*
*багоўкамі далятаюць гукі*

*толькі цені не ператворацца ў Казку*

**19 красавіка 2010**

***

*кракаўская кнайпа правакуе*
*да піўной гімнастыкі*
*тутэйшая атмасфера мае надзвычайную*
*падземную пластыку*
*студэнтка Ягелонскага ўніверсітэта,*
*што танчыць на сталe —*
*гэта фантастыка*
*яна нагадвае эфемерную птушку —*
*пэўна заспіртаваную ластаўку*

**6 лістапада 2008**

***

*Я задумаўся, што са мной адбываецца?*
*Навошта нехта за сцяной лаецца?*
*Пэўна мяне пагрызла моль? І цяпер*
*мне не дапаможа аніякі аэразоль?*
*Магчыма*
*гэта вясна? Ці проста з заапарка*
*скралі слана?*
*Але тым не менш я пазбаўлены сну.*
*Я цалую тупую сасну.*

**23 сакавіка 2010**

## Дзьмухаўцы

*Галя-хваля Галя-хваля*
*Быццам нейкая каналья*
*Ты хапаеш нібы хваля*
*Галя-хваля Галя-хваля*
*Ты сапраўдная Анталія*
*Унікальная талія*

*Галя Галя Галя Галя*
*Гулі-гулі-гулі-гулі*
*Галя Галя Галя Галя*
*Гулі-гулі-гулі-гулі*

*Галя-хваля Галя-хваля*
*Пахі пальмаў Шэпт каралаў*
*Смех кальмараў Рогат магаў*
*Галя-хваля Галя-хваля*
*Не схавацца нават малпам*
*Закахацца гвалтам*

*Галя Галя Галя Галя*
*Гулі-гулі-гулі-гулі*
*Галя Галя Галя Галя*
*Гулі-гулі-гулі-гулі*

*Галя-хваля Галя-хваля*
*Бег па скалах Скокі гландаў*
*Рык трамваяў Піск камбайнаў*
*Галя-хваля Галя-хваля*
*Сакавіцкая чырвоная піяла*
*Прашыпела Абаяла*

**27 сакавіка 2010**

## Ты — выхухаль

***Ахвярую Д. Д.***

*ты завязваеш шыю на марскі вузел*
*базілік канцэнтруецца ў раёне*
*абпаленых веснаў*
*душа абгарэлая ў пляшцы —*
*нібы мёртвы вусень*
*трамваі шыбуюць ў напрамку*
*вечных вуллёў*

*ваўкі выюць*

**8 снежня 2009**

***

***Ахвярую ворагам А. Бахарэвіча***

*распаўзаюцца кобрамі чорныя плёткі*
*думкі — нібы чэрапныя заклёпкі*
*гэтую свядомасць пакласці ў клетку*
*вось амлет вось паштэт*
*вось марынаваная віньетка*
*а там на талерцы ля беражка —*
*абрыдлы эстэт*
*спрабуе давесці пра вэнджаны свет*
*магчыма ягоныя прамовы*
*набудуць надзвычайную форму*

*на могілках — засохлая кветка*
*я — за сведку*

**10 лістапада 2009**

***

*надыхаўся мастацтвам ажно ў грудзях*
*забалела верагодна замнога*
*бруднага паветра*
*а на талерцы галава грузда ляніва*
*бялела*
*хацела лаўрушкі, кропу, спектр*
*аналізу патрабавала напоўніцу*
*сонца сваціла барвовай нябожчыцай*

**23 верасня 2009**

***

*мёртвыя зоркі*
*толькі хвіліны кропаюць нібы*
*тысячагоддзі*
*толькі тысячагоддзі паўзуць быццам*
*змрочныя танкі*
*і сярод іх ты шукаеш адказ на пытанне*
*колькі яшчэ трываць гэтую ціш?*
*магчыма ты проста спіш?*
*а калісьці на браслаўскіх азёрах ты*
*апякаў рукі*
*ты выраблаў веснамі дзіўныя*
*веснавыя гукі*
*нібы хвалі — плаўныя рухі*
*чуеш як сэрца рыпіць спружынамі?*
*магчыма сёлета ў царкве будзе вячэра*
*з ажынамі?*

**15 красавіка 2009**

## Рамантычны кілер

*(Камера высвечвае чатыры сцэны)*

*1.*
*я — чалавек-пісталет!*
*дзяўчына №1 — гэта прывітанне*
*ад мяне*
*твае пагоркі і лясы*
*набягаюць на мяне з цемрачы*
*ірвуць пакункі цішы на шматкі*
*валасы твае*
*горнай ракой*
*пах язміну*

*каля берагоў бачу танцы пінгвінаў*

*2.*
*я — чалавек-пісталет!*
*дзяўчына №2 — гэта мая страда*
*гэта — мая страфа*
*бяру камбайн*
*збіраю пацалункі*
*твае пячоры пульсуюць*
*сонечныя палі цярушыць нахабны вецер*
*тут пэўна*

*у люстэрках плаваюць трускалкі*

*3.*
*я — чалавек-пісталет!*
*дзяўчына №3 — не палохайся*
*рыхтуй бронецягнік*
*будзе гаротны крык*
*рыхтуй клетку*
*зробім табе залатую карэту*
*ты — маленькая — нібы зайчык*
*шаўковы звярок*

*у вачах абадкамі шэпчуць словы*

*4.*
*я — чалавек-пісталет!*
*і калі я сустрэну дзяўчыну №4*
*верагодна тады я не сустрэну*
*дзяўчыну №5.*

*крычу крычу крычу крычу*
*пра вецер, які схаваў штодзённыя веды*
*на нагах — медныя кеды*

**3 верасня 2008, Кракаў**

## Праслухоўваючы шоргат жукоў

## (МОЖА ГЭТА ЖУК І ЖАБА?) (ЦІ ЯШЧЭ ЯКІ СЯБРА ЦАРА ДАВІДА?)

***Ахвярую светлякоў Н.Іскрэнка***

*галіяф-ф-ффффффф-ыыы*
*галіф-ф-ффф-ээээ бліскучае*
*галерэя жукоў калючых*
*Міхася Башуры галаўны боль*
*для паэта і выдаўца на галгофу — моль*
*для друкара — гандола дзіравая*
*для паразітаў — кандомы кучаравыя*
*галіяф-ф-фффффф-ыыы уф-уф*
*гэта — бяда для генерала-жырафа*
*глаукома — далёка не кома*
*Глафіра — яшчэ рыпіць мая рапіра*
*гарачка — у руках каларадскіх*
*жукоў пачак*
*уздымаю да гары аголеную галаву*
*і палю-палю-палю прапановы*
*на паперы Нанова Напалову тушкі*
*на стол І зялёныя вушкі*
*на кол*

*галіяфы — нібы вялізныя сушкі*
*выпадаюць асадкамі на дол*
*збудаваны ў беларуска-афрыканскай*
*прасторы*
*маніякальны выдавецкі дом*
*дыктуем кніжную моду*
*і п'ем берлінскі чорны ром*
*у галаве — суцэльны вусячны аэрадром*

**22 ліпеня 2008**

## Трансфармацыя грукату ў шэпт

*як ходзяць гадзіннікі гэтак і сэрца працуе*
*але ўсё псуецца і развальваецца*
*на чырвоныя далягляды*
*і залатыя і срэбныя гадзіннікі*
*раптоўна ламаюцца выгінаючы стрэлкі,*
*выцягваючы вусікі і выпукляючы язурыкі*
*паветра ператвараецца ў студзіну,*
*якая пырскаецца каламутнымі кроплямі*
*нібыта на вочы набягае туман*
*і крывавая цемра адзінае выйсце*

**28 жніўня 2007**

***

*спякота ў галаве*
*словы быццам скарпіёны*
*неба набывае крывавы колер*
*хтосьці смяецца ды нехта плача*
*спякота — ад слова спяваць з катам*
*але спякоту нагадвае і самлелы кот*
*мёртвы сок перапаўзае па венах*
*нібыта ток*

**29 траўня 2007**

***

*Паланга нагадвае марское танга*
*Паланга насвіствае ветрам*
*Неба плавіцца сінім — рэтра*
*Сукенкі на дзяўчатах уздымаюцца сініцай*
*А на веснах — смак суніцаў*
*Пясок перасыпаецца нібыта думкі*
*Выкладаюцца з ценяў часу будкі*
*Куды хаваюцца не злыя сабакі —*
*а супрэматычны валік*
*Памяць застыгае ў светлых хвалях*

**10 чэрвеня 2008**

АПАВЯДАННЕ

# МОЙ ПРЫВАТНЫ БАРДЭЛЬ

Міхась АНДРАСЮК



Фота Б.П.

**Люблю хатні настрой беластоцкіх бардэлікаў. Заварожвае мяне чырвонае святло, што выходзіць з неназойлівых лямпачак у бардэльным фае. Ёсць у гэтым святле нешта непадуладнае нам — выгладжаным універсітэцкімі кніжкамі, вытанчаным канонамі грамадзянскага ладу і дзяржаўных правілаў. Нешта інстынктыўнае і першабытнае. Заплюшчу вочы — і кожная лямпачка выяўляецца факелам, скручаным з балотных пушчанскіх уюноў. Мяккі плюш занавесаў мае пах аленевай скуры, а накрахмаленая пасцель зубрынай поўсцю казыча маю спіну і шыю.**

Зацiскаючы вейкі мацней, адчыняю дзверы, даю праход майму далёкаму продку, што вяртаецца з палявання. Ён звальвае з плячэй здабычу, з палёгкай уздыхае, садзіцца на дубовую калоду і, прыжмурыўшы вочы, бяжыць позіркам за сваімі жанчынамі. Тут казытне сакавітую грудку, там ушчыпне медзяное ад летняга сонца сцягно або, прыкусіўшы губу, юрлівай думкай ляпне ягадзіцу, што прарываецца праз спаднічку з заечых хвосцікаў — як месячнае паўшар'е прарываецца праз аголеную восеньскім ветрам пушчу.

Мужчына раскошліва пацягваецца, сплятае далоні на патыліцы. Першабытны інстынкт самца напружвае ягоныя мускулы і ўсё астатняе. Але ў жанчын пакуль што свае неадкладныя справы. Першая і другая мітусяцца ля вогнішча, трэцяя і чацвёртая змагаюцца з няўрымслівымі дзеткамі — ну ніяк не ўкласці смурглаеў пад коўдру з зубрынай скуры, хаця сонца даўно сыйшло з пастарунку, схавалася за пушчай. Пятая жанчына здымае пра-пра-пра-прадзеду боты, шостая мые ягоныя стомленыя ногі. Сёмая тым часам уладкоўваецца за спіной, і яе моцныя, доўгія пальцы пачынаюць адмысловы танец. Праз два-тры тысячагоддзі гэты танец жаночых пальцаў на мужчынскай спіне атрымае імя. Таямнічае і спакуслівае, як свет за лесам-за морам. Імя «масаж».

Не ведаю чаму ўяўляю майго далёкага продка ў вяночку з сямі жанчын. Чаму не восем іх, не шэсць? Можа таму, што ў тыдні сем начэй? Можа таму, што сем смяротных грахоў днём і ноччу партызаняць у нябачнай засадзе, чакаюць зручны момант, каб перакрыць чалавечы шлях у вечнае жыццё? А можа, у такой кампані выяўляецца мне пра-пра-пра-прадзед, бо ў невялікім, утульным бардэліку на вуліцы Высоцкага ў Беластоку дакладна сем дзяўчын?

Ведаю іх — як усе свае сны. Калі б распрануць дзяўчын дагала, павярнуць тварам да сцяны, калі б нават кожную галоўку шчыльна закутаць у хустку вясковай бабулі, — гэта нічога не мяняе. Лёлю пазнаю па радзімцы пад лапаткай, Анжэлу можна абняць у таліі дзвюма далонямі, а вось Зузу — не. Зуза, калі б значна раней з'явілася на свет, магла б пазіраваць пану Рубенсу.

Люблю вяртацца ў знаёмыя мясціны і ў рэстаранным меню люблю знаходзіць знаёмыя блюды. Але сёння, ледзь пераступіўшы парог з чырвонага святла, я бачу ў фае штосьці незнаёмае. Дзве дзяўчыны прыселі на тапчаніку, Ніка дзяжурыць за хатнім міні-барам, чатыры астатнія, як можна здагадвацца, займаюцца працай у пакойчыках на другім паверсе. Побач з тапчанікам стаіць столік, і на гэтым століку дзяўчыны кладуць пасьянс пад свае самыя сакрэтныя мары. Яны штодзень такім чынам бавяць кароткі свабодны час, і, як ні дзіўна, у іх штодзень складаецца. Калі б даць веру картам, за кожнай з іх пад гэты бардэлік на ўскраіне Беластока прыімчыць калісьці прынц на белым крылатым «ройсе». Пад цыганскія скрыпкі панясе іх на руках у той «ройс», забярэ ў свой палац, апране ў карункавыя сукні і зорныя жамчужыны. А яны аддзячаць яму гаманлівай кучкай залатавалосых херувімчыкаў. Праўда, усё гэта збудзецца ў бліжэй неназванай будучыні, але яно няўхільнае.

— Добры вечур панём, — няспешна здымаю капялюш і падыходжу да міні-бару.

— Добры вечур, — цёпла ўсміхаецца Ніка.

— Добры, — не адводзячы вачэй ад картаў, бурклівым голасам кідае Ліза.

Ліза халодная, як паўночны полюс, і худая, як сем худых гадоў, сабраных пад адной вокладкай календара. У яе знаходзяцца свае прыхільнікі, але мяне Ліза ніколі не грэе і не студзіць.

Другая дзяўчына зусім новенькая. Як здагадваюся, яна прынялася на месца Эмілі, што тыднем раней паламала нагу, спускаючыся з другога паверха.

— На даўжэй, ці толькі да вяртання Эмілі? — Кіўком галавы паказваю на незнаёмку, але Ніка пацiскае плячыма. А хто можа ведаць? Хіба толькі Бог і шэф. Не гультайка, падыдзе кліентам — можа, і застанецца.

— Jak masz na imię?

Дзяўчына кемлівая, разумее, пытанне да яе. Папраўляе прычоску, зрываецца на ногі, абцягвае кароткую спадніцу. Яе лёс у яе руках. І яна нясе свой лёс у маім напрамку.

— Эва, — адказвае.

— Ładne imię.

— Wiem. Po mamie. Postawisz piwo? — Усміхаецца какетлівасцю малой дзяўчынкі. Але мяне інтрыгуе мелодыя яе голасу. Мяккае «ш» і глыбокае, працяглае «о» дакранаюцца да жывой душы, да тых прыгожых дзён, калі ў беластоцкім консульстве мне давалі шматразовую візу, і я ехаў, куды хачу: у Гродна, у Мінск, у Слуцк, нават у далёкі Магілёў. «Ага, з-за ўсходняй мяжы ты, сонейка», — мільгае ў галаве. Цікава, з Беларусі ці з Украіны?» Але на ўкраінку дзяўчына не цягне. Русавалосая, сінявокая, з ветлівай, прыязнай усяму свету ўсмешкай. Не, не казацкая тут, не бурлівая кроў. Не з Украіны яна. Не з Украіны? Дык адкуль? Няўжо ж з Беларусі? Ад нечаканага адкрыцця маё сэрца мацней грукае аб грудзі.

Часам мроіцца мне, што я звычайны польскі беларус. З восьмай да шаснаццатай гадзіны сяджу на працы. Роўна ў шаснаццаць саджу на галаву капялюш, апранаю паліто, зачыняю кантору на тры замкі, па мармуровых сходах спускаюся на вуліцу і ныраю ў ананімны натоўп. І ў свабодныя хвіліны не змагаюся за бел-чырвона-белы сцяг, за «Пагоню». Нават за мову родную не змагаюся, бо ўсё яно ўсім нам даступнае, дасягальнае, як тыя прыгажуні ў бардэліку на вуліцы Высоцкага.

— Postawisz piwo? — Дзяўчына схіляе кудзеркі на бок. З галоўкай, перакуленай на плячо, нагадвае птушаня, што неасцярожна звалілася з роднага гнязда і, прысеўшы ў высокай траве, чакае, чым гэта ўсё закончыцца.

— Ты з Беларусі? — адказваю пытаннем на яе пытанне, даю знак, і Ніка пераліве дзве бутэлькі ў дзве чвэрцьлітровыя шклянначкі — маленькія, філігранныя цацкі, падобныя на тайскіх дзяўчынак, якіх суботнім познім вечарам глядзіш у тэлевізары.

— Ja? Z Białorusi? Ależ skąd! — Вочы дзяўчыны закругліваюцца ад здзіўлення, а рука цягнецца па шклянку. — Skąd ci to przyszło do głowy? Ja z południa Polski jestem, z pod Krakowa.

— Прыкідваешся, сонейка. У цябе ўсходні акцэнт. Не схаваеш.

— Nic nie udaję i niczego nie ukrywam, — цяпер яе вусны абражаюцца і складваюцца ў смачны абаранак. І яна не спахапляецца, што вось адным лішнім словам здае сябе, канчаткова рассакрэчвае. Бо адкуль жа ведаць паненкам з-пад Кракава родам, што беларускае «прыкідвацца» дакладнае адлюстраванне польскаму «udawać», а «ukrywać» і «хаваць» абазначаюць адно і тое ж?

— Ладна, не прыкідваешся. Дык скажы: drabina z powyłamywanymi szczeblami.

Мне часта мроіцца, што я звычайны польскі беларус. Вечарам усоўваю ногі ў тапкі, плюхаюся на тапчан, закідаю нага на нагу і гляджу, як гэты тапак, што зверху, ляніва гойсае на фоне тэлевізара. Пасля вячэры іду ў туалет, чышчу зубы, ныраю пад коўдру, прытуляюся да мяккага боку ўласнай жанчыны. Не змагаюся за сцягі і гімны, і дэмакратычныя каштоўнасці — яны заўсёды былі і ёсць на сваім месцы, як гэтая жанчына пад коўдрай. Прыгожая, разумная і працавітая, бо ўсё, што лепшае, узяла ад сямі жанчын майго пушчанскага язычніцкага пра-продка. Але ў мяне не атрымліваецца. Мае тапкі ўвесь час у дарозе, на шляху. Часам начуюць у выпадковай кватэры, часам губляюць накірунак. Часам замест чорнай кавы на сняданак новы дзень частуе мяне кубачкам чорнай гаркоты. На адзін момант спыняюся ды іду далей. Пятнаццаты год.

— Drabina z powyłamywanymi szczeblami, — няўпэўнена кажа дзяўчына.

— А вось не. Не так. Не польскае ў цябе «эл». І «ша» не кракаўскае, і «чэ», — ахопліва мяне шчырая, дзіцячая радасць. — Але пачакай, з драбінай надта проста. Ты лепей скажы: w Szczebrzeszynie chrząszcz brzmi w trzcinie. Ну, скажы, калі сапраўды з-пад Кракава ты.

— Będziemy tylko rozmawiać? I to wszystko? — Дзяўчына правярае гадзіннік, у яе вачах запальваюцца тры свечкі: надзеі, расчаравання і пасярэдзіне трэцяя, свечка звычайнага сораму. Нікому яны не чужыя, кожны чалавек нясе за пазухай свае свечкі, і часам няма куды дзявацца, трэба дастаць іх, запаліць і паказаць усяму свету.

Дзяўчына камячыць у вуснах цёплы воск, а я іду да канца, да апошняга, і ў дадзены момант не існуе ў прыродзе сілы, здольнай мяне спыніць. Разганяюся і іду. Я ведаю: не мая справа мяняць увесь свет, шчыльнымі радамі запаўняць гэтую ці іншую плошчу. Мая справа — ісці да канца на маім маленькім фронце і выцягнуць з акопаў гэтую дзяўчыну, і выцягнуць з яе роднае слова. Разганяюся. У маіх мазгах разгараецца чырвоная лямпачка — і непадуладны логіцы першабытны інстынкт штурхае мяне наперад. Калі тут і цяпер, у гэтым маленькім бардэліку з гэтай дзяўчынай народзяцца беларускае слова, значыць — мая справа закончана. У нас усё нармальна, як у людзей…

— Будзем не толькі размаўляць… Калі будзем размаўляць, сонейка. Менавіта, размаўляць. Не розмавяць і не разговаривать.

Мне ўсё часцей мроіцца, што я звычайны польскі беларус. Нядзельнай раніцай іду ў Сабор святога Мікалая, што на Ліпавай вуліцы. Вітаюся з суседзямі, слухаю пропаведзь. Праўда, яна па-расійску і з моцным польскім акцэнтам, але на адзін чарговы сантыметр прыадчыняе дзверы ў бязмежныя нябесныя пакоі. Чысты і супакоены вяртаюся з царквы дамоў, назіраю за беластоцкімі галубамі, з сіняга, бязвоблачнага неба зграбтаю капялюшом першыя промні чарговай вясны. За абедам, па-польску і без акцэнту, распавядаю маёй жанчыне пра ўсе лепшыя хвіліны, што прыйдуць у наш дом з надыходзячым панядзелкам. Але я не ведаю, куды дзелася гэтая жанчына.

І я іду на маім малым фронце наперад. Не тое, што ўсялякія палітычныя партыі. Іх шмат, як прабітых колаваротам прорубаў на зімовым возеры. Часам думаю: ці не ў кожнага палітыка свой прорубь для зімовай лоўлі. Гэтыя партыі невялікія. Можна ўзяць іх у далоні, закінуць у кругленькі прорубь, і яны застануцца ў гэтым прорубе на век вечны. І будуць круціцца там, круціцца, круціцца, як змёрзлае гаўно.

Я іду наперад.

— Ну як, сонца? Паразмаўляем? Там, у пакойчыку на другім паверсе. Або бяру Зузу.

Дзяўчына абмяркоўвае ў думках усе «за» і «супраць». «За» простае: трыццаць еўра за трыццаць хвілін. «За» — гэта першы крок насустрач прынцу на белым «ройсе». А «супраць»? А «супраць» падыходзіць шматлюднай, гаманлівай дружынай. Такі ён, наш свет. А можа, не свет, можа, мы, людзі, такія? Супраць кожнаму «за» гатовыя паставіць дзесятак «супраць», каб апраўдаць сябе перад кожным, нат самым жорсткім судом. Судом часу.

Дзяўчына дапіла піва і глядзіць на мяне. Глядзіць уважліва, не зводзіць з мяне вачэй, абмацвае позіркам кожную клетачку майго цела. І няспешна, не спыняючыся, як вопытная стрыптызёрка, распранаецца. Яна распранаецца з усіх сваіх «супраць». Цяпер я гляджу ў яе вочы. Пасярэдзіне зрэнак бачу адну адзінокую свечку. Яе трымае далонь старой жанчыны. Зацiснутыя пальцы бабулі трымаюць моцна. Гарачы воск капае большымі і большымі кроплямі. Пячэ, але пальцы не адпускаюць…

Ці не з гэтай бабуляй размаўлялі яны на мове апошні раз? У далёкім, светлым дзяцінстве, калі ад мары да яе здзяйснення — не далей за міг. І сказаць роднае слова тут і цяпер — тое ж, што пасля доўгай адсутнасці вярнуцца ў дзяцінства ды распавесці бабулі пра ўсе нязздзейсненыя мары.

Дзяўчына маўчыць. Сціснуўшы зубы, пачынае расшчапляць старэчыя пальцы, што гадамі зрасталіся з гэтай свечкай. І свечка згасае.

— Ладна, пайшлі. Час — гэта грошы.

«Дзе яшчэ, калі не ў бардэлі, маглі прыдумаць гэты самы асноўны закон эканомікі?» — думаю, і ўслед за дзяўчынай падымаюся на другі паверх.

На стале застаюцца дзве парожнія шклянкі. Чырвоныя ад паўсвятла бардэльнага фае.

**Апавяданне прачытанае аўтарам 25 сакавіка 2010 г. у Мінску падчас уручэння яму прэміі часопіса «Дзеяслоў» «Залаты апостраф».**

МІНІЯЦЮРА

# ЯК БУСЕЛ ВУЧЫЎ ЗАЙЦА ЛЁТАЦЬ

Збігнеў-Влодзімеж ФРОНЧАК



На небе вісеў месяц. Жоўты, круглы, быццам крыху пузаты, таму цяжкаваты ды інакшы, чым звычайна. Быццам бы бліжэйшы да зямлі. Так здавалася Эдку Мазуру. Мала таго: ён уяўляў, што як выедзе на ўзгорак, то дастане да яго пугай! І Эдак, калі ўз'ехаў на вяршыню, моцна размахнуўся.

Каля яго сядзеў поўны пыхі солтыс Ян Бонк. Глядзеў з сярдзітым шкадаваннем і, відаць, думаў, што Эдак дае шмат падставаў для высмейвання жыхароў Ксенжых Гурак. Жартаўнікі сцвярджалі, што вароны над Ксенжымі Гуркамі, калі не хочуць бачыць невуцтва, павінны лётаць дагары нагамі. Солтыс ведаў гэтыя жартачкі і злаваўся. (Гэта ён яшчэ не ведаў, што на ягонай тэрыторыі бусел вырашыў навучыць лётаць зайца. Чаму зайца — таго ніхто не ведае. Каб лётаць трэба было солтысу, то несумненна ведалі б усе).

Ну, дык тут Бусел неяк казаў Зайцу:

— О, каб ты мог лётаць, было б на што паглядзець.

— Някепска было б, але гэта нешта нерэальнае... — зусім не засмучана запярэчыў Заяц. Ён не падзяляў буслінага зачаравання палётам.

— А хацеў бы? Прызнайся шчыра! — Налягаў Бусел.

— Можа і хацеў бы, але як?

— Я скажу як. Лезь на дах, — закамандаваў Бусел.

— Цяпер не магу. Выпіў замнога, — выкручваўся Заяц.

І тады Бусел падумаў, што не проста дасягнуць сваёй мэты.

Добра мець мэту.

Жыць без мэты цяжка. Але і дасягнуць яе нялёгка. Трэба шмат намаганняў, часам нават гадоў самаахвярнасці. Так кажуць.

Цяжка не паверыць. Можа таму некаторыя перш, чым закасаць рукавы, разважаюць, падлічваюць, думаюць — ці варта яно працы. Якую мэту дасягнуць лёгка? — Пытанне...

Што мог ведаць пра гэта Бусел?

Эдак паганяў каня.

Над ім зорнае неба, пад ім асфальтаваны гасцінец. Сноп іскраў з коміна. Можа, асядуць на небасхіле, і зор стане болей.

Вось стары дом. У ім ніхто не жыве. Хто ж тады паліць старую печ? Старую печ чорт паліць.

Конь панёс, Эдак чорту пугі даў. Звычайныя справы.

Вёска ўжо блізка. Злева лугавіна, справа солтысава поле канюшыны. У канюшыне заўважылі самалёт. Блішчэў, як бляшаны дах на гумне. Калі з вёскі выязджалі, яго там не было. З неба ўпаў, вядома. Такое не кожны дзень здараецца. Падышлі. Укленчылі перад ім, намачылі калошы вячэрняй расою.

«Бусел», — прачытаў солтыс надпіс на фюзеляжы. Калі б тут размясціўся харцэрскі табар, солтыс ведаў бы, як з ім гутарыць. А гэты тырчэў нерухома, і хоць нёс ганаровую назву, мёртвы быў і бяздушны.

Яго нават пугай перацягнуць не выпадала.

Солтыс вылаяўся і помсліва наступіў на крыло.

І паўтарыў: «Бусел».

— Хе, хе, бусел, — радасна зарагатаў Эдак. — Бусел, а як заяц — у канюшыне...

— Ці магчыма гэта? — Выпытваў Заяц.

— Заяўляць, што магчыма, то не. Але цябе пакінуць у спакоі — і кухарка, і тым больш паляўнічы. Іначай я б цябе ніколі не намаўляў.

— А чаму ты так у гэтым зацікаўлены? — Не ўступаў Заяц.

— Нідзе не напісана, што зайцы не могуць лётаць. Праўда, не выключана, што ў цябе антыталент да палёту...

— Антыталент? — Спахмурнеў Заяц.

— Ты зразумей, — працягваў Бусел. — Я магу табе дапамагчы. Ніхто не супраць, каб зайцы лёталі. Ніхто іх адмыслова не пераследуе, не тушыць як... ну хоць бы вашых пабрацімаў — трусоў. Маеце зашмат свабоды, якая, аднак, з кожным годам скарачаецца, бо арэал культурнай глебы таксама змяншаецца. Яшчэ скачаце, але гэта часова. Потым будзеце як трусы ў клетцы, як гіпапатамы ў заалагічным парку. Заплываце тлушчам, мускулы страцяць эластычнасць, будзеце есці канюшыну з рук. Кепская перспектыва. Але яшчэ можаш рашыцца на прыгожы жэст, рыкнуць ільвом. Твой прыклад падштурхне да дзеяння іншых. Баязліўцы стануць дзёрзкімі, цяльпукі — энергічнымі, няўклюды — гнуткімі і скакучымі, усіх агорне энтузіязм, натхненне, давер спантаннасці, упэўненасць у лепшыя дні. Праўда, з часам мяняецца і мода. Толькі не знікае патрэба ў героях нашага часу. Бо няма часоў без герояў. Недахоп герояў — гэта апатыя, стома, упадак духу. Бо памяці няма за каго зачапіцца. Я хачу стварыць для цябе выключную магчымасць, непаўторны шанец! Ты прыгадваеш першы палёт у космас? Памятаеш тое імя — ЛАЙКА?

— Пра тое шмат казалі!...

— Вось бачыш! — Узрадаваўся Бусел. — Ці ёсць дзе вуліца Зайца? Няма і не будзе. Нідзе! Ёсць Гагарына і Заёнчака. Генерал Заёнчак не меў з вамі, палявой галотай, нічога агульнага. Таксама і Гагарын. Але ты можаш быць як ён, як Юрый Гагарын! Падобным да яго. Даб'ешся такога ж самага, вялікага поспеху!

— Але ж і вуліцы Лайкі — няма? — удакладніў Заяц.

— Не будзь у гэтым вельмі ўпэўнены. У польскім горадзе няма. Аднак свет на ім не канчаецца.

— Хачу знаць праўду. Толькі сур'ёзна, — загарачыўся Заяц. — Што мне дасць гэты палёт? Ці варта рызыкаваць?

— Даведаешся, які прыгожы бывае свет для таго, хто дабіўся поспеху. Уганараванні, павага... Атрымаеш пасаду. Можа, нават...

— Дэлегата! — вырвалася ў Зайца.

— Дэлегата можа і не, але ў кіно запросяць дакладна. Лятучы шарак! Такога яшчэ не было!..

— Што з гэтага людзям? Хто я для іх, кім буду?

— Ты для іх толькі мяса. І не адрозніваешся ад труса. І ўсё ж — такі палёт. Падумай! Палёт над зямлёй! Узвышаешся над самім сабой! У хмарах! Пад табою людзі, сабакі, каты і трусы! І яшчэ палеткі, засаджаныя да краёў капустай!

— Ты блефуеш. — Сур'ёзна заявіў Заяц. — Хочаш мяне выкарыстаць. Такое ўзнікае непераадольнае ўражанне. Праўда, гаворку вядзеш пераканаўча. Тыпу: усе гуртуйцеся. Не магу сфармуляваць каверзнага пытання, каб злавіць у тваіх нахабных аргументах ману. Прызнайся! Ты вядзеш нейкую гульню?

— Як ужо будзеш лётаць, — разважаў Бусел, зусім не збіты зпанталыку, — не забудзься зняць куртку з надпісам «US Army». У цябе сапраўды маскіровачны колер, які цудоўна вытрымаў выпрабаванне, калі ты шнарыў па капусных палетках, але ў час палёту трэба мець на сабе звычайную баваўняную кашульку. Не зашкодзіць надпіс: «Вас вітае Польшча».

— Можа, якія крылы? — Падказаў Заяц.

— Не трэба. Чуў пра Ікара?

— Кепска скончыў! — Заяц пацёр лапкі. — Кепска.

Праз нейкі час ўзікнуў, быццам толькі зараз усвядоміў, які лёс хоча падрыхтаваць яму Бусел. Але Бусла нават крылы не збілі, ён весела дадаў:

— Бачыш. Не верыў сабе. Даверыў крылам. Ты павер сваім лапкам! Сваёй поўсці. Вырві невялічкі касмык! Ну, смела! Дзьмухні на яго! Ляціць?

— Ляціць...

— Ну, бачыш! І ты паляціш!

Адзінае ў вёсцы буслінае гняздо знаходзілася на гумне Эдака Мазура. Ён з'яўляўся бацькам сямёх дзяцей, але ўсе лічылі, што без удзелу буслоў тут не абышлося.

Эдак уломкам не быў. Мог несці два мяшкі збожжа, а за абедам з'есці цэлага пеўня і выпіць бутэльку віна. Любіў добра паесці, а яшчэ больш — добра выпіць. Курэй не трымаў, таму цэлага пеўня мог з'есці толькі ў выпадку вялікага свята. Можа, раз ці два на год. Так што часцей здавальняўся бутэлькай віна.

— Ты гатовы? — спытаў Бусел безапеляцыйным тонам.

— Так, але ў мяне сумневы. Што будзе, калі разаб'юся пры пасадцы?

— Будзеш выглядаць як пасля мясакруткі. Але не прымай да сэрца. Ніхто не ведае свайго канца!

— Так па-дурному скончыць? Зваліўшыся з даху! Гэта добра для камінара, але для зайца?..

У мястэчку паблізу адбыўся выпадак. На прыпынку натоўп пасажыраў выпхнуў пад аўтобус кабету. Яна трымала ў руках два боханы хлеба, дома двое малых дзетак.

— Хлеб не выпусціла. — Сказаў Эдак з павагай. І праз хвіліну дадаў: — Цісканіна была, бо два папярэднія аўтобусы не пайшлі. А наступнага ніхто не хацеў чакаць.

Солтыс паганяў каня. Пракаментаваў:

— Так па-дурному скончыць. І дарэмна.

— Ніхто не ведае свайго канца, — уздыхнуў Эдак.

А солтыс падумаў, што Эдаку цяжка адмовіць у лёгкасці фармулёвак філасофскіх думак.

Страха. Пашкамутаная. Зімы можа не вытрываць.

На грушы тэлевізійная антэна. Груша — вышэйшая кропка ў ваколіцы. Бусел на гумне.

Этэрнітам пакрыць нельга, новыя дэкрэты забараняюць, бо шкодны.

А бляха задарагая!

Ля свайго дома Эдак злез з солтысавага воза і тады ўбачыў зайца.

— Байка! Кусі яго! — Закрычаў на сабаку. Але сучка Байка толькі што ашчанілася і не вытыркала з будкі носа.

Брудна вылаяўся. Не выключана, што вырашыў паставіць петлі.

Пагледзеў на бусла. Набожна і з шанаваннем. Бо Эдвард Мазур шанаваў і любіў гэтага вялікага птаха. Магчыма, той хвіляй падумаў, што ні разу не паспрабаваў яго прыручыць ці хоць прывучыць да чагосьці, хоць бы паляваць на зайцоў. А меў магчымасць вучыць! Бо трымаў у руках! Гэта ён, Эдвард Мазур, калі бусляня выпала, падняўся з ім па драбіне да гнязда. Што ж. Было і мінула. Шанец згублены.

Эдак замаркоціўся і на бусла паглядаў ужо з меншай сімпатыяй. Магчыма, пазіраючы на яго, адчуваў сваю мізэрнасць.

З хмызоў высунуўся Заяц:

— Якім курсам паляцім?

— Наўпрост на лугі!

— На захад? Не перашкоджу авіяліініі «Варшава-Лондан»? Ведаеш, што б было, калі б аб мяне разбіўся які-небудзь самалёт накірункам з Англіі? Хто б паверыў, што ляцеў заяц? Ну скажы — паверылі б, што заяц вучыўся лётаць?

— Паляціш іншым курсам!

— Гэтыя — з усходу — павераць у лятучага зайца?

— Цяжка цябе пераконваць. — З жалем сказаў Эдаку солтыс. — Ты быццам зусім не чуў пра часовыя гаспадарчыя праблемы. Папросту не хапае цэглы і цэменту. А бляхі дык і пагатоў. Нават Стэць не можа вілу дабудаваць. Усім нялёгка. Але даю слова ўладзіць. Вер мне.

— Хутчэй паверу тым, якія заяўляюць, што скупляюць коней, каб вялізны воз з неба сцягнуць!

Солтыс змоўчаў. Што казаць? Такога жарту яшчэ не чуў. Было яму прыкра. Солтыс жа таксама жыхар Ксенжых Гурак. То чаму яго не любяць? Чаму пад'ялдыкваюць?

Вёска мае дасягненні. Збудавалі дэпо і дзіцячы садок, адрамантавалі млын і шашу. Журналісты не раз прыязджалі. З газет, радыё і тэлебачання. Запісвалі, што солтыс казаў. Паўзімы з радыё ягоны голас чуўся. Цяпер зноў з тэлебачання абнадзеілі. Мабыць, будуць рабіць забаўляльную праграму?

— Уразіўся раптам сваёй думцы.

Зірнуў на Эдака. Той меў іншы клопат і чаканне. Вырашыў, што калі ў наступным годзе Ян Бонк зноў захоча стаць солтысам, то ён прагаласуе супраць.

— Ты гарантуеш мне поспех? — спытаў Заяц.

— Поспех — так. Толькі не магу засцерагчы цябе ад аферыстаў, якія таксама хочуць поспеху. Можа здарыцца, што які-небудзь трус прыпіша сабе твой палёт.

— Як гэта?

— Выдасць сябе за цябе!

— І што тады?

— Давядзецца ляцець другі раз!

— Другі раз? Адным палётам не скончыцца?

— Трэба будзе замацаваць поспех. Узляціш другі раз. Будзеш ужо майстрам. Гэта табе не дадасць клопату.

— А калі і ён, ну, той аферыст — узляціць?

— Я не падазраваў бы яго ў гэтым.

— Часам хочацца быць як бусел, — рашуча заявіў Эдак Мазур.

А солтыс падумаў, што Эдак п'яны. І запярэчыў:

— Чалавек — гэта чалавек. Павінен жыць на зямлі і не лезці ў хмары. Чалавек павінен мець нешта такое, што называецца чалавечнасцю.

— А заяц? — Зацяўся Эдак, бо якраз уначы яму прысніўся паштэт. — Павінен мець заечнасць?

— Хто яго ведае... Зайцамі высокая навука не цікавіцца. Зайцамі цікавіцца кухня!

...І цяжка гэтаму меркаванню адмовіць у рацыі!

Заяц стаяў слупком. У гэтым не было б нічога дзіўнага, каб не тое, што стаяў на даху.

Бачыў дом, падворак, курэй на ім, індыкаў, сучку Байку са шчанятамі. Далей сад, луг, дэпо і вежы царквы. Бліжэйшага поля з капустай было, аднак, не відно.

— Цяпер або ніколі, — рашыў Заяц. І перасцярог Бусла: — Не думай, што гэтае дасягненне — тваё. Я хацеў бы, каб гэты мой палёт лічыўся пратэстам. Вялікім пратэстам у абарону асяроддзя. Хто як, але я маю права на пратэст. Дзядзьку забілі гэтым годам, дзеда і яго брата злавілі петлямі. Але я выйшаў сюды, на дах, не казанні прамаўляць і не мітынгаваць, таму заканчваю. Узгадваю — заўсёды я побач каля смерці, няспынна ўцякаў, для людзей быў сымбалем страху, і толькі зараз здзяйсняю палёт у бяссмерце.

Зірнуў уніз. Моцна адштурхнуўся. Замахаў лапкамі.

Паляцеў!

Да канца не верыў сам сабе. Бусел не верыў вачам.

Ляцеў!

Я гэта бачыў!

**Пераклад з польскай Паўла ЛЯХНОВІЧА.**

**Друкуецца ў скароце.**

РЭЦЭНЗІЯ

# ФАЎЛЗ «НААДВАРОТ», АЛЬБО ЧАМУ ПЛАЧУЦЬ ЖАНЧЫНЫ?

Ася ПАПЛАЎСКАЯ

**Ці то ў мяне параноя, ці то сучасныя беларускія пісьменнікі пачалі занадта актыўна пісаць творы з адпаведным назовам. Апрача добра раскручанага рамана «Параноя» вядомага журналіста, а цяпер і пісьменніка Віктара Марціновіча, узгадаю хаця б апавяданні з магічнай назвай за аўтарствам Насты Манцэвіч ды Сяргея Календы. Пра «Параною» апошняга і прапаную пагаварыць.**



Невялікае апавяданне маладога і адначасна на дзіва сталага С. Календы апублікаванае ў ягоным дэбютным зборніку прозы «Помнік атручаным людзям», што пабачыў свет у мінулым годзе. Кніга з такой неадназначнай, шматсэнсоўнай назвай — збольшага пра маргіналаў: педафілаў, бамжоў, вычварэнцаў, вар'ятаў, злодзеяў, прастытутак (калі іх можна аднесці да маргіналаў) ды дзяўчат/жанчын, да якіх звяртаюцца няйначай, як «Б…». Зрэшты, выбар герояў нядзіўны ды невыпадковы: сам С. Календа лічыць сябе нямнога-нямала — бітнікам (так называюць паслядоўнікаў ідэяў біт-пакалення. Паводле стэрэатыпу, бітнікі адмаўляюць традыцыйную мараль і агульнапрынятыя сацыяльныя каштоўнасці. Радыкалізм бітнікаў нярэдка выяўляецца ў парушэнні элементарных нормаў паводзінаў), а кніга спрэс прасякнутая духам экзістэнцыялізму (паводле філасофіі экзістэнцыялізму, каб усвядоміць сябе як «экзістэнцыю», чалавек павінен апынуцца ў памежнай сітуацыі — напрыклад, адчуць подых смерці).

Апавяданне «Параноя», знаходзячыся ў агульнай тэматычна-ідэйнай плоскасці з астатнімі творамі кнігі, значна адрозніваецца ад іх. Не толькі формай (апавяданне ў апавяданні), але і глыбінёй ды сур'ёзнасцю праблем, пастаўленых маладым празаікам. Спынюся на кожнай з іх асобна.

Педафілія ў «Параноі» выкліканая не столькі сэксуальным жаданнем авалодаць маладым некранутым целам, колькі ўзвышаючым сябе ў сваіх жа вачах пачуццём улады, а таксама імкненнем мець побач блізкага чалавека, якому можна давяраць: «…ён мог гадзінамі сядзець, утаропіўшыся ў адно з нябачных акенцаў, назіраючы рэаліцішоў амаль у сваёй хаце! Часам ён засынаў за гэтым заняткам, але часцей за ўсё ён ананіраваў як вар'ят. У дзень даходзіла да дзесяці разоў, яму неабавязкова было, каб яго наложніца была голая або сядзела на ўнітазе. Яму нават было дастаткова і адной думкі, што ён распараджаецца жывой душой, што ў яго руках бязмежная ўлада, што ён можа рабіць з ёй усё, што захоча, а калі ён загіне, то яна памрэ ад голаду. Улада давала яму волю».

Ахвярай безыменнага «мужыка», героя апавядання Франка (маладога спецыяліста ў сферы PR, які яшчэ і прозу піша), галоўнага героя «Параноі», становіцца сямікласніца (таксама без імя. Мяркую, С. Календа наўмысна надаў героям безасабовасці, не выпісаў характары, не акрэсліў асабістыя якасці, каб падкрэсліць тыповасць праблем, што ўздымаюцца ў творы).

Гаварыць пра інтэртэкст не даводзіцца, хоць і вельмі хочацца. Ды пры жаданні — можна было б. Але… Фаўлзаўская сітуацыя затачэння адзінокім, закамплексаваным мужчынам дзяўчыны ў сваім доме абраная С. Календам не таму, што яму хацелася, каб чытачы ды крытыкі вынайшлі ў творы інтэртэкст ды назвалі апавяданне постмадэрністычным (айчынныя крытыкі могуць пры жаданні), а проста таму, што сітуацыя гвалтоўнага абмежавання свабоды ідэальна пасуе для ўзняцця ды раскрыцця праблем, якія аўтар уклаў у твор.

І ўсё ж правядзення пэўных паралеляў паміж «Паранояй» ды раманам Джона Фаўлза «Калекцыянер» пазбегнуць не атрымаецца. І ў «Калекцыянеры», і ў «Параноі» матывацыяй учынкаў героя (героя героя — у «Параноі»; змушаная акцэнтаваць увагу на гэтым, каб не блытацца) служыць не гвалт, а менавіта прыручэнне ахвяры. І фаўлзаўскаму Фрэду-Калібану, і календаўска-франкаўскаму «мужыку» хочацца душэўнай спагады і разумення. Іншае пытанне — чаму менавіта такі шлях абіраюць героі? Чаму затачэнне?..

Але гэта — да наступнай праблемы, узнятай у «Параноі»: асаблівасці мужчынскай і жаночай псіхалогіі, а таксама змены, што адбываюцца ў псіхіцы ахвяры цягам затачэння. У Фаўлза Міранда — моцная, сфармаваная асоба, са «стрыжнем» і складзеным светабачаннем. У календаўскага Франка ж — сямікласніца, горкае дзіця: «Яе жыццё спынілася на дзіцячых кніжках і казках. Яна дагэтуль не разумела маштабу ўсёй яе асабістай трагедыі, магчыма, гэта было і добра. Для яе добра. Блажэнныя не ведаюць зла…» Памятаем фінал рамана Фаўлза: Міранда захворвае і паміраe. У «Параноі» ўсё па-іншаму: дзяўчына (дарэчы, «гаспадар» усё ж авалодаў ёй — нарадзіўся хлопчык) збягае ад свайго «мужа». Яго арыштоўваюць. Але (нечаканы паварот падзеяў) яна, раптоўна адчуўшы правільнасць учынкаў свайго мужчыны ды ўласную дурасць, забірае заяву і адмаўляецца ад паказанняў: «Яна была шчаслівая, нарэшце здабыла спакой і каханне, проста раней з-за сваіх дзіцячых мрояў лічыла, што ён гнюсны чалавек, але аказалася, што яна проста нічога не разумее ў жыцці, седзячы ў адным пакоі гадамі, вось і не разгледзела свайго прынца на белым кані!»

Навідавоку так званы «стакгольмскі сіндром»: сувязь паміж ахвярай і агрэсарам, пры якой першая спачувае гвалтаўніку, апраўдвае яго. У гісторыі ёсць выпадак, калі жанчына, якая стала ахвярай мужчыны-рабаўніка, пасля выйшла за яго замуж…

Яшчэ адна праблема, якую падымае ў «Параноі» С. Календа — гвалт у сям'і і як вынік — маўклівае служэнне жанчыны мужчыне (прычым часта — добраахвотнае): «Яна ведала, што ў хаце яе чакае адплата, але, значыць, так трэба. Трэба менавіта так, як сказаў ён! І так жывуць амаль усе жанчыны. Яна ішла, ледзьве паспяваючы за ім, і думала, думала, як магла, як большасць такіх, як яна, якія не бачаць белага свету ды прабачаюць сваім мужчынам усё: і збіцце, і зачыненыя дзверы, і недахоп адукацыі. Яна ішла і думала на столькі, на колькі дазваляў ёй мужчына». Спрадвечнае беларускае (пакорліва-жаночае?) «значыць, так трэба»… Але — каму тое трэба?..

Калі выйсці з апавядання ў апавяданні ды павесці гаворку аб галоўным героі-пісьменніку Франку, то тут мне бачыцца вельмі актуальная ва ўсе часы праблема адзіноты творчай асобы, што спараджае цэлы спектр наступстваў (ад яе пакутуе як сам Франк, так і герой, выпісаны Франкам).

«Разынкай» апавядання сталася параноя Франка: у навінах ён бачыў-чытаў пра тыя страшэнныя здарэнні (тэрарыстычны захоп крамы, знікненне дзяўчынкі чатырнаццаці гадоў), пра якія пісаў раней у сваіх апавяданнях. Ці то так сапраўды было, ці то яму падавалася: дэжавю, параноя. Калі Франк скончыў пісаць аповесць, пра якую вядзецца гаворка вышэй, ён пайшоў у бар. Там сустрэў мужчыну, які… распавёў яму гісторыю, што «супадала з ягонай гісторыяй на паперы, з ягонай гісторыяй, якая ляжала зараз у рэдактара, ды ў хаце на кампутары…»

Што робіць Франк? Напэўна, тое, што зрабіў бы любы на ягоным месцы: бяжыць дадому ды піша канец свайго жыцця. Яму — можна прыдумаць свой далейшы лёс, «свой капут»…

«Параноя» Сяргея Календы, бадай, самае моцнае апавяданне кнігі «Помнік атручаным людзям». У ім ёсць тое, пра што баяцца пісаць маладыя аўтары: шэраг актуальных і складаных псіхалагічных праблемаў, якія сёння, у часы глабалізацыі, датычацца многіх з нас. Твор мае прадуманую стройную кампазіцыю (апавяданне ў апавяданні вельмі граматна ўведзена ў тэкст), глыбіню і завершанасць. Сяргей Календа — удумлівы малады творца, які піша для такіх жа, як ён: разумных людзей, якія імкнуцца ператвараць рэчаіснасць. Так, як ім (нам) яна бачыцца.

МІЖРАДКОЎЕ

# КОД ПРАЎДЫ

Алег АБЛАЖЭЙ

* * *

У мастацтве свае памылкі даражэй крадзенай праўды.

* * *

Мастацтва Ван-Гога дзейнічае не майстэрствам, а энергіяй пакуты.

* * *

Душа і цела — пара каханкаў, што пастаянна здраджваюць адно другому.

Аж да расставання...

* * *

У якіх адзінках вымяраецца «глыбіня веры»?

* * *

Як цяжка змірыцца, што для кагось, хто цікавы табе, нецікавым з'яўляешся якраз ты...

* * *

Некаторыя паэты пад канец жыцця робяцца лішнім і недарэчным прылепкам да сваіх колішніх твораў.

* * *

Калі Бог бяздзейнічае, ягоную працу трэба рабіць самому.

* * *

Форма і змест — як жа па-рознаму можна сказаць: «Дурны ты»!

* * *

Сэкс: такая страва, у якой найважнейшае — гарнір.

* * *

Самы вынаходлівы будаўнік — беднасць. Яна здольная будаваць непераадольныя сцэны з нічога.

* * *

Народ не творыць песні.

Народ іх падхоплівае.

* * *

Часам так хочацца прыдушыць маральна бездакорную асобу...

* * *

Стылі ў мастацтве не проста паміраюць.

Яны выцясняюцца іншымі.

* * *

У мастацтве адвага без умення — проста нахабства.

* * *

Калі б паэты былі ў жыцці такімі, якімі іх падаюць школьныя хрэстаматыі, яны б не напісалі ні радка.

* * *

Ісці насуперак ворагам — яшчэ не самае цяжкае.

Самае цяжкае — рабіць не так, як бы гэтага хацелі людзі, што цябе любяць.

* * *

Дэградацыя пачынаецца са страты цікаўнасці.

* * *

Рэдка ствараюць штосць сапраўды вялікае людзі з бездакорным густам.

* * *

Жанчына, якая не ўмее апранацца, не ўмее й распранууцца.

* * *

Утопіі — ваўкі ў авечай скуры.

* * *

«Шчыльнымі радамі» ходзяць у войску і падчас рэвалюцый.

Нармальнае жыццё нагадвае «броўнаўскі рух».

* * *

Мастацтва патрабуе ахвяраў ад творцы, а не ад гледача.

* * *

Прыгажосць ёсць код Праўды.

* * *

Нават самыя аб'ёмістыя веды не заменяць здольнасці думаць.

* * *

Даўно пара зразумець, што абсурд — норма жыцця.

Усё астатняе толькі шчаслівыя выключэнні.

* * *

Жыць у гармоніі са сваім узростам — як апранацца адпаведна пары года.

* * *

Не бывае дэградацыі мастацтва без дэградацыі мастакоў.

* * *

Зразумець лягчэй, чым прымірыцца.

* * *

Таму, хто заблукаў, істотны не пошук новых дарог, а выхад на правільную.

* * *

З'явілася катэгорыя людзей, якія маюць усё, але якіх не цешыць нічога.

* * *

Якія таямніцы — нізасць вялікіх... і вялікасць малых...

* * *

Відушчыя правадыры надта любяць тых, хто слепа верыць.

* * *

У сапраўднага мастака рукі мудрэйшыя за галаву.

* * *

Як жа многа такіх, што глядзяць — і не бачаць...

* * *

Чым большая вяршыня, тым большая самота.

2007–2010

ПРАЎДАШУКАЛЬНІКІ

# У ПАПЯРОВЫМ ЦАРСТВЕ УЛАДЗІМІРА СОДАЛЯ

**Сёлетняй вясной мы святкуем падвойны юбілей класіка беларускай літаратуры Францішка БАГУШЭВІЧА: 21 сакавіка — 170 гадоў з дня нараджэння, 28 красавіка — 110 гадоў з дня смерці.**



Каля «Багушэвічавых слоў» перад уваходам у Нацыянальную бібліятэку.

## «Я буду прэзідэнтам!»

«Ася, найперш я ў вас вазьму інтэрв'ю! — сустрэў мяне ля Нацыянальнай бібліятэкі Уладзімір Содаль, краязнаўца, даследчык жыццёвага і творчага лёсу Францішка Багушэвіча. — Якія словы з напісаных на фасадзе бібліятэкі Вам запомніліся?..»

«Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!» — кажу я, здагадаўшыся, што хоча пачуць ад мяне мой суразмоўца.

«Так! — усміхаецца Уладзімір Ільіч і дадае: — Я жыву побач з бібліятэкай. Часта бываю ў ёй. Яе і збудавалі на маім агародзе. Выходжу зморaны пасля доўгага чытання, спыняюся каля фасаду з цытатамі дыназіраю, ці зважаюць людзі на іх. Калі не, дык падыходжу, бывае, і пытаюся, што з напісанага запомнілася...»

Паколькі на дварэ прахалодна, заходзім у бібліятэку — адну з нямногіх мясцін у Мінску, што носіць Багушэвічаў дух. Уладзімір Ільіч расчыняе сваю даследніцкую валізку, у якой чаго толькі няма: безліч тэчак са спісанымі паперамі, газетамі, рукапісы, аж тры факсімільныя выданні «Дудкі беларускай» Францішка Багушэвіча, старонкі якіх — у аўтографах людзей, з якімі сустракаўся літаратар і краязнаўца, паміж старонак зборнікаў — лісты з занатоўкамі, імёнамі, адрасамі, фотаздымкі, зноў газетныя выразкі... Багушэвічаву «Дудку» даследчык паўсюль носіць з сабой.

Размова адразу зайшла пра ўнукаў Уладзіміра Содаля, якіх у яго чатыры. І ўсе — хлопцы. Малодшы, Максімка, яшчэ ходзіць у школу. Калі прыязджае ў госці да бабулі з дзядулем, заўжды просіць, каб дзядуля не нахіляўся. «Я сам падыму», — бяжыць дапамагаць дзядулю Максім.

Кастусь — прадпрымальнік. Алесь займаўся футболам у інстытуце, але скалечыўся і цяпер адхілены ад заняткаў. А Сержык — студэнт-першакурснік. Яшчэ вучнем выдаў аж тры кнігі. Першая — «Святло маёй крынічкі — з жыцця хлопчыка Сяргейкі і яго дзядулі Уладзі...». Другая, «Кветка мая Беларусь», што выйшла ў серыі «Беларускі кнігазбор», утрымлівае вершы, кароткую прозу. Пра трэцюю сама назва гаворыць: «Анекдоцік у роцік». Уладзімір Ільіч згадаў такі выпадак: ягоны зяць Мікола атрымаў ладны першы заробак і прынёс грошы ў скрыні з-пад абутку, Сержык абклаўся грашыма, падкідваў іх і казаў: «Я буду прэзідэнтам!» І, можа, гэта калі-небудзь здарыцца. А пакуль што ён асвойвае дзяржаўную тэматыку: у школьныя гады, вучнем дзевятага класа, напісаў працу па гісторыі «Станаўленне беларускай дзяржаўнасці», а сёлета напісаў курсавы рэферат «Беларуская Народная Рэспубліка». Уладзімір Содаль вельмі ганарыцца Сержыкам. Што зразумела.

## «Ці мог я быць іншым?..»

Размова пра Францішка Багушэвіча пачалася з... Янкі Купалы.

Уладзімір СОДАЛЬ:

— Калі я быў малады, у мяне было вялікае жаданне сустрэцца з пакаленнем людзей мінулага, нават канца XIX стагоддзя. Была страшэнная прага спазнаць эпоху не праз кнігі, а праз людзей, сведкаў таго часу. Таму я вандраваў па Купалавых мясцінах, сустракаўся з Паўлінай Мядзёлкай, першай выканаўцай ролі Паўлінкі, ад якой пачуў шмат цікавага пра Янку Купалу. Гэтымі днямі ў Мінску экспанавалася Купалава машына «Шэўрале». І там мне згадалася гісторыя, якую распавяла мне Паўліна Мядзёлка: Янка Купала, гнаны з Мінску пажарам ды бомбамі, ляцеў на гэтай машыне ў Маскву, дзе акурат была Паўліна. Прыехаў зморaны, змэнчаны з дарогі. А Паўліна кажа яму: «Яначка, што ж ты, дарагі мой Яначка, матулю не забраў з Мінску, пакінуў нямецкім акупантам?.. А што ж ты архіў свой не ўкінуў у багажнік?». Янка нічога на гэта не сказаў, толькі перасмыкнуўся вялікім болем... Калі я аглядаў тое «Шэўрале» Янкі Купалы, у мяне гэтыя думкі круціліся ўвесь час, я падыходзіў да таго багажніка, прыкідваў, што ў яго можна было ўкінуць. Калі не ўсё, то хоць частку архіву!..

Па сутнасці, з жадання спазнаць эпоху не праз кнігі, а праз расповеды людзей старэйшага пакалення і пачынаецца мая даследніцкая праца. А даследчык як следчы — гэта вельмі блізкія прафесіі. Я мяркую, калі б Францішак Багушэвіч пражыў болей, у яго назбіралася б безліч следчых сюжэтаў, але ж Бог не даў...

За Францішкам Багушэвічам стала замацавалася шмат вызначальных эпітэтаў: празорца, прарок, прадвеснік, праўдашукальнік. Паэт Рыгор Семашкевіч слушна азваўся пра Багушэвіча: «На ўсю Беларусь мільён пракурораў і толькі адзін, толькі ён адвакат». Сам сябе Францішак Багушэвіч называў сынам надзеі, чалавекам, які не ў сваю эпоху нарадзіўся.

Калі я пачаў вывучаць біяграфію Багушэвіча, калі чытаў, у якіх гістарычных абставінах ён нарадзіўся і гадаваўся (у 1840 годзе Мікалай I скасаваў дзеянне Статута 1588 г. ды забараніў выкарыстоўваць назоў «Беларусь» і беларускую мову), я зразумеў, што няма больш яркага прыкладу адраджэнца, чым Францішак Багушэвіч... Недарэмна ён напісаў: «Як я толькі нарадзіўся — // Бацька сказаў: «Кепска будзе!» // Ну дык жа ж не памыліўся: // Здзекаваліся Бог і людзі...»

Да мяне спазнанне свету прыйшло праз абразы, здзекі. Чым больш я чуў абразаў, тым больш я, малое дзіця, гартаваўся. Прыязджалі, напрыклад, людзі з Масквы і фыркалі: «Што гэта ў вас за мова такая?..». А мне яна была наймілейшая. На ёй гаварылі мае бабулі, дзядулі, яна ласкавая, пяшчотная, і я дзівіўся, што ў людзей, якія кажуць такое пра маю родную мову, такія агрубелыя душы. Той жа Максім Багдановіч, выхаваны ў рускай атмасферы, выдзьмухваў беларускія словы як вугельчыкі з попелу, каб разгарацца жар сапраўднае паэзіі. Ці мог я быць іншым? Ці можаш ты пасля гэтага быць іншай?..

## «А ў гэтым годзе — цішыня...»

— Я спадзяваўся, што гэты год падвойнага юбілею Францішка Багушэвіча будзе абвешчаны годам роднае мовы. Але гэтага, як ні дзіўна, не сталася. Больш за тое, ранейшыя дні народзінаў Багушэвіча: 160, 165 гадоў адзначаліся на дзяржаўным узроўні, у гэтым годзе — цішыня і спакой. Але засталіся яшчэ сумленныя людзі, якія ладзяць вечарыны ў гонар Францішка Багушэвіча. Гэтымі днямі ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва адкрылася выдатная выстава, прысвечаная Багушэвічу. Не забылася на юбілей Багушэвіча і Нацыянальная бібліятэка, дзе мы з табой зараз знаходзімся. Яны выдалі кампакт-дыск «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай...»

(Дыск «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай...», выдадзены Нацыянальнай бібліятэкай да 170-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча, акрамя біяграфічнага нарысу за аўтарствам Уладзіміра Содаля, бібліяграфіі твораў класіка ды публікацый пра жыццё і творчасць пісьменніка, утрымлівае шмат унікальнай інфармацыі: адсканаваныя кнігі Багушэвіча (у тым ліку і «Дудка беларуская», што выйшла ў Кракаве ў 1891 годзе), раздзел «Ф. Багушэвіч у мастацкай літаратуры і мастацтве» утрымлівае не толькі эсэ, вершы, артыкулы як класікаў беларускай літаратуры, так і нашых з вамі сучаснікаў, не толькі жывапісныя, графічныя працы, прысвечаныя Багушэвічу, ды фотаздымкі з прыватных архіваў, але і музычныя творы, напісаныя на вершы Францішка Багушэвіча, і нават унікальныя кінавідэаматэрыялы: дакументальны фільм рэжысёра М. А. Жданоўскага, дыяфільм «Праўдашукальнік: жыццёвы і творчы шлях Францішка Бенядзікта Багушэвіча» Уладзіміра Содаля, а таксама перадачу У. Содаля «Роднае слова», прысвечаную Багушэвічу.)

25 сакавіка ў Ашмянскім краязнаўчым музеі імя Ф.Багушэвіча была праведзеная канферэнцыя, прысвечаная пісьменніку. Я падрыхтаваў даклад «П'ер Беранжэ ў Кушлянах». Ты ведаеш, чаму французскі паэт — у Кушлянах? У Францішка Багушэвіча быў культ французскай мовы. Нездарма ж ён у прадмове да зборніка «Дудка беларуская» пісаў: «Я сам калісь думаў, што мова наша — «мужыцкая» мова і толькі таго! Але, паздароў Божа добрых людцоў, як навучылі мяне чытаць-пісаць, з той пары я шмат дзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў: і пераканаўся, што мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская альбо нямецкая, альбо і іншая якая».

А неўзабаве, 22 траўня, мяркуецца свята ў Кушлянах у гонар Францішка Багушэвіча. Вось, бадай, і ўсё, што ладзіцца з нагоды юбілея класіка. А гэта такі зручны момант, каб узрушыць грамаду, схіліць, павярнуць яе да нашае мовы!..

## «Як жыць — дык жыць для Беларусі!»

Наша размова адбывалася ў дзень рэспубліканскага суботніка. У бібліятэцы праводзіліся экскурсіі для школьнікаў, якія напаўнялі будынак тлумам, таму мы з Уладзімірам Ільічом пайшлі ў ягонае «папяровае царства». Па дарозе даследчык раскрыў сэнс псеўданімаў Францішка Багушэвіча «Сымон Рэўка з-пад Барысава» ды «Мацей Бурачок»:

— Францішак Багушэвіч родам з-пад Вільні, але гэтае ўдакладненне, «з-пад Вільні», ужо заняў Кастусь Каліноўскі: «Яська-гаспадар з-пад Вільні». І Багушэвіч бярэ «Сымон Рэўка з-пад Барысава». Чаму з-пад Барысава? Ды таму, што пад Барысавам, на Лагойшчыне, жыў выдатны чалавек — граф Тышкевіч, які заснаваў у Вільні музей старажытнасці, у стварэнні якога браў удзел і Багушэвіч. А чаму Бурачок? Бо буракі абнаўляюць кроў, а Багушэвіч абнаўляў кроў нацыі... А Мацей — святы.

Сустрэла нас гаспадыня Уладзіміра Содаля, спадарыня Клара, добрая, спагадлівая жанчына. «Дзяўчына спужаецца!» — пажартавала яна, калі Уладзімір Ільіч запрасіў мяне ў сваё «папяровае царства». «Дык яна і хоча напалохацца!» — сказаў спадар Уладзімір.

Сапраўды — царства. Пакой, запоўнены тэчкамі, газетамі, кнігамі, слоўнікамі, партрэтамі Багушэвіча, жартам называюць «Багушэвічавым пакойчыкам». Уладзімір Содаль адшукаў тэчку з рукапісам кнігі «Даследніцкія дэтэктывы», якая рыхтуецца цяпер да выхаду, і мы пачалі вандроўку па захапляльных гісторыях, што надараліся ў даследніцкім лёсе спадара Уладзіміра. Усе яны так ці іначай звязаныя з Францішкам Багушэвічам. Я гартаю пажаўцелыя лісты з тэкстам, набраным на машынцы, а Уладзімір Содаль прыгадвае неверагодныя дэтэктыўныя гісторыі...

— Неяк вяртаўся я з бібліятэкі дадому, падыходжу да ўваходу ў метро, гляджу — ляжыць проста на зямлі звычайная капэрта, патаптаная, з адбіткамі ад абутку, ідуць і ідуць людзі, не зважаючы на тую капэрту. Я думаў прамінуць, але нейкі голас сказаў мне: «Падымі, Валодзя». Я паслухаўся таго голасу, падняў тую капэрту. Ні марак няма, ні цыдулкі якой — нічога. А ўнутры — паўмільёна! Я гэтыя грошы ўклаў у выданне маёй новай «багушэвічаўскай» кнігі «Бласлаўлёныя Кушляны». Ці вось яшчэ містычная гісторыя: у лістападзе 2000 года пазваніла ў кватэрны званок. Адчыняю — стаіць суседка Тацццяна, працягвае мне дзве капэрты і кажа: «Хадзіла да сяброўкі ў суседні дом, на падваконні вось гэтыя лісты ляжалі, зірнула — а там вашае прозвішча, вось і прынесла іх вам». Я падзякаваў, лісты ўзяў, пагледзеў на капэрты і аж жахнуўся: адзін — ад дзядзькі Міхала Ляпехі з Багушэвічавых Кушлянаў, другі — ад кераміста Станіслава Адамовіча. Абодва яны ўжо пайшлі на той свет... Гляджу на даты: ад Міхала ліст датаваны 1983 годам, ліст Станіслава — аж 1977! Хіба не дзіва? Дваццаць тры гады праляжалі мае лісты ў суседнім пад'ездзе...

(Як тыя лісты ўцалелі, ды безліч не менш цікавых містычных гісторый, што надараліся з Уладзімірам Содалем — чытайце ў новай кнізе даследчыка, якая пабачыць свет, як толькі краязнаўца назбірае грошай на ейнае выданне...)

«Ідзіце падмацуйцеся!» — паклікала нас спадарыня Клара. Толькі я сабралася адмовіцца ды сказаць, што пабягу пісаць артыкул, як гаспадыня сказала: «Ад мяне галодным ніхто не сыходзіць!..»

«Заўтра пойдзем на выбары, на бюлетэні напішу словы Ларысы Геніюш: «Як жыць — дык жыць для Беларусі!» — сказаў мне на развітанне Уладзімір Содаль.

**Ася ПАПЛАЎСКАЯ**

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 7 МАЯ, ПЯТНІЦА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**09.55** Меладраматычны серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**10.50** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**11.40** Відэафільм АТН цыклу «Усё гэта было». Фільм 4-ы.
**11.50** Дзелавое жыццё.
**12.10** Прэм'ера. Вострасюжэтная ваенная драма «Саракапятка» (Расія).
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Мінск. Таемная вайна» («Белвідэацэнтр»).
**14.30** Хранікальна-дакументальны фільм «Рыгор Яўсейчык» цыклу «Вялікай Перамогі Салдаты» (Беларускае тэлебачанне).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Зброя Перамогі. Гарадзеншчына».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Развод і дзявоцкае прозвішча» (Расія). 3-я серыя.
**16.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.05** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыў «Замах» (Беларусь - Расія). 5- я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Відэафільм АТН цыклу «Усё гэта было». Фільм 5-ы.
**22.05** Дэтэктыў «Замах» (Беларусь - Расія). 6- я серыя.
**23.10** Кінааповесць «Альпійская балада» («Беларусьфільм»).
**00.50** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**10.00** «Катоўскі». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.35** Драма «К-19».
**02.00** Нашы навіны.
**02.15** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Маладзевы серыял.
**15.40** «Водбліскі». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтэрас».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Экстрэмальнае спатканне». ЗША, 2004 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** Фільм «Трывіяльнае чытво». ЗША, 1997 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Час футболу.
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Жансавет.
**10.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.10** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**12.05** Ваенная драма «Глыбокая плынь» («Беларусьфільм»).
**13.45** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Подзвіг выведнікаў» («Беларусьфільм»).
**14.20** Кінаспробы.
**14.35** Культасвет.
**15.05** Свая музыка. Працяг.
**15.35** Прыгодніцкі серыял «Чалавек вайны» (Расія). Заключная серыя.
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**19.45** Калыханка.
**20.05** Бітва экстрасэнсаў.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. ЗША-Германія. Прамая трансляцыя.
**23.30** Пра мастацтва.
**23.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Шахцёр (Салігорск)-Дынама (Мінск).
**01.45** Тэлепорт.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.25** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.20** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны-Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**15.15** Тэлесерыял «Калі растаў снег». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны-Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны-Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Калі растаў снег». Расія, 2009 г.
**22.20** Навіны-Беларусь.
**22.30** Фільм «Жанчына, не схільная да авантур». Расія, 2008 г.
**00.30** Фільм «Тарпеданосцы».
**01.30** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Следства вялі…».
**09.25** «Асоба небяспечны!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.05** «І зноў добры дзень!».
**11.55** «Алтар Перамогі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.05** «Выратавальнікі».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Ваенна-гістарычная драма «Неба ў агні».
**21.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны дэтэктыў «Адзіночка».
**23.35** Вострасюжэтны серыял «Афганская здань».

### EUROSPORT

**09.30** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**10.00** Веласпорт. Тур Фландрыі. Бельгія.
**11.15** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**11.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Прэзентацыя каманд.
**12.00** Веласпорт. Велагонка Парыж - Рубэ. Францыя.
**13.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**15.30** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). 1/4 фіналу.
**17.00** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). 1/2 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). 1/2 фіналу.
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Лапландыя (Фінляндыя).
**22.00** Бокс. Bigger s Better. Масква (Расія).
**00.00** Боўлінг. РВА. ЗША. Часопіс.
**01.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**01.10** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**01.30** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**01.45** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**02.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Прэзентацыя каманд.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.20** Форум (ток-шоу): «Беларускія альфонсы: адкуль яны?»
**19.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Еўразвяз і правы дзяцей».
**19.20** Мультсерыял.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.05** Дакументальная гадзіна: «Усё выдатна», дак. фільм, ч. 1.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне) .
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** Невядомая Беларусь: «Свіцязь, горад на дне возера», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**22.05** «Наўцёкі», маст. фільм, 1994 г., ЗША.
**23.55** Аб'ектыў.

## 8 МАЯ, СУБОТА

### 1

**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**10.35** Шпілька.
**11.10** Ранішняя хваля.
**11.45** Відэафільм АТН цыклу «Усё гэта было». Фільм 5-ы.
**12.10** Кінааповесць «Ляцяць жураўлі» (СССР).



**13.50** Вакол планеты.
**14.30** Відэафільм АТН «Захоўваць вечна». Фільм 1-ы.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Прэм'ера. Дакументальны цыкл «Вялікая вайна» (Расія - Украіна). Фільм «Курская дуга».
**16.20** Ваенная драма «На шляху ў Берлін» (СССР).
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «OFF STAGE LIFE».
**19.45** Відэафільм АТН «Пастаўскія фарбы» цыклу «Зямля беларуская».
**19.55** Дэтэктыў «Замах» (Беларусь - Расія). 7- я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.40** Урачысты сход і святочны канцэрт, прысвечаныя 65-м Угодкам Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.
**23.20** Ваенная драма «Першы пасля Бога» (Расія).
**01.05** Уласнай персонай.

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Фільм «Нармандыя-Нёман».
**11.15** Прэм'ера. «Мы за правую справу дзерліся, камрад».
**12.15** АНТ прадстаўляе: Тэлечасопіс «Звяз».
**12.45** «Кінаметры вайны».
**13.15** «Зямля, да запатрабавання». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера АНТ: «Гарады-героі. Брэсцкая крэпасць».
**17.10** Прэм'ера. «Песні Перамогі».
**19.00** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.55** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05-00.55** «Зніклыя». Шматсерыйны фільм.

### СТВ

**06.00** Фільм «Доўгія вёрсты вайны». СССР, 1975 г.
**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**12.00** Фільм «У чэрвені 1941». Расія, 2008 г.
**15.50** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45** Фільм «Радзіма або смерць». Расія, 2007 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.25** Фільм «Снайпер: зброя адплаты». Расія - Беларусь, 2009 г.
**23.25** Фільм «Кадэт». Беларусь, 2009 г.
**01.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**06.55** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.20** Усё аб бяспецы.
**07.50** Тэлепорт.
**08.15** Нашы тэсты.
**08.50** Жансавет.
**09.30** Свая кампанія.
**10.20** «Лабірынты: сэрца змроку».
**10.50** «Запал па культуры».
**11.35** Кінаспробы.
**12.00** Маналогі аб вайне.
**12.05** Ваенна-прыгодніцкі фільм «Шчыт і меч» (СССР). 1-я, 2-я, 3-я, 4-я, заключная серыі.
**18.20** Экспедыцыя.
**19.00** «Зорка». Гала-канцэрт.
**20.30** Маналогі аб вайне.
**20.40** Дакументальны фільм «Лінія жыцця. Лекары вайны» (Беларусь).
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя - Латвія. Прамая трансляцыя.
**23.30** Кінааповесць «Лёс чалавека» (СССР).



### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Патройная праверка».
**08.40** Фільм «Тарпеданосцы».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** Фільм «Дзень Перамогі».
**12.40** Святочны канцэрт.
**14.00** Весткі.
**14.15** Прэм'ера. «Расія супраць Гітлера. Непакорная мяжа». Гарады воінскай славы. Уладзікаўказ.
**14.45** «Суботні вечар».
**16.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Другія». Расія, 2009 г.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** Прэм'ера. Тэлесерыял «Другія». Расія, 2009 г. Працяг.
**23.55** Фільм «Дарагі мой чалавек».
**01.45** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.30** «Вялікая Айчынная: Падзенне Берліна. Перамога».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** Серыял «Каця».
**16.00** Сёння.
**16.20** Ваенная драма «Каця».
**19.00** Сёння.
**19.30** Прэм'ера. Ваенна-гістарычная драма «Неба ў агні».
**21.35** Ваенная драма «У жніўні 44-га…».
**23.35** Ваенная драма «Супраціў».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**10.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Прэзентацыя каманд.
**10.15** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). 1/2 фіналу.
**12.00** Веласпорт. Велагонка Льеж-Бастон-Льеж. Бельгія.
**13.00** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**13.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Прэзентацыя каманд.
**13.45** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). 1/2 фіналу.
**15.45** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**16.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Прэзентацыя каманд.
**16.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Амстэрдам. Этап 1.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). Фінал.
**20.45** Конны спорт. Турнір Global Champions. Валенсія (Іспанія).
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Collizion Харватыя/Klash 10th Anniversary.
**01.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Амстэрдам. Этап 1.
**02.00** Тэніс. Турнір WTA. Рым (Італія). Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.05** Аблічча таталітарызму: «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., Германія: 4 серыя, «Літва».
**19.00** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.35** Мультсерыял.
**19.45** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.15** Басаном па свеце (спазнаваўчая праграма).
**20.40** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Чалавек прэзідэнта», палітычны баявік, 2002 г., ЗША. ч. 2.
**22.40** Аб'ектыў.

## 9 МАЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.35** Канцэрт.
**08.50** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята 9 мая і дзень Георгія Пераможца.
**09.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.15** «Арсенал».
**09.40** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**10.10** Лірычная драма «Балада аб салдаце» (СССР).
**11.55** Ваенны парад і спартова-моладзевае шэсце, прысвечаныя 65-м угодкам Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.
**14.00** «Футбол. Ліга чэмпіёнаў». Відэачасопіс.
**14.30** Відэафільм АТН «Захоўваць вечна». Фільм 2-і.
**15.25** Прэм'ера. Дакументальны цыкл «Вялікая вайна» (Расія - Украіна). Фільм «Аперацыя «Баграціён».
**16.20** Кінааповесць «Беларускі вакзал» (СССР).
**18.30** Суперлато.
**19.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.50** «КЕНО».
**20.00** «У цэнтры ўвагі».
**21.00** Ваенны парад і спартова-моладзевае шэсце, прысвечаныя 65-м угодкам Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.
**22.00** Дэтэктыў «Замах» (Беларусь - Расія). 8- я, заключная, серыя.
**22.40** Ваенная драма «Дажыць да світання» (СССР).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Бацька салдата». Мастацкі фільм.
**11.00** АНТ прадстаўляе: «Праўнукі вайны». Канцэрт.
**11.55** Ваенны парад і спартова-моладзевае шэсце, прысвечаныя 65-м угодкам Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.
**14.00** «Песні Перамогі».
**14.30** «У бой ідуць адны «старыя». Ваенная драма.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Прэм'ера АНТ: «Гарады-героі. Кіеў».
**17.00** АНТ прадстаўляе: «Песні Перамогі».
**17.55** Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму. Хвіліна маўчання.
**18.00** Нашы навіны.
**18.20** Ваенная драма «Рыярыта».
**20.00** Контуры.
**21.00** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.30** Прэм'ера. Фільм «Смуга».
**23.55** Святочны канцэрт, прысвечаны 65-м угодкам Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

**06.30** «Дажыць да Перамогі!» Дакументальны фільм СТБ.
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Аўтапанарама».
**08.05** «Добры дзень, доктар!».
**08.35** «Вялікі сняданак».
**09.10** Фільм «Хроніка пікуючага бамбавіка». СССР, 1967 г.
**10.30** «24 гадзіны».
**10.50** Фільм « Трэцяга не дадзена» Расія-Украіна, 2009 г. 1 серыя.
**11.55** Ваенны парад і спартова-моладзевае шэсце, прысвечаныя 65-м угодкам Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Прамая трансляцыя.
**13.45** «24 гадзіны».
**14.00** Фільм « Трэцяга не дадзена» Расія-Украіна, 2009 г. Заключныя серыі.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Фільм «Дняпроўская мяжа». Беларусь, 2009 г.
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**18.00** Фільм «Дняпроўская мяжа». Беларусь, 2009 г.
**19.30** «Тыдзень».
**21.00** СТБ прадстаўляе: «Святочны канцэрт, прысвечаны 65-годдзю Вялікай Перамогі».
**23.30** «24 гадзіны».
**23.55** Фільм «Сыны сыходзяць у бой». СССР, 1969 г.

**07.40** Дабравест.
**08.05** Мір вашай хаце.
**08.15** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.40** Кінааповесць «Лёс чалавека» (СССР).
**10.15** Школа рамонту.
**11.10** Медычныя таямніцы.
**11.45** Маналогі аб вайне.
**11.55** Ваенны парад і спартова-моладзевае шэсце, прысвечаныя 65-м угодкам Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.
**14.05** «Правы чалавека».
**14.20** Гаспадар.
**14.50** Прэм'ера. Ваенная драма «Рабінавы вальс» (Расія).
**16.30** Дакументальны фільм «Выпускны на мінным полі» (Расія).
**17.00** Маналогі аб вайне.
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Беларусь-Казахстан. Прамая трансляцыя.
**19.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Матч апошняга тура.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія-Расія. Прамая трансляцыя.
**23.30** Тэлебарометр.
**23.50** Ваенная драма «Тарпеданосцы» (СССР).

**07.00** Фільм «Дарагі мой чалавек».
**09.00** Масква. Ваенны парад, прысвечаны 65-м угодкам перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945гг.
**10.20** Фэст «Спаская вежа».
**11.40** «Ваенныя песні». Канцэрт.
**12.40** Фільм «А світанкі тут ціхія... «.
**13.50** Навіны-Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «А світанкі тут ціхія...». Працяг.
**16.50** Навіны-Беларусь.
**17.00** «Парад зорак». Святочны выпуск.
**17.55** «Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму». Хвіліна маўчання.
**18.00** Прэм'ера. «Урок гісторыі». Дакументальны фільм.
**18.50** Навіны-Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Ваенна-патрыятычны фільм «Смяротная сутычка». Расія, 2010 г.
**22.45** Навіны-Беларусь.
**22.55** Святочны канцэрт, прысвечаны 65-м угодкам перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.
**01.10** Фільм «Дом, у якім я жыву».
**02.45** Заканчэнне эфіру.

**06.40** Гераічная кінааповесць «У небе «Начныя ведзьмы»».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Алтар Перамогі».
**10.00** Сёння.
**10.20** Ваенная драма «Зорка».
**12.05** «І зноў добры дзень!».
**13.00** Сёння.
**13.20** Ваенная драма «Кацця».
**16.00** Сёння.
**16.15** Ваенная драма «Кацця».
**17.55** Светлай памяці загінулых у барацьбе. Хвіліна маўчання.
**18.00** Ваенная драма «Кацця».
**19.00** Сёння.
**19.30** Прэм'ера. Ваенна-гістарычная драма «Неба ў агні».
**21.35** Баявік «Прыступіць да ліквідацыі».
**00.00** Ваенная драма «Ворагі».
**01.20** «Авіятары».

**09.30** Аўтаспорт. Гонкі Ле-Ман. Ле-Кастэйе (Францыя). Агляд.
**10.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Суперпоул. Монца (Італія).
**11.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Амстэрдам. Нідэрланды. Этап 1.
**12.15** Аўтаспорт. Гонкі Ле-Ман. 1000 км. Спа-Франкашам (Бельгія).
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Монца (Італія). Заезд 1.
**14.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Монца (Італія).
**14.15** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Монца (Італія).
**15.00** Аўтаспорт. Гонкі Ле-Ман. 1000 км. Спа-Франкашам (Бельгія).
**16.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Амстэрдам-Утрэхт. Нідэрланды. Этап 2.
**18.30** Аўтаспорт. Гонкі Ле-Ман. 1000 км. Спа-Франкашам (Бельгія).
**19.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Монца (Італія). Заезд 2.
**19.45** Матаспартыўны часопіс.
**20.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**22.00** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый. Швецыя.
**23.00** Бокс. ЗША.
**00.05** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Амстэрдам-Утрэхт. Нідэрланды. Этап 2.
**01.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Монца (Італія). Заезд 2.
**02.15** Матаспартыўны часопіс.

**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.30** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.30** «Марш вызвалянікаў», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**19.30** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь: ч. 4.
**20.00** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**20.30** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Фільматэка майстроў: «Жэлары», маст. фільм, 2003 г., Чэхія–Славакія–Аўстрыя.
**23.50** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Пры афармленні падпіскі будзьце ўважлівымі: 1 мая змяніўся наш рахунак у банку. Нумар рахунку: 3012741108019. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы пераvод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 764

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Кассир Пеня ________ Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# МАРА ПЕДАФІЛА

Іван БІЧ

**У чылійскай турме памёр Пауль Шэфер — нацыст, педафіл, заснавальнік сумна вядомай калоніі Дыгнідад.**

Дабрачыннае і адукацыйнае грамадства «Дыгнідад» (ісп. годнасць) — такім была поўная афіцыйная назва нямецкай калоніі ў Чылі, якая існавала з 1961 па 1995 год. Дыгнідад вядомы перш за ўсё па дзвюх прычынах. Хадзілі чуткі, што менавіта тут хаваліся нацысцкія злачынцы, уключна з Марцінам Борманам. Акрамя таго, у 1970–1980 гадах кіраўніцтва калоніі шчыльна супрацоўнічала з Пінpercent. У калоніі дзейнічаў цэнтр катавання апазіцыянераў. Да гэтага часу не высветлена, колькі тут было забіта людзей.

Менш вядома пра структуру арганізацыі жыцця ў Дыгнідад, хаця гэты аспект здаецца вельмі цікавым. Дыгнідад — адзін з самых жудасных сацыяльных эксперыментаў у гісторыі.

Увогуле, сваім з'яўленем Дыгнідад шмат у чым абавязаны землятрусу ў Чылі 1961 года. Пасля катастрофы ў краіне з'явілася так шмат бяздомных дзяцей, што ўрад быў рады ініцыятыве групы грамадзян ФРГ заснаваць на пустым ранча сядзібу, дзе акрамя іншага аказвалася дапамога дзецям — ахвярам катастрофы. Інакш чылійскія чыноўнікі, думаецца, як мінімум запыталі б у амбасадзе ФРГ пра нямецкіх філантропаў і не падтрымалі б іх ініцыятыву. Хаця б па той прычыне, што на заснавальніка праекта «Дыгнідад» Пауля Шэфера на радзіме была заведзена крымінальная справа.

Паўля Шэфера, 1921 года нараджэння, шукалі за педафілію. Гэта быў ужо не першы выпадак, калі былы ветэран СС, вайсковы доктар быў западозраны ў вычварэннях. Адразу пасля вайны ён працаваў у дзіцячым садку пры евангельскай царкве, адкуль яго выгналі за сексуальныя дамаганні да дзяцей. Той выпадак лічыцца пераломным у жыцці Шэфера. Ён быццам бы ўсвядоміў свой грэх, пачаў цікавіцца Бібліяй, заняўся прапагандай біблейскай літаратуры. Ягоныя выступы мелі поспех. Паступова вакол чалавека са шкляным вокам (вока ён страціў яшчэ юнаком, спрабуючы з дапамогай відэльца развязваць шнуркі) склалася групоўка прыхільнікаў. Галоўным чынам гэта былі ўдовы і маці забітых на вайне салдат Вермахту, а таксама выхадцы з занятай Саветамі Усходняй Прусіі.

Аднойчы Шэфер заявіў, што яны ўсе абраныя Богам, і прапанаваў заснаваць нешта накшталт царкоўнай грамады. Умовы сяброўства ў грамадзе былі простыя: штодня хадзіць на споведзь да Шэфера і кожны месяц аддаваць 10 працэнтаў заробку. Здавалася, усё ішло добра, аднак старая хвароба ўзяла верх. Дзве маці паскардзіліся на тое, што іх дзеці сталі ахвярамі сексуальнага гвалту з боку Шэфера. Быў выпісаны ордэр на яго арышт. Аднак прапаведнік паспеў збегчы за мяжу і хутка апынуўся ў Чылі.

Атрымаўшы дазвол на заснаванне калоніі, Шэфер выклікаў з ФРГ першых дзесяць паплечнікаў. А ў 1963 годзе калонія налічвала ўжо 230 чалавек. Пасля былі яшчэ дзве хвалі эмігрантаў з ФРГ. Плюс каланісты бралі да сябе чылійскіх дзяцей, якіх вучылі нямецкай мове. Такім чынам, у калоніі жылі прыкладна 300 чалавек.

Каланісты абавязаны былі ведаць нямецкую мову і насіць уніформу. Апранацца па сучаснай модзе меў права толькі Пауль Шэфер, што падкрэслівала ягоны асаблівы статус.

Усе каланісты былі апантаныя ідэяй асабістага выратавання перад Богам. У сваіх лекцыях Шэфер праводзіў думку пра тое, што кожны чалавек пастаянна становіцца грахоўным. Змыць грэх можна працай і падпарадкаваннем правілам, якія ён прыдумаў.

Уся грамада была падзелена на ўзроставыя групы. Кожная мела свае адзнакі і нават сцяг. Хлопчык, які нараджаўся ў калоніі, праводзіў першыя гады не з бацькамі, а ў спецыяльным дзіцячым садку. У шэсць гадоў яго пераводзілі ў групу «Крыжы», у 15 гадоў — у групу «Армія выратавання». Прыблізна ў 35 гадоў каланіст атрымліваў статус «Стары служка». І, нарэшце, у 50 гадоў яго запісвалі ў катэгорыю «Камэлас» (тэрмін, які не мае дакладнага перакладу або значэння). Падобныя структуры існавалі і для дзяўчынак. На працягу жыцця яны былі сябрамі ўзроставых арганізацый — «Драконы», «Палевікі», «Жаночая група», «Бабулі».

Усе сябры групы жылі разам — па шэсць чалавек у адным пакоі. Дазвалялася мець невялікі набор асабістых рэчаў — піжама, адзенне для адпачынку, ніжняя бялізна. Кожнай раніцай група збіралася на калектыўны сняданак. Адсюль ішлі на працоўныя месцы. Яны працавалі па 12 гадзін на дзень. Увесь заробак ішоў у казну калоніі, якой распараджаўся Шэфер. Акрамя таго, Шэфер нелегальна гандляваў зброяй.





Правадыр асабіста кантраляваў увесь працэс вызвалення ад грахоў. Перш за ўсё шляхам абавязковых для кожнага споведзяў. Здаецца, што тыя споведзі былі адзінай формай камунікацыі. «Калі размаўляюць двое — іх абараняе Ісус. Калі размаўляюць трое — яны пад кантролем д'ябла», — любіў казаць Пауль. Падчас ланчу ён збіраў мужчын калоніі і абвяшчаў, хто з прысутных зрабіў які-небудзь грэх. Той, хто правініўся, павінен быў публічна пакаяцца.

Жаночая сексуальнасць, паводле перакanання Шэфера, паходзіць ад д'ябла. Таму жанчыны жылі асобна ад мужчын. Прымітыўныя, падобныя на мяхі сукенкі, павінны былі хаваць жаночыя формы. Праблемы лібіда вырашаліся за кошт напружанай працы. Калі ж падавіць сексуальныя пачуцці было цяжка, каланіст звяртаўся да правадыра з просьбай даць яму жонку. Пры гэтым выбар Шэфера заўсёды падаў выключна на жанчын, якія ўжо не маглі мець дзіця. Адмоўнае стаўленне Шэфера да нараджэння дзяцей дасюль застаецца загадкай. За ўсю гісторыю ў калоніі нарадзілася ўсяго 60 дзяцей. Пры гэтым з 1975 па 1989 год увогуле не нарадзілася ні адно немаўлятка.

Неяк Шэферу вельмі не спадабалася, што дзеці любяць Санта-Клаўса больш за яго. І ён прыдумаў цікавае рашэнне. Вывеў усіх дзяцей на рэчку сустракаць Санта-Клаўса, а калі той з'явіўся (гэта быў пераапрануты каланіст), забіў яго з пісталета. Цяпер, на думку Пауля, дзеці павінны былі перастаць верыць у дзядулю з белай барадой. Пасля гэтага выпадку ўсе святкаванні ў Дыгнідад былі забароненыя. У календары застаўся толькі адзіны чырвоны дзень — дзень нараджэння Шэфера.

Шэфер стварыў пры сабе інстытут пасыльных — групу маладых хлопчыкаў, якія лічыліся ягонымі вучнямі. Яны таксама аказвалі гаспадару спецыфічныя інтымныя паслугі. Трапіць у спіс пасыльных або ў ахову лагера было вельмі прэстыжна.

На іншым полюсе знаходзіліся так званыя «мяцежнікі» — тыя, хто неяк правініўся перад адміністрацыяй. Яны насілі чырвоныя кашулі — сімвал ганьбы, працавалі да трох гадзін ночы і жылі ў турме пры шпіталі, дзе ім у дадатак давалі розныя псіхатропныя прэпараты. Адзін з мяцежнікаў, які здолеў збегчы з Дыгнідаду, жыў у такіх умовах аж 31 год.

Яшчэ горш было апазіцыянерам, якіх пасля перавароту 1972 года прывозіла ў Дыгнідад ахранка Пінача. Перад тым, як іх забіць, апазіцыянераў катавалі з дапамогай сабак і электрычнага току.

Шэфер увесь час казаў каланістам, што не сёння — заўтра прыйдуць камуністы. Ён нават фальсіфікаваў навіны на тэлебачанні, каб падтрымліваць у лагеры істэрычны стан. Каланісты час ад часу выводзіліся на пошукі ў суседніх гарах агента камуністаў, якога быццам бачылі побач.

Цяпер гэта ўсё ў мінулым. Дыгнідад даўно перастаў быць дзяржавай у дзяржаве. Зараз тут спрабуюць развіваць экалагічны турызм. Памёр нарэшце і Шэфер.

Дыгнідад, здаецца, застаўся цікавым толькі для псіхолагаў, якія ахвотна размаўляюць з былымі каланістамі, спрабуючы зразумець, як чалавек можа апраўдаць і дазволіць такі здзек з сябе. Псіхолагі кажуць, што жыццё ў калоніі не было пабудавана выключна на дыктаце. Значна большую ролю адыгрывала эмацыйная сувязь з Шэферам, культ ягонай асобы, страх перад навакольным светам.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

У адказ Лукашэнка цяпер спрабуе біць Расію па самых слабых кропках. Спачатку Беларусь заключае нафтавыя кантракты з Венесуэлай, затым ідзе заява пра тое, што Лукашэнка гатовы пусціць Венесуэлу на перапрацоўчыя заводы на тэрыторыі Беларусі, куды Расія даўно прасілася, але ён не пускаў. Самы яго фантастычны праект — завозіць нафту з Венесуэлы ў Адэсу, а адтуль атрымліваць яе праз трубапровад Адэса—Броды. Пікантнасць сітуацыі ў тым, што нават у «аранжавых» хапіла розуму не выкарыстоўваць гэты трубапровод. Ён нерэнтабельны для пастаўкі нават каспійскай нафты, не кажучы ўжо пра венесуэльскую.

**«Эксперт» (Расія).**

Апошнімі днямі ўсё часцей і часцей даводзіцца сутыкацца з праблемай: нягледзячы на ўсё больш гучныя заявы і ўсё больш гучныя «справы» Лукашэнкі, з дапамогай аналітыкі як жанру іх аналізаваць немагчыма. Замест сур'ёзных спраў, учынкаў ці заяў даводзіцца аналізаваць нейкі падтэкст, які ўсё больш і больш пачынае аваладваць прасторай легальнага палітычнага дыскурсу. Красавік у гэтым сэнсе стаў папросту феерычным месяцам, асабліва ў плане працы беларускага тэлебачання: такой, мякка кажучы, «плыні свядомасці» на адрас Расіі і расійскага кіраўніцтва яшчэ не было. У гэтым выпадку цалкам дарэчная старая як свет прымаўка: «Пазбаў нас Бог ад такіх сяброў, а з ворагамі мы як-небудзь разбярэмся». Істэрыя на беларускім тэлебачанні адназначна кажа пра тое, якія настроі цяпер пануюць у Чырвоным доме.

**«Регнум» (Расія)**

Чаго дакладна хоча Лукашэнка ад АДКБ, пакуль зразумець складана. Але калі ён вінавацiць арганізацыю ў тым, што яна так і не ўмяшалася ў кіргізскія справы, можна выказаць версію. Наўрад ці гэта імкненне вярнуць Бакіева ў Бішкек. Верагодна, усё гэта трэба Лукашэнку, каб выбіць для сябе гарантыі бяспекі ўжо цяпер. На ўсялякі выпадак. Прыклад Бакіева штурхае яго да стварэння нейкага міждзяржаўнага механізму ўтрымання ўлады. З дапамогай блокавай салідарнасці. Таму толькі цяпер становіцца зразумелым, навошта Лукашэнку спатрэбіўся разгублены Бакіеў. Была б нагода, а дэмарш знойдзецца. Украіне, каб зразумець, што значыць для яе Расія, трэба было прайсці праз Ючшанку. Ці не гэты перыяд свецiць цяпер Беларусі?

**«Голос России» (Расія)**

Сярод экспертаў існуе і меркаванне: усё, што адбываецца, — знак таго, што Лукашэнка папросту губляе магчымасць разважаць разумна і стрымана. Стварыўшы нафтавы афшор, Расія паставіла Лукашэнку ў складаную сітуацыю, ён бачыць магчымых эканамічных праблем і сацыяльных выбухаў, і ў яго папросту здаюць нервы, маркуюць эксперты. Гэта асабліва дзіўна, бо рэальнай пагрозы рэжыму Лукашэнкі, нават з магчымай падтрымкай звонку, эксперты не бачаць. Ва ўсякім разе, у найбліжэйшай перспектыве. Нават калі тэарэтычна дапусціць, што Масква захоча паўплываць на змену ўлады ў Беларусі, ёй не будзе на каго зрабіць стаўку, — сцвярджаюць эксперты. Тым не менш, беларускую апазіцыю апошнія падзеі абнадзеілі.

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ



### КІТАЙ. ЭМІГРАНТАМ ДАЗВОЛІЛІ НЕ СУСТРАКАЦЬ ДЭЛЕГАЦЫІ

Пачынаючы з візіту 20 красавіка ў Вашынгтон старшыні КНР і Кампартыі Кітая Ху Цзыньтао, працэдура сустрэчы кіраўнікоў Паднябеснай у замежных аэрапортах значна спрошчаная. Гэтым разам, апроч афіцыйных асобаў, лідэра КНР сустракалі толькі дыпламаты ЗША і амбасадар КНР у ЗША. Між тым, яшчэ нядаўна на падобныя сустрэчы, а таксама на правады кітайскіх лідэраў супрацоўнікі пасольстваў павінны былі выводзіць велізарныя групы кітайцаў, якія навучаюцца за мяжой, і проста эмігрантаў. Апошнія кветкамі і транспарантамі павінны былі засведчыць сваю любоў да гістарычнай радзімы, адданасць яе цяперашнім кіраўнікам. Такая дэмакратызацыя дыпламатычнага этыкету выклікана, па словах намесніка міністра замежных спраў КНР, тым, што прадстаўнікам кітайскай эміграцыі розных краін вельмі нязручна кожны раз выязджаць на падобныя мерапрыемствы ў аэрапорты. Самі эмігранты з радасцю падтрымалі гэту навіну, бо пабачылі ў ёй праяву клопату далёкай радзімы.

**Па матэрыялах «Сіньхуа» (Кітай)**

### РАСІЯ. КОЖНУЮ РАНІЦУ СПЯВАЙ З ГУБЕРНАТАРАМ!



Ніжагародская дзяржаўная рэгіянальная тэлекампанія «Волга» ўвяла змены ў раніШнюю праграму. Зараз штодня кампанія пачынае эфір з трансляцыі гімну Расіі ў выкананні губернатара Валерыя Шанцава і дзіцячага хору. Паралельна дэманструецца дакументальны фільм са сцэнамі з ніжагародскага жыцця. Таксама ідуць субцітры са словамі гімна, так што пры жаданні тутэйшыя жыхары могуць яго праспяваць разам з губернатарам. Валерый Шанцаў даўно ахвотна спявае на сустрэчах з грамадскасцю. Характэрна, што губернатар творча развіваецца: сёлета ён, па яго ж словах, «асвоіў новае амплуа» і нядаўна ўпершыню выступіў з сімфанічным аркестрам. Самыя любімыя ў Шанцава, па яго ўласным прызнанні, песні Уладзіміра Высоцкага і Булата Акуджавы. Грамадскасць, здаецца, не бачыць у спевах Шанцава нічога дурнога: «у кожнага губернатара свой бзік, а песні — гэта яшчэ не самы горшы», — кажа адзін з мясцовых палітолагаў.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### ПЕРУ. ЗАКАХАНЫЯ ТЭРАРЫСТЫ АБВЯСЦІЛІ ГАЛАДОЎКУ



Увесь свет гаворыць пра галадоўку дысідэнтаў на камуністычнай Кубе. Як ні парадаксальна, іх вопыт, здаецца, зацікавіў камуністаў, якія сядзяць у турмах іншых краін. Напрыклад, Абімаэля Гусмана (75 гадоў) — лідэра арганізацыі «Sendero Luminoso» («Светлы Шлях»). У свой час «Sendero Luminoso» была самай актыўнай тэрарыстычнай групоўкай у Лацінскай Амерыцы. На рахунку барацьбітоў за камунізм прыкладна 69 тысяч забітых. У 1992 годзе таварыша Гусмана злавілі, а саму групоўку прыкладна да 2006 года проста знішчылі сілавымі метадамі. Суд прызначыў Гусману пажыццёвы тэрмін. Аднак турма — не перашкода для інтымнага жыцця. Гусман вырашыў заключыць шлюб з Эленай Іпарагірэ, якая таксама сядзіць за кратамі. Дарэчы, іх і арыштавалі ў 1992 годзе разам. Аднак турэмнаму ведамству ідэя вяселля не спадабалася. У адказ Абімаэль і Элена паведамілі пра пачатак бестэрміновай галадоўкі. Былыя лідэры «Sendero Luminoso» кажуць, што ў рот нічога не возьмуць, пакуль ім не дадуць магчымасці хоць перыядычна быць разам.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

МЕРКАВАННЕ

# НЕ ПАДАБАЕЦЦА ПАДАТАК — НЕ ПЛАЦІ!

*Алег НОВІКАЎ*

**У Вялікабрытаніі адсвяткавалі гадавіну самых буйных антыпадатковых пратэстаў у сучаснай гісторыі Альбіёну.**




Галоўным фактарам пратэстаў, якія ўвайшлі ў гісторыю як Poll Tax Revolt, была супярэчлівая падатковая і камунальная палітыка кансерватараў, якія на той час кіравалі краінай. Гэта было ўжо трэцяе прэм'ерства Маргарэт Тэтчэр, і, дарэчы, менавіта правал падатковай рэформы 1990 года зрабіў гэтую кадэнцыю апошняй.

Яшчэ падчас выбарчай кампаніі 1987 года кансерватары прапанавалі ўвесці з 1990-га фінансавага года новы падатак — так званы Poll Tax. Яго ўвядзенне павінна было папоўніць мясцовыя бюджэты, якія вельмі пацярпелі з-за перагляду прынцыпу прагрэсіўнай шкалы падаткаабкладання, адмовы ад датацыяй рэгіёнам з цэнтру. Курс кабінета выклікаў канфлікт паміж урадам і правінцыяй. Перамагла ў той вайне Тэтчэр, якая распусціла Лонданскі савет і саветы яшчэ пяці буйных гарадоў, чым, можна сказаць, абезгаловіла пратэсты.

Хаця фронда была падаўленая, праблема мясцовых бюджэтаў засталася. Так і нарадзілася ідэя падатку Poll Tax, які мусіў плаціць кожны грамадзянін. Разлічваўся новы падатак вельмі складана: фінальная сума залежала ад колькасці асоб, што пражывалі ў доме, і ад кошту самой нерухомасці, якую вызначалі мясцовыя органы.

Ідэя новага падатку выклікала адразу вялікае незадавальненне. Па-першае, відавочна, што сутнасць Poll Tax была ў тым, каб людзі плацілі больш, чым раней. Па-другое, мясцовыя муніцыпалітэты намагаліся рознымі шляхамі павялічыць суму падатку.

Паралельна сфармаваўся грамадзянскі рух праціўнікаў. 25 лістапада 1989 года ў Манчэстэры адбылася ўстаноўчая канферэнцыя Брытанскай федэрацыі неплацельшчыкаў падатку Poll Tax. Дзве тысячы дэлегатаў (сярод іх было 15 дэпутатаў ад лейбарыстаў) галасавалі за правядзенне наступнай вясной нацыянальнай кампаніі за адмену Poll Tax. Старт кампаніі павінен быў даць мітынг на Трафальгарскай плошчы ў цэнтры Лондана, які прызначылі на 31 сакавіка, роўна за тыдзень да ўступлення новых парадкаў у сілу.

На акцыю выйшла каласальная колькасць людзей — каля 200 тысяч чалавек. Акцый падобных маштабаў брытанская сталіца не бачыла, здаецца, з часоў дэманстрацый чартыстаў. Арганізатары аказаліся не ў стане кантраляваць натоўп. Хутка пачаліся сутычкі моладзі з паліцыяй, якая вымушана была адступіць. У выніку распачалося рабаўніцтва буцікаў у цэнтры горада.

Аднак тыя пратэсты (іх назвалі ў прэсе Другая Трафальгарская бітва) былі толькі пралогам. Праз тыдзень усю краіну ахапіла кампанія байкоту падатку. У некаторых раёнах да 30 працэнтаў падаткаплацельшчыкаў ігнаравалі позвы прыйсці і заплаціць Poll Tax. У Лондане 27 працэнтаў жыхароў не заплацілі ў казну ніводнага пені. Па падліках статыстычных ведамстваў, плаціць падатак адмовіліся 18 мільёнаў чалавек.

Ініцыятары кампаніі прыдумалі тры формы ўдзелу ў пратэсце: па-першае, падаткаплацельшчыкаў заклікалі не рэгістравацца, па-другое, аспрэчваць памер падатку ў судзе і тым самым адкладваць плату. Нарэшце, калі суд усё ж зацвярджаў памер падатку, адмаўляцца яго плаціць. Гэта аўтаматычна значыла выклік у суд і пачатак новых судовых слуханняў. Неплацельшчык па закону мог трапіць за краты за ігнараванне лістоў з падатковай. Аднак з-за вялікай колькасці падобных выпадкаў можна было пералічыць на пальцах тых, што ўсё ж трапілі ў турму.

Варта згадаць тут Тэры Філдса, дэпутата парламента ад лейбарыстаў, які за публічную адмову плаціць Poll Tax быў асуджаны на 60 дзён турмы. Гэтая правакацыя ў дадатак каштавала яму сяброўства ў партыі. Аднак гэта было толькі выключэннем. Самі ўлады прызнавалі, што турэмная інфраструктура тэхнічна не здольныя трымаць такую прорву народу. Паліцыя Паўднёвага Йоркшыру нават накіравала ў Скотланд-Ярд ліст, дзе прасіла даць права не арыштоўваць неплацельшчыкаў Poll Tax, паколькі гэта «фізічна немагчыма з-за вялікай колькасці парушальнікаў».

Той факт, што неплацельшчыкі, якія дэманстратыўна парушалі закон, заставаліся на волі, быў добрым прыкладам для іншых таксама ігнараваць сплочванне падаткаў. Сярод моладзі не плаціць Poll Tax лічылася нават модна.

Непапулярнасць праекту расла, што адразу адбілася на сітуацыі ўнутры кіруючай партыі. Тройчы на пасяджэнні рады міністраў гучала прапанова адмяніць новы падатак. Тройчы прэм'ер адмаўлялася гэта зрабіць. Як вынік — у партыі ўзнікла моцная група апазіцыі. 22 лістапада 1990 года большасць сяброў кабінета прагаласавалі за змену свайго кіраўніка. Тэтчэр была вымушана з'ехаць з Даўнінгстрыт, 10. Пры новым прэм'еры Джоне Мэйджары падатак быў адменены.

Так закончылася гісторыя Poll Tax Revolt.

Праўда, самі брытанцы яшчэ год пажыналі вынікі гарачай вясны 1990-га. Татальная адмова плаціць падатак абяскровіла мясцовыя бюджэты. Яны недалічыліся амаль двух мільярдаў фунтаў. Каб залатаць дзіркі ў бюджэце, давялося часова скарачаць выдаткі, у тым ліку на адукацыю і медыцыну.

Застаецца згадаць яшчэ пра адзін каларытны момант пратэстаў супраць Poll Tax — феномен анархісцкай групы «Класавая вайна» (КВ). Ініцыятыва прыхільнікаў Бакуніна існавала з 1986 года, аднак у ходзе пратэстаў раскруцілася да ўзроўню суперзорак. Атаманаў групы запрашалі на ВВС, у самыя вядомыя шоу, цытавалі вядучыя выданні і г.д. Папулярнасць была парадоксам для шматлікіх палітолагаў. Уся пазітыўная праграма анархістаў будавалася на лозунгу: «З'еш багатага!». Ідэйныя прынцыпы ім замяняла культ гвалту і тупая нянавісць да паліцэйскіх і капіталістаў. Інакш як «паразітамі» сяброў каралеўскай сям'і актывісты «Класавай вайны» не называлі.

Гэта быў абсалютна новы, не вядомы, аднак відавочна запатрабаваны часткай насельніцтва стыль. У той час, калі ўсе вядучыя палітычныя сілы дружна асудзілі бойкі з паліцыяй на Трафальгарскай плошчы або крытыкавалі праявы агрэсіі, лідэры «Класавай вайны», наадварот, ганарыліся, што былі ў першых шэрагах пагромшчыкаў, якіх яны называлі «героямі брытанскага рабочага класу».

Даследуючы загадку папулярнасці КВ, сацыёлагі адкрылі наяўнасць у брытанскім грамадстве сталай сацыяльнай групы маргіналаў — так званых underclass: доўгатэрміновыя беспрацоўныя, часова занятыя, адзінокія маці. Для гэтай катэгорыі характэрны прымітыўнае бачанне арганізацыі соцыуму, агрэсіўнае стаўленне да яго інстытутаў, слабая правая культура, вера ў простыя рашэнні. Менавіта падобныя людзі тады сімпатызавалі КВ, а сёння сімпатызуюць новым экстрэмістам. Прычым колькасць брытанцаў, прыналежных да underclass, расце з кожным годам.

З ненавісным падаткам брытанцы справіліся вельмі хутка. З праблемай сацыяльнай маргіналізацыі не ведаюць, што рабіць і сёння.

МЕРКАВАННЕ

# БАКІЕЎ У МІНСКУ: ПОГЛЯД З УСХОДУ

**Як рэагуе грамадскасць Сярэдняй Азіі на нечаканы візіт Бакіева ў Мінск, сумесныя з Лукашэнкам заявы на адрас Масквы і новага ўрада ў Бішкеку? Пра асаблівасці ўспрымання феномену Беларусі ў сярэднеазіяцкім рэгіёне журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з Андрэем Грышыным, супрацоўнікам сярэднеазіяцкага Бюро па правах чалавека.**


Мінск. У Беларусі Бакіеў адмовіўся ад сваёй адстаўкі


Курманбек Бакіеў схаваўся ў Беларусі разам з сям'ей

***— Які імідж мела Беларусь сярод жыхароў Кыргызстана да апошніх падзей?***

— Беларусь сярод узбекаў, кіргізаў і казахаў выклікае падвойнае пачуццё. Усё, здаецца, стабільна і спакойна, краіна (ці, дакладней, Бацька) быццам рэальна перамагае карупцыю, народ мае магчымасць лёгка і без праблем выязджаць у Еўропу. Увогуле, па Беларусі відаць, што дыктатура дыктатуры розніца. Лукашэнка ўсё ж адрозніваецца ад сваіх азіяцкіх і каўказскіх калегаў. Калі для большасці на першым месцы, як правіла, стаяць уласныя і сямейныя эканамічныя інтарэсы, то беларускі Бацька — дыктатар па пераканаННях. Для сябе яму не трэба нічога, хіба што застацца ў гісторыі. Такі сталінскі тыпаж.

***— Наколькі імідж Беларусі змяніўся пасля прыезду ў Мінск Бакіева?***

— Калі раней да Беларусі і да Лукашэнкі ў прыватнасці ставіліся нейтральна, то цяпер у грамадстве відавочны раскол. Частка палітыкуму, перш за ўсё нацыянал-патрыёты Казахстана, віталі дэмарш Мінску. Даць прытулак Бакіеву насуперак волі Пуціна — гэта заслугоўвае павагі. Чаму Масква можа даць прытулак Акаеву, а Мінск Бакіеву — не? Пры гэтым казахскія лукафілы ўвесь час параўноўваюць учынак Лукашэнкі з баязлівай, на іхнюю думку, палітыкай Назарбаева, якога яны лічаць пудзелем Пуціна.

Сфармавалася і іншая пазіцыя, згодна з якой выключна людзі з дэфармаваным сумленнем могуць апраўдваць злачынцу, што дазволіў расстрэльваць свой народ дзеля крэсла прэзідэнта.

***— Бакіеў у Мінску зрабіў шэраг заяў. Як іх у вас каментуюць?***

— Нават тыя, хто пабачыў у Лукашэнку абаронца суверэнітэту Беларусі, не падтрымліваюць фігуру Бакіева. Занадта ён непапулярны і неадэкватны, як усе дыктатары. «Я, каб народ разумеў, што, выконваючы загады банды, ён ставіць сябе па-за законам», — кажа Бакіеў. Атрымліваецца, што толькі Бакіеў з яго сям'ёй застаўся ў прававым полі, астатнія ўсе — злачынцы. Гэта смешна. Акрамя таго, на дадзены момант учынкі Бакіева можна расцэньваць як учынкі ворага кіргізскага народа. Ён бачыць, якое напростае становішча ў краіне, аднак упарта штурхае свой клан да грамадзянскай вайны. Часта Мінск крытыкуюць за тое, што ён даў Бакіеву трыбуну для праваканцыйных заяў. Нарэшце, мала хто зразумеў тактыку Бакіева, які за адзін тыдзень паспеў спачатку адмовіцца ад пасады прэзідэнта, пасля зноў абвесціць сябе прэзідэнтам, пасля зноў дэ-факта ад гэтай пасады адмовіцца. Быццам гульня ў рамонак: застаюся прэзідэнтам — не застаюся.

***— Ці не думаюць у Сярэдняй Азіі, што беларускія ўлады самі напісалі Бакіеву тэксты ягоных прамоў?***

— Я не сустракаў такой думкі. Хіба што была абсалютна экстравагантная версія, нібыта Лукашэнка дзякуючы Бакіеву хацеў падставіць Назарбаева, які зараз адказвае за АБСЕ. І другая версія: хацеў справакаваць яго на якія-небудзь несяброўскія крокі ў рамках Мытнага саюза, каб пахаваць гэту нявыгадную Беларусі структуру. Аднак такая шматхадоўка выглядае занадта фантастычнай.

***— Якімі ў такім выпадку былі матывы Лукашэнкі?***

— Пагаджуся з думкай, якая дамінуе сярод экспертаў. Бакіеў і Лукашэнка ментальна блізкія. Абодва будавалі сваю сістэму за кошт моцнай прэзідэнцкай вертыкалі, абодва спрабавалі гуляць, балансуючы на інтарэсах Захаду і Расіі.

***— Ці сустракаюцца ў меркаваннях вашых экспертаў прагнозы адносна будучыні Беларусі?***

— Шмат мясцовых каментатараў бачаць у кіргізскіх падзеях расійскі след і прагназуюць выбух новых імперскіх амбіцый Крамля ў зоне СНД. Аднак на гэты раз Масква збіраецца пашыраць уплыў не за кошт постсавецкіх сатрапій, а за кошт рэвалюцый. Сярод патэнцыйных ахвяр называюць і ваш рэжым. Праўда, пры гэтым адзначаюць, што Бацька моцна трымае лейцы.

***— Як будуць развівацца адносіны паміж Бішкекам і Мінскам?***

— У першыя дні знаходжання Бакіева ў Мінску тут хапала спекуляцый. Нават казалі пра тое, што Мінск паспрабуе стварыць на поўдні Кыргызстана калі не марыянетачную дзяржаву, то хаця б падкантрольную сабе палітычную групоўку. Аднак зараз зразумела, што без прысутнасці Бакіева гэта малаверагодна. Ды і Мінску тое не трэба. Згаданая ментальнасць Лукашэнкі і Бакіева не абяцае апошняму нічога добрага. Хітры Лукашэнка выдасць Бакіева, як толькі будзе магчымасць атрымаць на гэтым нейкія бонусы. Думаю, бліжэй да прызначаных на кастрычнік выбараў у Кыргызстане адносіны паміж дзяржавамі наладзяцца.

***— Якое ваша асабістае стаўленне да кіргізскай рэвалюцыі?***

— Кыргызстан яшчэ ў 2005 годзе прадэманстраваў, што дэмакратыя — перспектыва занадта ўжо далёкая для ўсяго рэгіёна, у лепшым выпадку сямейны клан адных «дэмакратаў» можа змяніцца кланам іншых «дэмакратаў». І на іх фоне беларускі Бацька выглядае ва ўсякім разе больш сумленным, паколькі хоць не выкарыстоўвае дэмакратычную рыторыку.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### БРЫС АРТЭФЁ

Міністр унутраных спраў Францыі развіў ініцыятыву прэзідэнта Нікаля Сарказі, які патрабуе забароны нашэння паранджы. Брыс у дадатак пачаў крыжовы паход супраць мусульманскіх сем'яў, якія жывуць па правілах палігаміі. Усё пачалося пасля таго, як паліцыя западозрыла, што адзін араб, выхадзец з Алжыру, мае інтымныя сувязі з 4 жанчынамі, якія нарадзілі ад яго 12 дзяцей. Усе тыя жанчыны ў дзяржаўных ведамствах фігуруюць як адзінокія маці і, адпаведна, атрымліваюць сацыяльную дапамогу. Брыс Артэфё выступае за тое, каб пазбавіць мужчыну-араба права на пражыванне ў Францыі і зрабіць з гэтага прававы прэцэдэнт. Прычым араб павінен пакінуць Францыю не за тое, што дапамагаў сваім жонкам падманваць дзяржаву. Ягоная віна ў тым, што ён стварыў палігамную сям'ю, па правілах якой жонка мусіць насіць паранджу. Ідэя забараніць палігамію ўжо спадабалася дэпутатам кіруючай у краіне правай партыі «Рух за народны саюз». Левая апазіцыя рашуча супраць. На думку сацыялістаў, нельга зводзіць усе праблемы грамадства да кавалка тканіны.

### РАУЛЬ КАСТРА



Прэзідэнт Кубы паведаміў сваім грамадзянам, што ў мясцовых выбарах прынялі ўдзел 93 працэнты выбарцаў. Усяго было абрана 15 тысяч дэпутатаў у 169 мясцовых муніцыпалітэтаў. На дэпутацкія паўнамоцтвы прэтэндавала 34 тысяч кандыдатаў. Самі ўлады разглядаюць гэтыя лічбы як праяву падтрымкі з боку народа ў цяжкі для краіны і рэжыму час. У выніку нядаўняй смерці аднаго з дысідэнтаў, які трымаў галадоўку пратэсту, Гавана апынулася ў фокусе крытыкі міжнароднай супольнасці. Кастра кажа, што Кубу ніхто не паставіць на калені. Каб давесці сваю паслядоўнасць, улады ў дзень галасавання разагналі дэманстрацыю жанчын, дзеці або родныя якіх знаходзяцца ў турмах па палітычных матывах.

### БАЛЬТАСАР ГАРСОН

Гэты іспанскі суддзя праславіўся тым, што выдаў ордэр на арышт Пінэчэта і засадзіў за краты багата баскскіх нацыяналістаў, а таксама дабіўся адмены амністыі для паплечнікаў дыктатарскіх рэжымаў у Чылі і Аргенціне. Магчыма, цяпер грозны Балтазар будзе адказваць перад судом. Усё з-за намераў пракурора пачаць следства супраць былога дыктатара Франка і ягоных паплечнікаў, якія, на думку суддзі, павінны несці адказнасць за забойства 113 тысяч прыхільнікаў рэспублікі падчас грамадзянскай вайны. Следства па справе Бальтасара вядзе яго калега, суддзя палаты па крымінальных справах Лусіана Варэла Кастра. Пры гэтым сам Варэла не з'яўляецца прыхільнікам былога дыктатара. Больш таго, ён мае левыя погляды. На яго думку, варушыць мінулае не варта. Акрамя таго, такі працэс значыць парушэнне закону аб амністыі, прынятага ў 1977 годзе. Той закон даваў франкістам гарантыі бяспекі ў абмен на тое, што яны не будуць перашкаджаць працэсам дэмакратызацыі. Справа Гарсона абудзіла ўсю прагрэсіўную грамадскасць. 24 красавіка ў Мадрыдзе адбылася акцыі вядомых культурных дзеячаў. У першых шэрагах маніфестацыі быў славуты іспанскі рэжысёр Педра Альмадавар. .



ТАЯМНІЦЫ ГІСТОРЫЯ

# ЖАНЧЫНЫ ЯНУША РАДЗІВІЛА

Аляксей ХАДЫКА

*Сам Купідон уклаў у твае вочы*
*І Сонца зыркае святло,*
*Й мігценне зор загадкавае ночы,*
*Якое рыцарам Еўропы*
*мову заняло...*

**Гэтыя радкі — крыху вольны пераклад пачатку верша «Пра вочы англійскай каралеўны...» Данілы Набароўскага (1573–1640), паэта, навукоўца і сакратара падчашага ВКЛ і віленскага кашталяна, лідэра пратэстантаў кальвініста Януша Радзівіла (1579–1620).**

## Паміж праўдай жыцця і мастацкім вобразам

Ішоў 1609 год, у жніўні войска Жыгімонта III, насуперак выказанай большасцю сеймікаў ВКЛ волі пра неўмяшанне ў супрацьстаянне цара Васіля Шуйскага і Ілжэдзмітрыя II, перайшло маскоўскую мяжу і рушыла пад Смаленск. Вядома, што амаль двухгадовая асада горада вярнула Смаленск у чэрвені 1611 года ў склад ВКЛ. А Уладзіслава, сына Жыгімонта, праз Сямібаярншчыну абвясцілі ў жніўні 1610 года маскоўскім царом.

Некалькімі гадамі раней Масква шукала супольнікаў супраць Рэчы Паспалітай нават на Габсбургскім двары. Часткай супрацьстаяння ў гэтай дыпламатычнай гульні былі дзеянні Януша Радзівіла і яго сакратара. Гэта гульня прывяла Набароўскага ў Германію, Італію, Францыю і Англію, дзе ён і адведаў роднасны беларускім пратэстантам двор манарха-кальвініста Якава I Сцюарта (1603–1625). А сам Януш Радзівіл з першай жонкай Сафіяй накіраваўся ў Парыж да Генрыха IV. Тады сакратар Радзівіла і ўбачыў у Лондане каралеўскую дачку Лізавету Сцюарт (1596–1662), слынную прыгажосцю будучую каралеву Чэхіі. І каралеву мужчынскіх сэрцаў, выдатны партрэт якой, з радзівілаўскіх калекцый, сёння можна бачыць у зборы Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.

Але хто такі Даніла Набароўскі, і якім чынам жыццё звязала яго з уплывовым беларускім магнатам?

Народжаны ў Кракаве, ён распачаў адукацыю ў Кракаўскім універсітэце, а працягнуў — у Вітэнбергу і Базелі (медыцына), Арлеане і Страсбургу (права) і нарэшце ў 1602 годзе ў Падуі, дзе слухаў курсы механікі ў вялікага Галілея. Знаўца моваў і навук, таленавіты пісьменнік (ён перакладаў з італьянскай на польскую Петрарку, а з лацінскай — трактаты па паэтыцы і вытокы Сарбеўскага), якім чынам ён апынуўся ў Беларусі? Адказ просты: апека Радзівілаў. Ужо ў Страсбургу ён сутыкнуўся з маладым Янушам, адпраўленым бацькам, Кшыштафам Радзівілам Перуном, віленскім кашталянам і гетманам, па навуку, і выкладаў яму французскую, нямецкую і лаціну. Пасля вяртання з Падуі Даніла канчаткова перайшоў на сакратарскую службу да Януша. Пасля гэтага — верны служка сям'і,



Маркус Герартс. Партрэт Лізаветы Сцюарт. Каля 1618



Невядомы мастак. Партрэт Сафіі Слуцкай. Копія 18 ст.



Януш Радзівіл. Партрэт невядомага мастака, 1610-я

апрача дыпламатычных місій, падчас выезду ў Слуцку, Нясвіжы, Смалявічах, Любчы — займаўся лекарскай практыкай, напісаў два медычныя трактаты, даваў парады па барацьбе з эпідэміямі.

## Сафія, князёўна Слуцкая

Блізкі паплечнік Януша Радзівіла, Набароўскі выдатна ведаў сямейныя справы свайго энергічнага патрона. У тым ліку і гісторыю самага розгаласнага на той час шлюбу — з апошняй прадстаўніцай слуцкага роду Алелькавічаў, нашчадкаў Альгерда, Сафіяй (1 мая 1585 — 19 сакавіка 1612). Шлюбы бяруцца зусім не на нябёсах: прынамсі, выбар нявесты быў зроблены для маладога Януша яго бацькам Кшыштафам Перуном у 1594 годзе ў дамове з Юрыем Хадкевічам. Партыя для прадстаўніка кальвінскай біржанскай лініі Радзівілаў выглядала надта прывабнай: Слуцкае і Капыльскае княствы, 7 гарадоў і 32 фальваркі складалі пасаг нявесты.

Лёс Сафіі (якая ў гадавалым узросце страціла бацькоў, а пасля і сваіх дзядзькоў Аляксандра і Яна Сямёна) трапіў у распараджэнне сваякоў, сыноў яе стрыечнай бабкі, таксама Соф'і Алелькаўны, — Юрыя і Гераніма Хадкевічаў. Пры дварах апошняга, віленскага кашталяна і брэсцкага старасты, і гадавалася князёўна, была відавочцай бурлівых міжканфесійных спрэчак і заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі ў 1596 годзе. І чакала спаўнення свайго сямейнага лёсу — паводле Статуту ВКЛ 1588 года, «зупольных трынаццаці год», каб пабрацца шлюбам з Янушам Радзівілам. Вобраз юнай князёўны захавалі жывапісны партрэт Сафіі, што захоўваецца ў Літоўскім нацыянальным мастацкім музеі, і гравюра Г. Ляйбовіча з выдадзенага ў Нясвіжы альбома сям'і Радзівілаў.

Ці чакала яна ад свайго сужэнца кахання? У выпадку статуснага альянсу, запланаванага для яе Хадкевічамі і Радзівіламі, — пытанне хутчэй рытарычнае. Далейшыя авантурныя падзеі паказваюць, што яго, пэўна, не было.

А перад шлюбам Сафію напаткалі дадатковыя выпрабаванні. Напрыканцы XVI стагоддзя Хадкевічы, каталікі і прыхільнікі рэлігійнай і знешняй палітыкі Жыгімонта III Вазы, і біржанскія Радзівілы, кальвіністы, якія імкнуліся да абмежавання каралеўскай улады, апынуліся ў розных лагерах.

У 1599 годзе Ян Караль Хадкевіч, стрыечны пляменнік Гераніма, атрымаў ад караля пачэсную пасаду жмудскага старасты, на якую разлічваў стрыечны брат Януша Радзівіла Юры. Ведаючы непрыхільнасць караля да Радзівіла Перуна, які, па словах манарха, «захацеў бы быць Вялікім князем літоўскім, а потым каралём», Геранім у гэты момант абвясціў пра скасаванне шлюбнай дамовы. У гэты час лёс Сафіі вырашыўся не на нябёсах, а на зямлі: з-за рукі князёўны ледзь не выбухнула грамадзянская вайна.

Супраціўляючыся рашэнню літоўскага Трыбуналу, які ўзяў бок Перуна, Геранім у сваім віленскім палацы ў лютым 1600 года пачаў рыхтавацца да аблогі: 24 гарматы, 1600 асоб коннага і 600 пешага войска. Вільня бурліла, напалоханыя жыхары спяшаліся пакінуць горад. Але да сутычкі не дайшло, сілы былі няроўныя: на баку пакрыўджаных Радзівілаў сталі сваякі і крэўныя з буйнейшых дамоў Рэчы Паспалітай: Астрожскія, Ян Замойскі, смаленскі ваявода Ян Абрамовіч, брэсцкі ваявода Кшыштаф Зяновіч, канцлер Леў Сапега і 6 тысяч войска.

Далей быў чарговы вырак Трыбуналу 8 чэрвеня 1600 года. Хадкевічы атрымалі адступное — 500 валок зямлі і 360 тысяч злотых. А Януш — руку сваёй першай маладой жонкі, запісаўшы Сафіі «права заставацца пры сваёй каталіцкай веры». Вянчанне адбылося ў Брэсце 1 (10) кастрычніка 1600 года, на Пакровы.

## Шчаслівае каханне?

Ідэалізаваныя біяграфіі Сафіі Слуцкай паведамляюць пра шчаслівы шлюб, у якім сужэнцы кахалі адзін аднаго і падтрымлівалі ў змаганні за веру. І сапраўды, «дысідэнт» Януш неаднаразова горача прамаўляў у абарону «іншаверцаў» на сеймах у Варшаве, быў адным з кіраўнікоў рокашу Мікалая Зебжыдоўскага (1606–1607), удзельнікі якога патрабавалі прыбраць езуітаў з каралеўскага двара і нават адхіліць Жыгімонта III. Але, дапамагаючы жонцы, клапаціўся найперш пра кальвіністаў. Сведчанне гэтаму — заснаваныя ў Койданаве (1612) і Слуцку (1617) зборы. А ў сваім замку ў Любчы ён апекаваўся друкарняй Пятра Бласта Кміты, куды абсталяванне перавезлі з ахопленай нападкамі на пратэстантаў Вільні.

Друкарня, адна з магутнейшых у ВКЛ, за 20 год выдала 59 кніг — пераважна на замовы кальвіністаў. Там у 1614 годзе выйшла кніга эпітамэ і эпітафій яшчэ аднаго радзівілаўскага паэта, Саламона Рысінскага, дзе на смерць Сафіі Слуцкай і яе дзіцяці, што наступілі пры трэціх родах у 1612 годзе (двое першых дзяцей таксама доўга не жылі), прагучалі наступныя радкі: «Зорачка! Ты захавалася ў Слуцкім сузор'і адзіна/ Паміж літоўскімі славай ярчэйшая першая дочка!/ Хіба ты меней рыцар, чым ганарлівы супруг твой магутны?/ Сіла якая, прыйшла нечакана, цябе забрала...»

Наш стары знаёмы Набароўскі таксама адгукнуўся панегірыкам на скон княгіні. Але ён жа, як адзначае знаўца прыдворнага жыцця Радзівілаў польскі даследчык Сайкоўскі, за некалькі гадоў перад тым напісаў фрашку «Пані», дзе абмаляваў амурны эпізод і пакаранне кахання неназванай жанчыны: «З адной пані маладзенькай у намёце засталі, / Раніцою паймаўшы, утапіць загадалі...»

У 1630 годзе, падрыхтаваўшы першае выданне кнігі «Liber chamorum» пра «пабытавае» жыццё эпохі, знаўца асабістых таямніц уладных двароў Валяр'ян Неканда Трэпка, сын сакратара караля Стэфана Баторыя, які, у сваю чаргу, быў хросным бацькам Януша Радзівіла, прыўзняў таямніцу гэтых радкоў. Нешчаслівае захапленне Сафіі Слуцкай шляхціцам Смольскім скончылася яго арыштам і ўтапленнем па загадзе Януша — з абвінавачаннем у крадзяжы. Магчыма, у нядоўгім сямейным жыцці Сафія Слуцкая была не надта шчаслівай.



Замак у Любчы

## Паміж справамі сямейнымі і дзяржаўнымі

Януш Радзівіл ажаніўся ў другі раз даволі хутка. Сотня венгерскай пяхоты, 60 казакаў, 18 слуг, і, зразумела, Даніла Набароўскі суправаджалі яго ў Берлін на вяселле з Лізаветай Сафіяй Гагенцолерн, дачкой лютэраніна, курфюрста Брандэнбургскага Яна Георга, ужо ў чэрвені 1613 года. Яна нарадзіла ў 1620 годзе Янушу адзінага сына Багуслава, які дажыў да дарослых год і зрабіўся апошнім прадстаўніком біржанскай лініі Радзівілаў «па мячы».

Вочы ж прыгажуні Лізаветы Сцюарт, апетыя Набароўскім, зірнулі на Януша Радзівіла толькі з партрэта прыдворнага англійскага жывапісца Маркуса Герартса, выкананага і дасланага Радзівілу па заказе англійскага караля Якава I Сцюарта ў 1618 годзе. Таго самага партрэта, які мы прыгадалі напачатку.

Кароль шукаў кантактаў сярод пратэстанцкіх сем'яў кантынента. У Еўропе пачынаўся глабальны канфлікт, названы Трыццацігадовай вайной і справакаваны супрацьстаяннем саюзаў нямецкіх князёў — Пратэстанцкай уніі і Каталіцкай лігі.

Ажаніўшыся ў лютым 1613 года з лідэрам Пратэстанцкай уніі Фрыдрыхам Пфальцскім, Лізавета Сцюарт апынулася ў цэнтры канфлікту. Менавіта іх сям'ю, адхіліўшы ў жніўні каталіка імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Фердынанда II, чэшскія пратэстанты запрасілі на пражскі пасаг. Але іх караляванне цягнулася толькі год, па лістапад 1620-га, пакуль Чэхія не капітулявала перад войскам Каталіцкай лігі і не вярнулася пад скіпетр Фердынанда II.

Сям'я чэшскіх «манархаў адной зімы», Фрыдрыха і Лізаветы, знайшла прытулак у Гаазе, дзе Фрыдрых памёр у 1632 годзе. Лізавета вярнулася ў Англію толькі пасля ўкаралявання там яе пляменніка Карла II у 1660 годзе, каб назаўсёды зрабіцца папулярнай асобай у англійскай гісторыі як «пакутніца за веру». Яе ўнук Георг I узышоў на англійскі трон у 1714 годзе як пачынальнік новай дынастыі Гановерскага дому. А напісаны Георгам Гендэлем у 1727 годзе гімн на каранацыю яе праўнука, Георга II, вядомы кожнаму футбольнаму заўзятару як гімн Лігі Чэмпіёнаў.

Што тычыцца Януша Радзівіла, то жэст Якава I з дасланым яму партрэтам дачкі не займеў уплыву на яго спрыянне пратэстанцкім сілам Еўропы. Замірыўшыся з Жыгімонтам III і атрымаўшы ад караля пасаду віленскага кашталяна, у 1619 годзе Януш ужо дапамагаў габсбургскай кааліцыі вербаваць у войска Фердынанда II лёгкую кавалерыю з ВКЛ, якая дапамагала ў выгнанні Лізаветы Сцюарт і Фрыдрыха Пфальцскага з Чэхіі.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# «ДАСТЫШ ФАНТАСТЫШ»: З КІНАЭКРАНА НА КАНЦЭРТНУЮ ПЛЯЦОЎКУ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Новая кінастужка пад інтрыгуючай назвай «Дастыш фантастыш» кінарэжысёра Аляксандра Канановіча — трэці поўнаметражны фільм студыі «Беларусьфільма», музыку для якога запісалі айчынныя выканаўцы.**



Гурт «ДетиДетей»

Нагадаю, што саўндтрэк да «Анастасіі Слуцкай» (рэжысёр Юрый Ялхоў) стварыў гурт «Палац», а этна-трыо «Троіца» адзначыліся ў прыгодніцкай стужцы «Тры талеры» (рэжысёр Ігар Чацверыкоў) паводле аповесці А. Федарэнкі. І вось новы прыклад супрацы айчынных кінематаграфістаў і музыкантаў.

Адзначу, што беларускія рок-выканаўцы з энтузіязмам адгукнуліся на запрашэнне пайдзельнічаць у гэтым праекце. Бо запіс саўндтрэка да фільма па інтэнсіўнасці і выніковасці працы можна лічыць аналагам удзелу ў працы над дыскам-складанкай: музыкантам трэба прасякнуцца супольнай ідэяй і настроем праекту, выбраць са свайго рэпертуару ці старыць наноў музыку да яго, удзельнічаць у прома-акцыях канчатковага прадукту. Невыпадкова таму ўпершыню саўндтрэк да кінафільма «Дастыш фантастыш» выйдзе асобным CD.

Што тычыцца самога фільму, то ў гледачоў ён выклікаў палярныя меркаванні — ад «вясёлага і пазітыўнага» да «малацікавага і пошлага». Уся справа ў тым, што ў большасці кінааматараў пакуль няма ўяўлення пра мастацкія якасці «Дастыш фантастыш» і свае меркаванні яны фармiруюць пад уплывам СМІ ці інтэрнэту. Але адзнакі мастацкім якасцям новага фільма пакінем крытыкам-кіназнаўцам. Заўважу толькі тое, што здымачная група з «Беларусьфільма» вырашыла зацікавіць слухачоў вынікамі сваёй працы праз музыку, заінтрыгаваць, каб тыя, хто прыйшоў у клуб «Рэактар», паспяшаліся ў кінатэатры на прэм'еру. У гэтым былі зацікаўлены самі музыканты, бо гэта прэм'ера супадала з іх асабістымі радаснымі падзеямі.



Лявон Вольскі

Напрыклад, вакалістка гурта «Naka» Насця Шпакоўская рыхтуецца стаць маці. Але гэта не перашкодзіла ёй выйсці на сцэну і ў экспрэсіўнай манеры выканаць песню з фільма «Дастыш фантастыш» «Клочьями». Гэтая кампазіцыя ўвайшла ў саўндтрэк, а таксама ў новы альбом гурта пад назвай «Пора». На прэзентацыі прагучалі іншыя кампазіцыі, якія змешчаны на новай кружэлцы гурта. Дарэчы, у яе праграму ўвайшла і першая беларускамоўная песня гурта «Naka» — «Бяжы» з праекту «Перазагрузка». Дзіўна, але падчас прэзентацыі Насця выканала гэту песню на рускай мове, хоць па-беларуску гэтая песня ў яе гучыць больш пераканаўча. Мо таму такое здарылася, што музыкі не жадаюць саступіць з больш лёгкай і кан'юнктурнай сцежкі пад назвай «рускі рок»?

Больш актыўна ў напрамку пачынаюць працаваць (абы не сурочыць!) удзельнікі гурта «ДетиДетей». На прэзентацыі саўндтрэка «Дастыш фантастыш» вакалістка каманды Ганна Хітрык аб'явіла пра хуткі выхад іх першага беларускамоўнага альбома «Рух» і прэзентацыі яго на вялікай сцэне тэатра імя Я. Купалы. Гэтыя намеры былі падмацаваныя такімі кампазіцыямі, як «Люты», «Раптам».

У праграме прэзентацыі саўндтрэка «Дастыш фантастыш» былі прадстаўлены выканаўцы, якія не ўдзельнічалі ў здымках, але музыка якіх, па словах арганізатараў канцэрта, магла б быць выкарыстана для «агучкі» стужкі. Маецца на ўвазе гурт «Разбітае сэрца пацана», які добра павесяліў публіку сваім гумарам, карыкатурнай «трасянкай» і пафаснымі рухамі дзеючын з камічнага бурлеск-дуэта «ЭВМ». Усе разам яны ствараюць на сцэне феерычнае шоу. Слухачы надзвычай добра прынялі такія кампазіцыі «Разбітага сэрца пацана», як «Сінус-косінус», «Смартфон», «Палюбіла гапара», асабліва «закаціла» ў зале гумарыстычная песенька «Лук і часнок», пад якую можна было б добра патанчыць у зале клуба «Рэактар» і на здымках фільма, калі б гурт запрасілі на здымачную пляцоўку. Будзем спадзявацца, што гэта яшчэ ў іх наперадзе!

Знаёмства публікі з саўндтрэкам «Дастыш фантастыш» не абышлося і без музычных прэм'ер. Гэткім сюрпрызам, які прыцягнуў увагу публікі, стаў дэбютны выступ праекта былога гітарыста гурта «J:морс» Рамана Арлова пад кідкай назвай «У нескладовае». Удзельнікі гурта — вядомыя беларускія рок-вакалісты Ганна Хітрык, («ДетиДетей»), Віктар Рудэнка («Dali»), інструменталісты Юлія Глушыцкая (віяланчэль), Канстанцін Гарачы (клавішныя), Вячаслаў Сергеенка (бас) і Вадзім Марголін (гітара), Андрэй Сапоненка (ударныя).

«У нескладовае» — праект, які створаны для папулярызацыі беларускай рок-музыкі і беларускай мовы ў Расіі. Што для дасягнення такой мэты прапануюць музыканты? Па-першае, радыёфарматную музыку. Па-другое, музыку якую і ў нейкім сэнсе нечуваную за межамі Беларусі. І гэтыя амбіцыі былі акрэслены падчас дэбютнага выступлення праекта. Гучалі песні-«знаёмствы», якія ўвойдуць у першы альбом гурта («Сусвет»), а таксама трэкі да новай стужкі расійскіх кінавытворцаў («Никогда не сдавайся»). Гэтыя творы былі хораша сустрэты слухачамі. Па меркаванні многіх з іх, «У нескладовае» мае перспектывы, каб іх папулярнасць расла ў абедзвюх краінах і праект дасягнуў сваіх мэт. Але пры ўмове пазбаўлення музычных уплываў, якія ідуць ад улюбёных грандаў сусветнага року і «alma mater» Р. Арлова — гурта «J:морс».

Што ні гавары, але гурт «Крамбамбуля» — самы вопытны з усіх раней пералічаных каманд у працы ў кіно. Бо за плячамі Лявона Вольскага і яго каманды ўдзел у камедыі ўкраінскіх кінематаграфістаў «Каралева бензакалонкі-2». І вось новая спроба, цяпер ужо на радзіме. Па словах Лявона, «Крамбамбуля» прапанавала рэжысёру «Дастыш фантастыш» тры трэка: песні «Раз, два, тры, усе за стол», «Азалацыя», «Свята кожны дзень». Некаторыя з іх прагучалі ў гэты вечар. Але цэнтрам канцэртнага выступу гурта Л. Вольскага стала выкананне хітоў, якія прынеслі ім агульнабеларускую вядомасць: «Турысты», «Старыя хіпаны», «Абсент» і шэраг іншых. Пад незвычайна актыўныя апладысменты слухачоў Лявон разам з лідэрам гурта «J:морс» Уладзімірам Пугачом выканалі песню-прызнанне ў любові да роднага краю «Такога няма нідзе». Гэтак жа трактавалася і наступная кампазіцыя Вольскага з праекту музыканта «Белая яблыня грому» пад знаёмай назвай «Пахне чабор» на верш П. Броўкі.

Пазітыўная скіраванасць музыкі «Крамбамбулі» адбілася на настроі тых, хто прыйшоў на канцэрт у «Рэактар», першым пазнаёміўся з фільмам і цяпер не падзяляе аптымізму наконт мастацкіх вартасцяў камедыі «Дастыш фантастыш». Яны выказвалі спадзяванне, што наступным разам усё будзе лепш. Вось жа музыканты ў нас цудоўныя!

**P.S.** Вядомая аксіёма: нельга меркаваць пра фільм, не пабачыўшы яго, прынамсі, у кінатэатры. Але хочацца выказацца адносна адной з самых прыкрых заганаў многіх рэжысёраў «Беларусьфільма». Не так даўно даведаўся, што на беларускай студыі плануецца здымаць фільм пра падзеі Грунвальдскай бітвы. Мяркуецца, што ў гэтым кіно немцы будуць гаварыць па-нямецку, літоўцы — па-літоўску, і толькі беларусы разам з Вітаўтам па-руску. Як можна сур'ёзна ставіцца да такіх «твораў»?

Вось і рэжысёр «Дастыш фантастыш» А. Кананові́ч схіляецца да такой пазіцыі: беларуская мова — не для кіно. Прынамсі, гэта вынова вынікае з таго факту, што роднае слова гучыць у камедыі фрагментарна, для стварэння «мясцовага каларыту».

Пакуль рэжысёры «Беларусьфільма» не зразумеюць фармастваральную ролю роднага слова ў кіно, датуль іх намерам і плёну іх працы чэзнуць на задворках «русского мира», а нам спрачацца: ёсць беларускае кіно ці яго няма.



Гурт «J:морс», Юлія Глушыцкая і Раман Арлоў

АЛЬБОМ

# КРАСАВІЦКАЕ ТАНГА З АЛЯКСЕЕМ ЖБАНАВЫМ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

*…Панна Вясна, чую твае*
*Лёгкія крокі.*
*І да таго сэрца пяе,*
*Што аж баліць трохі.*
*Можа, цябе лёсіць сустрэць*
*Мне на шляху росным…*
*І пакахаць, і анямець,*
*Страціць навек розум.*

Пабачыў свет першы альбом барда Аляксея Жбанава «Песні для мамы». Гэта кружэлка — падарунак аўтару ад сяброў і прыхільнікаў творчасці.

У дэбютным альбоме Аляксея Жбанава сабраныя песні, напісаныя ў Мінску і Маскве ў 1997–2009 гадах. Спевы на ўласныя вершы і на вершы любімых паэтаў аўтар складае ў гісторыю вандровак па чужыне, тугі па радзіме і шчаслівага вяртання дахаты, спасціжэння характва роднай зямлі і людзей навокал, расказаную самаму дарагому чалавеку — маці. (Альбом прысвячаецца светлай памяці Зінаіды Панфілаўны Жбанавай).

Апроч песняў аўтарства Аляксея Жбанава, у альбом увайшлі песні "У векавечнай Бацькаўшчыне клёны…» і «Дагарэў за брамай небакрай» на словы Уладзіміра Караткевіча, «Не баюся, што мой век нявечны…» на словы Ніла Гілевіча, «Хмаркі» на словы Францішка Багушэвіча, а таксама «Песня філаматаў» на словы Адама Міцкевіча ў перакладзе Кастуся Цвіркі, якая паспела стаць неафіцыйным гімнам беларускага студэнцтва.

Набыць дыск можна непасрэдна ў аўтара, для чаго трэба звярнуцца на электронны адрас schbanau@mail.ru.

**Даведка:**

Аляксей Жбанаў нарадзіўся 22 красавіка 1979 года ў Мінску. Піша вершы і песні па-руску і па-беларуску, перакладае з нямецкай і сербскай моваў. Удзельнік творчага праекту «Песні філаматаў і філарэтаў». Жыве ў Мінску.

▸ ВЕЧАРЫНА

# ГОЛАС СЭРЦА

**Дабрачынная літаратурна-музычная вечарына «Голас сэрца», прысвечаная 24-й гадавіне катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, адбылася 26 красавіка ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа ў Мінску.**

Вечарына праводзілася па ініцыятыве таварыства дружбы і культурных сувязей «Беларусь — Ірландыя» (старшыня— сын Коласа Міхась Міцкевіч) і дзіцячага фонду духоўнага і культурнага адраджэння «Сакавік» (кіраўнік — унучка Коласа Марыя Міцкевіч).

Лаўрэат прэміі імя Васіля Віткі паэт Анатоль Зэкаў адзначыў, што за 24 гады пасля катастрофы на апаленай Чарнобылем і забруджанай радыяцыйным пылам зямлі вырасла новае пакаленне. Паводле яго слоў, Чарнобыль дагэтуль працягвае сваю вайну з беларусамі. У беларускай літаратуры чарнобыльская тэма па значнасці стала другой пасля тэмы Вялікай Айчыннай вайны, сказаў Зэкаў. Ён успомніў чарнобыльскіх бежанцаў-перасяленцаў, якія спадзяваліся вярнуцца ў родныя хаты, сялян, якія ў 1986 годзе не радаваліся ўраджаю, і прачытаў свае паэтычныя творы, у тым ліку ўрыўкі з паэмы «Аварыя сумлення», прысвечанай катастрофе.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі паэт Міхась Башлакоў прачытаў урыўкі сваёй паэмы «Лілея на цёмнай вадзе».

Марыя Міцкевіч паведаміла, што Ірландыя — адна з тых краін, якая адгукнулася на чарнобыльскую бяду. Паводле яе слоў, ірландскія валанцёры да гэтага часу дапамагаюць беларускім дзецям, ірландскія дабрадзеі пабывалі ў пацярпелых ад катастрофы рэгіёнах і напісалі шэраг кніг. Тысячы беларускіх дзяцей штогод ездзяць на аздараўленне ў Ірландыю, а фонд «Сакавік» кожны год ладзіць у Беларусі фэсты ірландскай музыкі і танцаў.

У рамках вечарыны адбылася сустрэча з ірландскім піяністам, лаўрэатам прэміі імя Фрэдэрыка Шапэна Майкам О'Руркам, продкі якога, ірландскія графы О'Руркі, жылі на Беларусі — у Усялюбе пад Наваградкам (Гродзенская вобласць). Піяніст жыве ў Францыі, вывучаў фартэпіяна пад кіраўніцтвам Марселя Чампі, вучня Клода Дэбюсі. Стаў вядомым дзякуючы віртуознаму выкананню твораў знакамітага ірландскага кампазітара-рамантыка Джона Філда. Піяніст актыўна гастралюе па свеце, перад паездкай у Беларусь даў некалькі канцэртаў у Літве. У праграме выканаўцы — музыка Джона Філда і Шапэна.

▸ ВЫСТАВА

# Аляксей Марачкін: ПРАЗ ТРАДЫЦЫЮ Ў БУДУЧЫНЮ

Аляксей ХАДЫКА

**30 графічных аркушаў з выявамі вялікіх князёў ВКЛ ад Альгерда і Стэфана Баторыя, гістарычных асоб ад Ефрасінні Полацкай і маладога Францыска Скарыны да Эміліі Плятэр і дзякуючы першага беларускага палітычнага адраджэння Палуты Бадуновай, выставіў 23 красавіка ў памяшканні БНФ «Адраджэнне» вядомы мастак і грамадскі дзеяч Аляксей Марачкін.**



У старых польска-літоўскіх хроніках — Бельскага, Гваньіні — выявы каралёў і вялікіх князёў утваралі разгорнутыя цыклы, дапамагалі цікаўнаму чытачу матэрыялізаваць уяўленні пра гістарычнае мінулае. Павага да яго натхняла ўласнікаў старабеларускіх магнацкіх рэзідэнцыяў упрыгожваць сцены парадных залаў вобразамі славутых гістарычных асоб. Так і нарадзілася ў Марачкіна, укаранёная ў традыцыі, ідэя разгорнутай серыі славутых герояў.

Палітык Вінцук Вячорка на ўрачыстым адкрыцці экспазіцыі, якое наведалі некалькі дзесяткаў сябраў Аляксея Антонавіча, каб яшчэ раз павіншаваць яго з 70-гадовым юбілеем, што адбыўся 30 сакавіка, так абмаляваў свае ўражанні ад убачанага: «Паўстае персаніфікаваная беларуская гісторыя ў жывых абліччах. Увасобленая ў творах мастацтва, яна пачынае жыць самастойным жыццём. Расцягваецца ў літаратурныя і вобразныя алюзіі, пераходзіць у цытаты і школьныя падручнікі».

Спадар Вінцук прэзентаваў вершаванае віншаванне мастаку ад даўняга сябра, паэта-барда Сяржука Сокалава-Воюша, дасланае з ЗША, у якім дух выставы адлюстроўваўся паэтычнымі радкамі:

*«…з глыбіняў, з нетраў старасветчыны*
*Вядзе да нас ідушчая рука*
*Падзеяў, дзеяў шыхт,*
*ачалавечаны*
*Праз светаўспрыманне*
*мастака…»*

Гістарычная серыя Аляксея Антонавіча пачыналася з жывапіснага партрэта Багуслава Радзівіла, магната, удзельніка драматычных падзей сярэдзіны XVII стагоддзя, спробы вылучыць ВКЛ у асобную ад Польшчы дзяржаву. Два гады таму з яго пачалася мастацка-літаратурная серыя «Жодзінцы», распрацаваная мастаком разам з сябрам, выдаўцом Уладзімірам Сіўчыкавым. А пазней, не раз абмеркаваны ў сяброўскім коле, цыкл ужо графічных партрэтаў вырас да ўзроўню невялікага нацыянальнага пантэону.

У ім укаранёная ў стагоддзях ідэя спалучылася з сучаснай формай, падказанай кампутарнымі тэхналогіямі. Выкананы вугалем на кардоне энергічны малюнак фатаграфуецца, выводзіцца ў друк на постэр, які трэба наклеіць на дробназярневае палатно, а затым зноў дапрацаваць вугалем. І ў творы ажывае рытміка і вібрацыя працы аўтарскай рукі. У распрацаванай мастаком тэхніцы хутчэйшае тыражаванне спалучаецца з адноўленым водарам арыгіналу.

Аркушы вялікага фармату часам нагадваюць падмалёўкі, першасныя накіды іконных або фрэскавых вобразаў, асабліва ў адлюстраваннях святых — Меркурыя, Ефрасінні. Можа, абаянне беларускага іканапісу натхняе стылістычныя пошукі Марачкіна, нездарма ж ён паўтара дзесяткі год таму стварыў абраз «Маці Божай Чарнобыльскай»? Гэты ўспамін нагадаў пра малавядомы эпізод з 1990-х гадоў, калі Марачкін быў загадчыкам кафедры жывапісу ў тагачасным Тэатральна-мастацкім інстытуце і прапанаваў некалькім студэнтам, калі гэта ляжа на душу, у рамках практыкі па капіяванню мастацкіх твораў, паўтарыць шэдэўры іканапісу з Музея старажытнабеларускай культуры. І яны выканалі некалькі выдатных работ.

Што тычыцца Аляксея Марачкіна, то падобнае пытанне для яго не было нечаканасцю: «Я, безумоўна, не стаў прафесійным іканапісцам, але, здаецца, Гандзі сказаў: калі жывеш з народам, ты не задумваешся — звяртаешся ты да нацыянальнай формы ці не нацыянальнай. Усё атрымліваецца само сабой…»

Яшчэ ў лініях графічных аркушаў Марачкіна адчуваецца ўпэўненасць і моц, таму ад рэдакцыі «НЧ» мы дадаём: 70 год, калі ў душы мастака ёсць меса гармоніі і любові да краіны, да сяброў — самы час росквіту таленту.

▸ ЦІКАВА

# ФЕСТЫВАЛЬ КУЛІКОЎ

**1–2 мая ў Тураве пройдзе Фестываль кулікоў. Ініцыятарам мерапрыемства выступіла грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны», суарганізатарамі з'яўляюцца Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Праграма развіцця ААН у Беларусі, Праграма малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду, Праект ГЭФ/ПРААН па Палессю, Жыткавіцкі райвыканкам.**

Як паведаміў спецыяліст па экалагічнай адукацыі АПБ Руслан Шайкін, мэта фестывалю — прыцягнуць увагу да экалогіі, садзейнічаць развіццю прыроднага і культурнага турызму на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна.

Фестываль адкрыецца семінарам па праблемах аховы птушак адкрытых пойменных лугоў, прадугледжана забаўляльна-пазнавальная праграма. У прыватнасці, пройдуць выступленні фальклорных і музычных калектываў, прысвечаныя птушкам, а таксама дэфіле «Кулічыная мода», на якім будуць прадстаўлены калекцыі юных дызайнераў рэгіёну і дызайнераў Міжнароднай моладзевай творчай майстэрні «Млын моды».

Акрамя таго, для ўсіх ахвотных будуць арганізаваны назіранні за птушкамі, майстар-класы АПБ па выяўленні птушак на тканіне, тату з птушкамі, а таксама майстар-класы Тураўскага дома творчасці па кераміцы, саломцы, вышыўцы і іншых народных промыслах. Запланавана выстава матэрыялаў АПБ за ўсе гады існавання арганізацыі: выданні «Птушкі і мы», плакаты-вызначальнікі птушак.

У другі дзень фестывалю пройдзе фотапленэр «Птушкі Тураўскага лугу», у якім возьмуць удзел прафесійныя фотапаляўнічыя.

Як адзначыў Шайкін, фестываль праводзіцца другі раз. Чакаецца, што ён збярэ мноства ўдзельнікаў, у тым ліку прадстаўнікоў замежных дыпламатычных місій, прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый у Беларусі.

Паводле слоў спецыяліста, Тураўскі луг — адно з найбольш важных месцаў гнездавання і спынення падчас міграцыі водна-балотных птушак. Усяго на лузе жыве каля 500 пар 55 відаў такіх птушак. Тут таксама размешчана самае вялікае пасяленне занесенага ў Чырвоную кнігу куліка-марадункі. Акрамя таго, сотні тысяч птушак спыняюцца на лузе падчас вясновавосеньскіх пралётаў.

**Анастасія Янушэўская, БелаПАН**

Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка
камунікат
www.kamunikat.org

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 389
Падпісана да друку 30.04.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.